КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 43 (1169) 25 кастрычніка 2014 г.

Сустрэча ў Прэзідэнта: **літаратура** С. 2 — 3

Даспех у музеі: рыцар з Мсціслава С. 3

На маю думку: **тры меркаванні ад экспертаў** С. 5

Што знікае, а што — рэкламуецца? С. 7, 12

Альтэрнатыўныя **прасторы для выставак** С. 13

Гасцінная старадаўняя Сафія. / Фота Юрыя ІВАНОВА

"ЗВАНЫ САФІІ", ЧУТНЫЯ Ў СВЕЦЕ

Хоць афіцыйнае ўрачыстае адкрыццё XIX Міжнароднага фестывалю арганнай музыкі "Званы Сафіі" запланавана на 6 лістапада, ягоная "ўверцюра" доўжыцца з 12 кастрычніка: пад час яе выступаюць музыканты, якія ўпершыню наведваюць полацкі форум (сёлета гэта прадстаўнікі Германіі і Польшчы). Усяго ж да ўдзелу ў гэтай традыцыйнай падзеі запрошаны артысты з сямі краін (апроч Беларусі і названых вышэй дзяржаў, са Швейцарыі, Румыніі, Харватыі і Расіі).

Пад час аднаго з фестывальных канцэртаў. / Фота Ігара СУПРАНЁНКА

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

Велатур "К": па ваколіцах "каралеўскага горада"

"Гродзенскі трохкутнік" і яго адрозненне ад Бермудскага

Серыя чацвёртая

"Халі-галі" на культурным памежжы

Традыцыі драўлянай скульптуры ў Літве існавалі спаконвеку — балазе ў матэрыяле ніколі не было нястачы. У пасавецкі час яны адрадзіліся, прычым зусім не толькі ў музейна-пленэрным фармаце. Узоры разьбы па дрэве сустракаеш літаральна на кожным кроку: на ўзбочынах шляхоў, ля разнастайных устаноў і ў местачковых парках. Нават прыдарожныя ўказальнікі часам давяраюць менавіта народным разьбярам. Падаецца, суседзям удалося знайсці вырашэнне дылемы, актуальнай і для аздаблення айчыннай грамадскай прасторы: альбо дорага (з бронзы ды рукамі скульптараў), альбо — абы-як... А ў "бабульчыным куфры" і сапраўды адшукаецца шмат варыянтаў для рэгіёнаў.

Ілья СВІРЫН / Фота аўтара

Вятрак з самалётнымі крыламі

Вяршыня мар ці не кожнага творцы, які дасягнуў спеласці, — гэта ўласная галерэя або музей. Літоўскі разбяр Антанас Часнуліс пайшоў далей ды стварыў цэлы парк — не толькі на сушы, але і ў водах рачулкі Ратніца, дзе таксама плёскаюцца ягоныя драўляныя героі. І кожная з увасобленых постацей удала ўпісана ў прыродны ды культурны ландшафт і мае сваю гісторыю і лёс.

У рабочым адзенні ды яшчэ і з газетнай шапкай на галаве, скульптар выглядае сапраўдным "татам Карла". І гэтая метафара цалкам дарэчы, калі ўлічыць, што яго творы і сапраўды могуць ажываць. Прыкладам, падыходзіш да святога Юрыя, выкананага ў рост чалавека, — і раптам дракон пачынае рыкаць, а ў ягонай пашчы запальваецца агонь. І такіх дзівосаў тут процьма. Дзякуючы нябачным воку датчыкам ды схаваным у дрэве механізмам, традыцыйныя для літоўскай скульптуры сюжэты (фальклорныя, гістарычныя ды рэлігійныя) набываюць нязвыклае для пластыкі вымярэнне — рух. І гэтае арганічнае спалучэнне даўніны і сучаснасці ўражвае ці не найбольш. Хаця ўражвацца ёсць чаму: чаго варты пяцімятровы асілак, які трымае валун! Альбо вятрак, дзе размешчаны чатыры паверхі музея! Навадзельных ветракоў процьма, але толькі ў гэтага самалётныя крылы…

Часам героямі выкананых у традыцыйнай манеры твораў становяцца сучаснікі. Прыкладам, былы прэм'ер-міністр Літвы Андрус Кубілюс выяўлены ў амплуа веласіпедзіста. Тагачасны кіраўнік Урада гэты драўляны шарж ухваліў ды сфатаграваўся з ім. А ў некаторых выпадках героі — самі дрэвы, якія таксама маюць гісторыю ды "рысы твару". Але ёсць тут не толькі творы Часнуліса. Адзін з ягоных праектаў — "сцяна плачу", у нішах якой — постаці "Рупентэйліс", журботнага Хрыста. Гэты тыповы сюжэт быў увасоблены майстрамі з усёй Літвы ў іх аўтарскай тэхніцы. Наогул, экскурсія, якую ладзіць сам аўтар, доўжыцца з гадзіну літаральна на адным дыханні. Вялізная экспазіцыя прадумана да дробязей, і госцю нічога не застаецца, як на кожным кроку выгукаць "Вау!".

Менавіта таму экскурсанты сюды і ездзяць, хаця парк размешчаны не ў найлепшым месцы: да цэнтра Друскенікаў — кіламетраў пяць, і апошнія з іх пераадольваюць па дрэннай гравійцы. Дый уваход не бясплатны. Пагатоў, іншых крыніц фінансавання, апрача продажу білетаў ды сувеніраў, гэты музей не мае.

Мы пісалі ўжо аб нявызначанасці юрыдычнага статуса прыватных музеяў і галерэй на Беларусі, праз што іх уласнікі вымушаны працаваць на агульных умовах са звычайнымі камерсантамі. Не ведаю, ці суцешыць гэта каго, але… У Літве таксама ніякіх ільгот ды паслаблення.

— Па дакументах я — індывідуальны прадпрымальнік, які раней займаўся дрэваперапрацоўкай, а цяпер проста змяніў профіль сваёй дзейнасці, — распавядае Часнуліс. — Некалі выкупіў ва ўласнасць гэтую зямлю (для сельскай гаспадаркі яна непрыдатная, і таму абышлася мне не надта дорага), і цягам пятнаццаці гадоў у сваім прыватным лесе паступова стварыў прыватны музей. Штат у нас — я ды жонка, плюс наймаю рознарабочага. Але працуем рэгулярна і прымаем усіх…

Адпаведна, "рэцэпт выжывання" ад спадара Часнуліса просты: калі прыватны музей створыць такую экспазіцыю, якая здзівіць нават распешчаную сучасную публіку, калі гаспадар не будзе шкадаваць уласнага часу на прыём гасцей, турыст паедзе да яго хоць на край свету.

Сярэднявечны "недабуд"

На пад'ездзе да вёскі Лішкява раптам пачынаецца "халі-галі": рэдка дзе яшчэ сустрэнеш такія рэзкія перапады вышынь. На стромкіх узгорках, адкуль адкрываецца ашаламляльны від на Нёман, з даўніх часоў жылі людзі... Час Вітаўта на адным з тых узгоркаў было вырашана збудаваць крэпасць. Але тут здарыўся Грунвальд, і стратэгічнае значэнне апошняй істотна знізілася: меркаваны праціўнік дыхаў на ладан. Таму ў Лішкяве застаўся ці не адзіны на былых вялікакняжацкіх землях сярэднявечны "недабуд"...

Заканчэнне артыкула чытайце **на старонках 10 — 11.**

XL Міжнародны фестываль мастацтваў **"Беларуская музычная восень"** пройдзе ў Белдзяржфілармоніі 28 кастрычніка — 25 лістапада.

Афіцыйна

Якая ж кніга зацікавіць?

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка чакае ад беларускіх пісьменнікаў ідэй, герояў і твораў, якія змогуць зацікавіць чалавека XXI стагоддзя. Аб гэтым ён заявіў 23 кастрычніка на сустрэчы з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі.

"У чым прычына таго, што за мінулыя дваццаць — трыццаць гадоў так і не з'явіліся сучасныя "Вайна і мір", "Узнятая цаліна"? Гэта што, адсутнасць талентаў? Або аб'ектыўныя ўмовы жыцця, калі кніга перастае быць галоўнай крыніцай інфармацыі?" — пацікавіўся Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што не трэба звязваць змены ў чытацкай свядомасці толькі з тэхналагічнай рэвалюцыяй. На яго думку, напружаны рытм жыцця зрабіў стаўленне да літаратуры прагматычным. "Наш сучаснік выбірае кнігі, якія ўражваюць яго тэмай, героямі або становяцца лекамі ад суму. Сур'ёзная літаратура ператвараецца ў чытанне для інтэлектуалаў", — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы прапанаваў пабудаваць размову вакол галоўных кампанентаў літаратурнай справы: чытач, кніга, пісьменнік. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ў зале сабраліся цікавыя, неардынарныя людзі, з якімі можна паразмаўляць не толькі аб стане айчыннай літаратуры, але і — шырэй — аб духоўнасці, культуры, гістарычным выбары Беларусі.

"Вучоныя сцвярджаюць, што эканамічныя, палітычныя, ваенныя перавагі дзяржавы не ажыццяўляюцца самі па сабе. Яны заўсёды частка і вынік яе духоўнасці ды культуры. Развіццё грамадства, жыццё нацыі магчымыя толькі з апорай на вечную трыяду: навуку, адукацыю, культуру", — адзначыў беларускі Лідар, прапанаваўшы пагутарыць аб тым, якую ролю ў гэтым працэсе адыгрывае мастацкая літаратура.

"Хацелася б пачуць ваша меркаванне пра тое, як сёння захаваць ды развіць літаратурныя традыцыі і пры гэтым не адштурхнуць асноўную масу чытаючай публікі, — сказаў Прэзідэнт. — Ці магчыма прапанаваць сучаснаму чалавеку цікавую яму кнігу, а пісьменніку — знайсці свайго чытача?"

"У жыцці нашага народа літаратура заўсёды была сродкам спазнання свету і выхавання асобы, — адзначыў Лідар дзяржавы. — Нездарма паэзія і проза Купалы і Коласа, Багдановіча і Мележа, Караткевіча і Быкава з'яўляюцца крыніцай нацыянальнай гордасці многіх пакаленняў беларусаў".

"Чаму найвышэйшая планка, узнятая нашымі вялікімі пісьменнікамі, не адпавядае сучаснаму стану літаратурнага працэсу? — звярнуўся Кіраўнік дзяржавы да прысутных. — Магчыма, масцітым пісьменнікам перашкаджае інерцыя мыслення, а маладому пакаленню бракуе жыццёвай мудрасці, досведу? Або проста змяніўся час, і наша літаратура развіваецца ў рэчышчы агульнасусветных тэндэнцый, страціўшы традыцыі нацыянальнай пісьменніцкай школы?"

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што літаратура заўсёды давала ідэі і сюжэты іншым відам мастацтва, і пацікавіўся, як развіваецца гэта творчая садружнасць сёння: "Ці справядлівыя прэтэнзіі пісьменнікаў наконт таго, што сучасныя кампазітары і рэжысёры адвярнуліся ад нацыянальнай літаратуры? Або прычынай спаду інтарэсу з'яўляецца недахоп годных кніг?"

Гаворачы аб пісьменніках, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на адсутнасць вялікіх твораў, нягледзячы на тое, што пісьменнікаў нічога не стрымлівае ў свабодзе творчасці. Ён нагадаў, што ў савецкія часы ў асяродку творчай інтэлігенцыі было прынята скардзіцца на ўціск цэнзуры ды закасцянеласць, коснасць сацрэалізму. "Аднак менавіта ў тыя гады літаратура набыла найвышэйшы аўтарытэт. Яўген Еўтушэнка назваў пісьменнікаў людзьмі, у якіх "блукае горды дух грамадзянства, каму ўтульнасці няма, спакою няма", — адзначыў Прэзідэнт.

"Праўда, я і цяпер, гледзячы нейкія фільмы ды чытаючы тыя або іншыя опусы вялікіх літаратараў, артыстаў і іншага люду з вашага цэха, са здзіўленнем выяўляю тое, што іх, бачыце, там прыціскалі ў савецкія часы, заціскалі, працаваць не давалі, — сказаў Кіраўнік дзяржавы. — Але ўсе яны сталі народнымі, усе жылі добра тады. Таму я раблю скідку, што цяпер стала модна скардзіцца: "Ах, вось тады нас заціскалі, прыціскалі і гэтак далей". Ну, няхай будзе так".

"У нашы дні ніхто не дыктуе, аб чым і як пісаць. Калі дыктуюць, то вы, калі ласка, скажыце, хто і што дыктуе. Адышлі ў мінулае цэнзура і дзяржманаполія на друкаванае слова. Калі не так, вы таксама мне аб гэтым скажыце", — звярнуўся Прэзідэнт да пісьменнікаў. "Аднак свабода не спарадзіла вялікай літаратуры, а прывяла да расколу пісьменніцкай супольнасці, — адзначыў Лідар краіны. — Што гэта, тупік? Ці ў вас ёсць надзея на аднаўленне адзінага творчага поля?"

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што да сённяшняга дыялога запрошаны не толькі пісьменнікі, але і дзеячы культуры, хто так ці інакш звязаны з літаратурай.

Пісьменнікі, якія выступілі на сустрэчы, расказалі аб хвалюючых іх праблемах. У прыватнасці, ішла размова аб сучасных тэндэнцыях у літаратуры і ў цэлым аб зніжэнні інтарэсу да кнігі ў свеце, а не толькі ў Беларусі. І, на іх думку, цяпер сфера літаратуры знаходзіцца не ў лепшым стане. Адказваючы на пытанне, чаму так мала рэкламуюць айчынныя творы і аўтараў, Прэзідэнт звярнуўся да тэмы высакаякаснага мастацкага прадукту: "Скажыце: што рэкламаваць? Дайце прадукцыю, якую можна рэкламаваць, і мы сродкі на гэта знойдзем".

Лідар краіны запатрабаваў эфектыўнай аддачы ад сродкаў, што выдзяляюцца дзяржавай на падтрымку творчых працэсаў. У прыватнасці, ён звярнуў увагу на ўкладанне дзяржавай сродкаў у развіццё кінематаграфічнай галіны. "Аддачы ад гэтага мы пакуль не бачым. А гэта ж грошы народа", — падкрэсліў Прэзідэнт.

Дзяржава чакае ад пісьменнікаў твораў, якія садзейнічалі б выхаванню грамадзян сваёй краіны ды патрыятызму. І грошы тут не заўсёды адыгрываюць галоўную ролю. Самае важнае — гэта талент. На мерапрыемстве былі прыведзены прыклады таго, як часам далёкія ад мастацтва людзі без укладання вялікіх сродкаў ствараюць вельмі папулярныя творы.

Размова аб літаратуры перайшла ў рэчышча гутаркі аб сферы адукацыі. Гаворка зайшла пра тое, якую літаратуру сёння прапануюць чытаць дзецям у школе і ці дастаткова ў гэтым пераліку беларускіх аўтараў. Удзельнікі сустрэчы лічаць, што трэба больш увагі звярнуць на папулярызацыю беларускай мовы — як унутры краіны, так і за яе межамі. Прагучала таксама прапанова падумаць аб стварэнні нацыянальнай ВНУ, дзе выкладанне вялося б толькі на беларускай мове.

Узнята і пытанне работы выдавецтваў, у сувязі з чым было выказана меркаванне аб неабходнасці больш уважліва вывучаць чытацкі попыт, адпрацаваць прапановы па конкурсным падыходзе для выдання кніг з дзяржаўнай падтрымкай. Развіваючы гэтую тэму, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў краіне не будуць працаваць выдавецтвы, дзейнасць якіх супярэчыць нормам закону. "Дзяржава будзе дзейнічаць у рамках закону і маральных прынцыпаў грамадства, — сказаў Прэзідэнт. — Я заўсёды прашу дзяржаўных служачых быць сумленнымі ды справядлівымі. І калі нейкія выдавецтвы будуць супярэчыць гэтым прынцыпам, яны неадкладна будуць закрыты. Гэта мая пазіцыя. І калі міністр гэтага не зробіць, і я зразумею, што ён не зрабіў з-за нейкіх кан'юнктурных меркаванняў, назаўтра ён міністрам не будзе".

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што цяпер у кіно, літаратуры вельмі шмат тэм жорсткасці і насілля, ад якіх большасць чытачоў і гледачоў стаміліся. На яго думку, не хапае папулярных твораў, асабліва ў кіно і на тэлебачанні, у якіх расказваецца аб звычайных чалавечых лёсах.

На сустрэчы выказалі таксама пажаданне, каб у краіне з'явіўся значны літаратурны конкурс. Прэзідэнт падтрымаў гэтую ідэю, адзначыўшы, што крытэрыі адбору і вызначэння пераможцаў павінны выпрацаваць самі пісьменнікі. Ён прапанаваў правесці конкурс да заканчэння 2014 года і абяцаў наведаць яго фінальную частку, калі будуць падводзіцца вынікі.

На завяршэнне сустрэчы Кіраўнік дзяржавы заўважыў: засталіся незакранутымі многія тэмы, і прапанаваў прадоўжыць размову. Ён папрасіў вылучыць для наступнай сустрэчы тыя праблемы, якія магчыма вырашыць толькі на ўзроўні Прэзідэнта.

Паводле паведамлення Прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Віншаванне

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з 70-годдзем з дня заснавання ўстановы. Аб гэтым паведамляюць у Прэс-службе Кіраўніка дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што музей распачаў работу ў адзін з самых важных перыядаў найноўшай гісторыі Беларусі — у год яе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. "Ні вайна, ні пасляваенная разруха не змаглі спыніць высакародны парыў людзей увекавечыць памяць аб тых, хто змагаўся на франтах, у шэрагах партызан і падпольшчыкаў, здзяйсняў працоўныя подзвігі ў імя Перамогі", — гаворыцца, у прыватнасці, у віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка лічыць сімвалічным тое, што ў год святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі музей набыў новы дом. "Дзякуючы вашаму прафесіяналізму і адказнаму стаўленню да справы ў ім створана лепшая экспазіцыя, якая аб'ектыўна расказвае аб гераічных і трагічных падзеях у лёсе Беларусі ды ўсяго свету, — адзначыў Прэзідэнт. — Заслугоўвае высокай ацэнкі той факт, што ваш калектыў уносіць важкі ўклад у процідзеянне фальсіфікацыі гісторыі, вядзе актыўную работу па патрыятычным і духоўна-маральным выхаванні грамадзян, садзейнічае кансалідацыі грамадства".

22 кастрычніка распачаў работу II Міжнародны кангрэс "Бібліятэка як феномен культуры". На адкрыцці форуму кіраўнік Нацыянальнай бібліятэкі беларусі Раман Матульскі нагадаў прысутным (паўтысячы спецыялістаў з Беларусі, Украіны, Азербайджана, Вялікабрытаніі, Германіі, Літвы, Нідэрландаў, Расіі), што сёлета наша краіна адзначае 70-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і столькі ж гадоў спаўняецца бібліятэчнаму факультэту, які яшчэ ў дні Вялікай Айчыннай пачаў рыхтаваць спецыялістаў…

Яўген РАГІН

І ўсё ж:

Інакш кажучы, узнаўленне Беларусі вялося, у тым ліку, і з прыкідкай на перспектыўнае ўдасканаленне бібліятэчнай справы. Так, мы — беларусы — былі вось такімі разважлівымі: кідалі назад, а знаходзілі наперадзе. Неяк рана, на мой погляд, мы пачалі забывацца на спрадвечнае, уласнабеларускае. Іншым разам не кідаем, а закопваем…

Кангрэс меў дзелавы характар. На дзвюх канферэнцыях — "Інфармацыйнае грамадства і грамадства ведаў: роля і месца бібліятэк", "Бібліятэчная адукацыя: традыцыі і навацыі" — акцэнты расстаўляліся на найбольш вострых пытаннях, што паядноўваюць спецыялістаў з самых розных краін. Фрагменты найбольш цікавых выступленняў мы апублікуем пазней.

А сёння я пастараюся распавесці пра змест выступлення дэкана факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Мікалая Яцэвіча, які, па сутнасці, з самага пачатку кангрэса і задаў яму праблемны тон. Дык вось, 1944 год. Урад палічыў адной з першарадных задач неадкладнае аднаўленне знішчаных і разрабаваных кніжных фондаў, а таксама — падрыхтоўку бібліятэчных кадраў з вышэйшай адукацыяй. Тая шматкроць апраўданая жыццёвай практыкай сітуацыя, калі задавальненне матэрыяльнай і духоўнай патрэбы — справа адначасовая, а таму — сістэмная. І тэза пра тое, што мастак павінен быць галодным, — не больш чым прафесійнае какецтва. Урэшце, іканапісец Андрэй Рублёў пасціў перад працай не пад

КУЛЬТУРА МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА
ШТОТЫДНЁВАЯ
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ.
Адказны сакратар: Вольга НАВІЦКАЯ; **рэдактары аддзелаў:** Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Аліна САЎЧАНКА; **загадчык аддзела фотаілюстрацый** — Юрый ІВАНОЎ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Інга ЗЕЛЬГІС.
Сайт: **www.kimpress.by** E-mail: **kultura@tut.by**
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва" 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Прыёмная: (017) 290 22 50. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2014. Наклад 6247. Індэксы 63875, 638752.
Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 24.10.2014 у 17.30. Замова 4247.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Зваротная сувязь: рэплікі і каментарыі

Інтэлігенцыю — у клуб!

Галіна МАХАЕВА, мастацтвазнаўца:

— Апошнім часам мы бачым, наколькі раз'яднаны дзеячы мастацтва, як мала мы ведаем адно пра аднаго. Паўсядзённая занятасць (здымкі, удзел у конкурсах, сустрэчы з чытачамі, выстаўкі, прэзентацыі — і так да бясконцасці) пакідае адчуванне вечнага руху, што не дазваляе спыніцца, падумаць, сустрэцца з калегамі. Яшчэ горш, калі стомішся ці дэпрэсія апануе. Хто дапаможа, хто падбадзёрыць? Бо хочацца ж, каб гэта быў не канкурэнт-зайздроснік, а сябра, у тым ліку па няшчасці…

Ці не прыспеў час з'яднацца? І — стварыць новую грамадскую арганізацыю — клуб мастацкай інтэлігенцыі?

Такі клуб стаў бы месцам зносін, якія ўзбагачалі б кожнага мастака і, як вынік, удасканальвалі б усё беларускае мастацтва. Клуб мог бы падтрымліваць новыя праекты (па магчымасці, матэрыяльна), планаваць ноу-хау на стыку розных жанраў і відаў мастацтваў, разглядаць набалелыя пытанні, прымаць па іх рашэнні з далейшымі рэкамендацыямі для дзяржаўных структур, прыцягваць спонсараў ды мецэнатаў для рэалізацыі праектаў, супрацоўнічаць са СМІ. Прадугледжваюцца і вечары адпачынку, капуснікі, віншаванні юбіляраў, паездкі ў замежжа, наведванне спектакляў, выставак і г.д. Не выключана і навуковая дзейнасць: дыскусіі, "круглыя сталы", канферэнцыі. Арганізацыйны сход адбудзецца 29 кастрычніка а 19-й гадзіне ў канферэнц-зале Палаца мастацтва.

"Пацягнем ідылію, а Вінцэнт Іванавіч будзе радавацца?" / № 32

Grigory Borovik: "Пагаджуся з аўтарам: "Узнікае думка: а мо зрабіць фестываль у Бабруйску, як знакамітую "Любімаўку", Фестывалем новай беларускай п'есы, і кожны беларускі тэатр будзе загадзя рыхтавацца да такога фэсту, а Вінцэнт Іванавіч будзе радавацца з'яўленню ўсё новых драматургаў?.. "

"Беларусы — нацыя кнігі?" / № 32

Chan Kaishy: "Беларусы, мяркую, — нацыя вуснай традыцыі (гэта — навуковы факт), і чужыя кніжныя лаўры ім абсалютна не патрэбны. А патрэбна ў XXI стагоддзі — прадстаўніцтва каранёвай культуры ў інфармацыйных камунікацыях і СМІ, чаго зараз няма".

Сакрэты "Чытай-Горада" / № 38

Людмила Захаревич: "Цудоўны артыкул аб крэатыўных дзяўчатах! З Вольгай Воўк і Вікторыяй Хоміч маю гонар быць знаёмай асабіста. Была б мінчанкай, першай падтрымала б іх новы праект "Чытай-Горад"! Так і патрэбна дзейнічаць, каб нас, бібліятэкараў, заўважылі, ацанілі ды падтрымалі. Што да нас, раённых бібліятэкараў, то ўсе свае намаганні мы скіроўваем на тое, каб нашы сельскія калегі адчулі сваю запатрабаванасць. Так, у нашым горадзе 25 верасня адбылося цудоўнае свята, прысвечанае падвядзенню вынікаў штогадовага конкурсу летняга чытання "Кніжная вясёлка лета" і экалагічнага конкурсу "Зялёныя старонкі", у якіх прымалі ўдзел дзеці з горада ды раёна. Якімі шчаслівымі былі іх твары пасля атрымання

Выстаўка работ васьмі беларускіх мастакоў — удзельнікаў праекта "Арт Zabor" прэзентавана ў Пасольстве Беларусі ў Францыі.

Паводле аднаго выступлення на міжнародным кангрэсе дзе кірунак?

прымусам, а па ўласным жаданні духоўнага ўдасканалення…

Цяпер, па словах дэкана, бібліятэчныя справа і адукацыя перажываюць на постсавецкай прасторы не лепшыя часіны, і тое, што адбываецца сёння ў бібліятэках, ніякім чынам не задавальняе чытача. Пад час аптымізацыі апошніх гадоў колькасць устаноў (асабліва сельскіх) скарацілася, шэраг публічных аб'яднаўся са школьнымі, з'явіліся гібрыды: бібліятэкі-клубы, бібліятэкі-музеі… Інакш кажучы, падкрэсліў выступоўца, аптымізацыя звялася да скарачэння і саміх устаноў, і прафесіяналаў, што забяспечвалі іх дзейнасць. Усё гэта запатрабавала карэкцыі планаў ды навучальных праграм, што ніякім чынам не паўплывала на рост прафесійнага прэстыжу. Мікалай Яцэвіч з такой нагоды агучыў больш чым пераканаўчыя даныя. Калі ў 1972 годзе на дзённым аддзяленні факультэта навучалася 730 студэнтаў, а на завочным — аж тысяча (статыстычны рэкорд!), дык на сёння карціна: 296 студэнтаў — на дзённым, 365 — на завочным. Каментарыі — лішнія.

Гаварыў дэкан і пра адсутнасць дзяржаўных праграм (у тым ліку рэгіянальных) па падтрымцы ды развіцці бібліятэчнай справы. Вось у Расіі — і не толькі ў Маскве — яны дзейнічаюць. Ці не таму замежныя калегі дакладна ведаюць, у якім кірунку ім ісці далей і як развівацца ў перспектыве? Пра беларускі бібліятэчны заробак ды адсутнасць матэрыяльных стымулаў для атрымання вышэйшай адукацыі нават і згадваць не будзем…

Колькасць студэнтаў бібліятэчнага факультэта змяншаецца, патрэба ж у іх застаецца па-ранейшаму высокай. Усё натуральна: старыя кадры няўмольна састарэлі, прыток "новай крыві" — мінімальны. За апошнія гады на кожнага спецыяліста ў сярэднім — дзве заяўкі ад бібліятэчных устаноў. Універсітэт абавязаны забяспечваць набор навучэнцаў, даведзены Міністэрствам культуры Беларусі. Клопат — неймаверна цяжкі. У 2004 годзе, да прыкладу, конкурс быў звыш трох чалавек на месца, у мінулым — 1,5.

Абітурыенты, а ў першую чаргу — іхнія бацькі, даўно ўжо дацямілі, што браць накіраванні, а значыць — "вешаць на шыю" ўласным дзецям абавязковыя адпрацоўкі пасля размеркавання, не мае асаблівага сэнсу. У адпаведнасці з гэтым мэтавы набор штогод скарачаецца. Кіраўнік факультэта перакананы, што такі рэзерв, як прафарыентацыйная работа, выкарыстаны сёння напоўніцу. Прынамсі, дзейнасць бібліятэк у гэтым кірунку, па меркаванні Яцэвіча, нараканняў не выклікае.

Дэкан распавёў, што са спісу патэнцыйных завочнікаў 85 працэнтаў пацвердзілі жаданне вучыцца і прыехалі паступаць у БДУКіМ. Факультэт адмовіўся ад спецыялізацыі усяго толькі з той прычыны, каб выпускнік пасля размеркавання быў гарантавана прыняты на працу менавіта ў бібліятэку. Засталіся толькі чатыры асноўныя накірункі спецыяльнасці: менеджмент, аўтаматызацыя, інфарматызацыя і метадычнае забеспячэнне. Па апошняй навучаюцца выпускнікі Магілёўскага дзяржаўнага бібліятэчнага каледжа, з якім у БДУКіМ самыя цесныя творчыя стасункі.

Мікалай Яцэвіч агучыў і праблему з нявызначаным статусам студэнта, што адвучыўся ў магістратуры. Сапраўды, а кім можа і павінен працаваць бібліятэчны магістрант? Сацыяльнага азначэння яму на беларускіх абсягах проста не існуе. Таму не вызначаны і пасады для магістрантаў. Універсітэт, па словах "бібліятэчнага" дэкана, прасіў Міністэрства культуры ўнесці, урэшце, канкрэтныя змяненні ў Дзяржаўны кваліфікацыйны даведнік. Просьба, відаць, і па сёння знаходзіцца ў стадыі разгляду. Агульная сітуацыя да лепшага не змяняецца. Тэндэнцыі далейшага развіцця айчыннай бібліятэчнай справы — відавочныя. Як, зрэшты, і яе несуцяшальная перспектыва.

К

Як у суседзяў?

Ядвіга МІСЮНЕНЕ,
старшы бібліёграф аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі Літвы імя Марцінаса Мажвідаса:

— Даведалася, што ў асобных беларускіх вясковых бібліятэках ёсць музеі старых кніг, і вельмі здзівілася. У Літве такога няма…

Вадзім СЦЯПАНАЎ,
прафесар Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:

— Якім павінен быць бібліятэкар лічбавай эпохі? Лідарам мясцовай супольнасці! Калі казаць пра сельскую бібліятэку, дык важнасць яе існавання нельга і ў думках ставіць пад сумненне. На вялікі жаль, бібліятэчныя ўстановы ў вёсках закрываюцца не толькі ў Расіі і Беларусі, — гэта сусветная тэндэнцыя… У чалавецтва змяняецца сістэма камунікацыі. Раней яна была друкаванай, цяпер — лічбавая. Калі тэндэнцыя захаваецца, то знікненне бібліятэк стане непазбежным. Але выйсце ёсць. Бібліятэкі павінны пераймаць новыя функцыі. Не хапацца з апошнімі сіламі за друкаваную прадукцыю і казаць, што, маўляў, мая функцыя — толькі кнігі выдаваць. Калі ў кожнага другога маецца камп'ютар, планшэт ці смартфон, і людзі карыстаюцца лічбавымі рэсурсамі, то такі падыход бібліятэкара да справы — не рацыянальны, тупіковы. Быць інтэлектуальным, інавацыйным цэнтрам для мясцовай супольнасці — вось на што павінна арыентавацца бібліятэка, каб захавацца як аб'ект культуры.

Георгій САПРЫКІН,
дырэктар Дзяржбібліятэкі Украіны для юнацтва:

— У Беларусі не існуе бібліятэк для юнацтва. Ёсць яны ў Расіі, Казахстане, Германіі, Швецыі… Сёння, зразумела, ідзе барацьба за розумы. І нельга моладзь пакідаць па-за ўвагай. Працуем і ў адукацыйным полі, і ў галіне культуры, адпачынку. У бібліятэцы ёсць аддзел мастацтваў, які адказвае за правядзенне масавых мерапрыемстваў, ёсць музычная апаратура, сцэна, выставачная зала. Так што ў нас іншым разам і чытаюць, і танцуюць, і знаёмяцца з выяўленчым мастацтвам. Колькасць чытачоў — стабільная. Чытацкі білет — электронны, што выключае прыпіскі…

Алена ЯРОМІНА,
дырэктар Дэпартамента электронных рэсурсаў расійскага падпіснога агенцтва "Канэк":

— Мы працуем з замежнай літаратурай і з электроннымі рэсурсамі. Вельмі даўно супрацоўнічаем з вашай Нацыянальнай бібліятэкай, забяспечылі яе электроннай базай многіх вядомых у свеце выдавецтваў. У Расіі мы працуем у асноўным з дзвюма нашымі Нацыянальнымі, а таксама ўніверсітэцкімі і абласнымі бібліятэкамі, што маюць патрэбу ў навуковай інфармацыі. Але ведаю, што і нашы дробныя публічныя ўстановы маюць неблагі электронны рэсурс. Сярод моладзі ён карыстаецца попытам…

Зваротная сувязь: рэплікі і каментарыі

цудоўных падарункаў, на якія не паскупіліся шчодрыя спонсары! З'яўляюся арганізатарам такіх святаў дзіцячага чытання цягам многіх гадоў і не магу сабе ўявіць бліжэйшае будучае, калі ў выніку татальнай аптымізацыі перастануць існаваць сельскія бібліятэкі… Хто падтрымае тое дзіця, якое пакуль яшчэ чытае, хто скажа маленькаму наведвальніку, што ён лепшы чытач, да прыкладу, Глівінскай бібліятэкі, калі ў той вёсцы няма нават школы?!. Так што сталічныя пісьменнікі ды сталічныя бібліятэкары, просім вас да нас, у глыбінку, каб здзвіліся вы, што і ў аддаленай вёсачцы ёсць апантаныя людзі, бібліятэкары, якія робяць усё, каб зрабіць сваю ўстанову культуры радасным маячком у шэрай будзённасці клопатаў сельскага жыцця! Падтрымайце сваіх таварышаў цікавай захапляльнай акцыяй ды добрым словам! Калі сталічны бібліятэкар са сталічным чытачом і сталічным пісьменнікам завітаюць у вёску, яна адчуе, што камусьці яшчэ патрэбная…"

"І што тут дзіўнага?" / № 40

Людмила Захаревич: "Цікавы артыкул, выклікае розныя пачуцці, жаданне палемізаваць! Я ў трэцім пакаленні беларускі філолаг, і бібліятэка наша хатняя складалася, у асноўным, з класікі беларускай. А мне самой пашчасціла быць знаёмай з многімі сучаснымі нашымі пісьменнікамі ды іх цудоўнымі творамі, і таму шчыра жадаю, каб яны, гэтыя творы, чыталіся. Аб піяр-акцыях бібліятэкі, дзе працую, па меры магчымасці распавядаю ў групе ў сацыяльнай сетцы, а што да кніг замежных аўтараў у перакладзе на беларускую мову, то гэта гаворка асобная…"

"З гледачом усё ў парадку…" / № 40

Pavel Voinitski: "Слушныя каментарыі да выстаўкі!"

Alaksandra Bajaryna: "Дзякуй, Павел! Думала, можа, хто пакрытыкуе мяне, дыскурс распачнём".

Pavel Voinitski: "На жаль, дыскурсу не атрымаецца, бо я амаль з усімі заўвагамі згодны. А асабліва — наконт неактуальнасці тэрміна "актуальнае мастацтва".

Alena Shalima: "Цалкам згодная. "Папулярны куратарскі выраз "уключэнне ў еўрапейскі кантэкст"... Але развіваць сваё і дацягваць да замежнага — прынцыпова розныя шляхі. У першым варыянце мэта — мець сваё, у другім — мець такое сваё, на якое дасць дабро нехта там за мяжой, а гэта шлях паўтору". Гэта больш за ўсё спадабалася!"

Фотасюжэт нумара

З даспеха рыцара

Як мы і абяцалі ў № 42, знаёмім вас з унікальнай захаванасці даспехам рыцара, які служыў у Мсціславе.

Гэты ваяр, мяркуюць гісторыкі, загінуў у 1502 годзе ў бітве паміж войскамі Вялікага Княства Літоўскага і маскоўскімі войскамі. Як зазначыў дырэктар Музея гісторыі горада Магілёва Аляксей Бацюкоў, вядомая нават дакладная дата яго смерці: 4 лістапада. Даспех быў знойдзены ў Мсціславе ў ліпені мінулага года "чорнымі капальнікамі", але рознымі шляхамі ён усё ж такі трапіў у рукі археолагаў, а тыя перадалі знаходкі ў магілёўскі музей. Цяпер артэфакт адрэстаўраваны, адбылася кансервацыя, і ў хуткім часе плануецца размясціць яго ў пастаяннай экспазіцыі Музея гісторыі горада Магілёва.

Нагадаем, экспедыцыі на Замкавую гару ў Мсціславе ўжо неаднойчы ладзіў доктар гістарычных навук, прафесар Ігар Марзалюк. А сёлета, пад час "Рыцарскага фэсту", астанкі ваяра былі з вайсковымі ўрачыстасцямі перапахаваны ў гэтым старажытным горадзе.

Аляксей Бацюкоў дэманструе элементы рыцарскага даспеха. / Фота Сяргея ТРАФІЛАВА

Вялікі тэатр у рамках V Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму праводзіць з 10 па 18 снежня **I Міжнародны конкурс вакалістаў**.

Дзяжурны па нумары

Партрэты і сцены

Параўноўваючы колішні будынак Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на Кастрычніцкай плошчы і новы на праспекце Пераможцаў, мушу адзначыць: стала лепш, чым раней. Відавочна, што ў старых сценах музею было цесна, а пашырацца не было куды. Цяпер і плошчы паболела, і парк Перамогі ўспрымаецца працягам экспазіцыі. А новая экспазіцыя — гэта погляд на гісторыю з гледзішча суверэннай дзяржавы, адлюстраванне ўласна беларускага разумення Другой сусветнай / Вялікай Айчыннай вайны.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

"Забытыя" партрэты на пачатку тыдня на сценах старога будынка музея. / Фота Андрэя ЗЗЕРЫНА

Як мінчанін я радуюся, што мой горад узбагаціўся музейным комплексам, які адпавядае сучасным патрабаванням, але адначасова мне шкада старога будынка, што ўжо стаў часткай гісторыі нашай сталіцы і, у нейкім сэнсе, — маёй біяграфіі. Я такі не адзін. Пра гэта разважалі і спецыялісты, якія маюць непасрэднае дачыненне да архітэктуры ды горадабудаўніцтва, і звычайныя жыхары Мінска. Пачуццё страты абвастраецца яшчэ і праз тое, як робіцца гэты дэмантаж…

Днямі ў Сеціве з'явіліся фота, па якіх можна зрабіць выснову, што ў памяшканнях колішняга музейнага будынка сям-там засталіся фрагменты экспазіцыі, якія зараз выносяць адтуль разам са смеццем. На тых здымках бачна, што ў напаўразбураных залах на сценах вісяць фотапартрэты ветэранаў вайны — не іначай як забытыя пры пераездзе. Глядзіш на гэта і думаеш: да тых партрэтаў прыводзілі піянераў ды камсамольцаў, заклікалі іх раўняцца на Подзвіг бацькоў, а зараз выявы герояў — нікому не патрэбнае смецце… Калі для гэтых здымкаў не было прадугледжана месца ў новай экспазіцыі, дык чаму іх не перадалі школьным ці ведамасным музеям, дзе яны маглі б аказацца вельмі дарэчнымі? Адказаць на дадзенае пытанне мы папрасілі дырэктара музея Мікалая Скобелева.

Паводле ягоных слоў, гэта ўсяго толькі выцвілыя фотакопіі, — самі ж арыгіналы здымкаў захоўваюцца ў фондах музея. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ніколі не адмаўляўся ад метадычнай ці якой яшчэ дапамогі музеям, створаным пры навучальных ды іншых установах. Такой справай займаюцца супрацоўнікі і зараз. Што да згаданых фотакопій, дык дарыць іх каму-небудзь не мела ніякага сэнсу, бо папросту скончыўся тэрмін іх карыстання.

Пагодзімся, што так яно і ёсць. Мікалая Вітальевіча можна зразумець. Пераезд музея падобнага кшталту і статуса ў новы будынак — гэта, што ні кажы, эпапея. Пры такой вялікай справе цяжка ўсё прадугледзець. Магчымая сітуацыя, што да чаго-небудзь рукі не дойдуць, бо яно ў патрэбны момант на вочы не трапіцца. Вось і аказалася, нібыта драбяза па-за гаспадарскім вокам. Усё разумею, але шкада партрэтаў ветэранаў, "забытых" у будынку пад знос.

Сітуацыя за тыдзень вырашылася. Асадак жа ўсё адно застаўся…

Сітуацыя

Канфліктныя сітуацыі на працы — з'ява нярэдкая. А тым больш — з дзеячамі культуры, якія ўжо паводле сваёй прафесіі павінны вылучацца павышаным эмацыйным парогам і тонкасцю псіхалагічных адчуванняў. Але гэтым разам справа тычыцца не шараговага супрацоўніка, а мастацкага кіраўніка (ужо некалькі дзён як былога) гурта сучаснай харэаграфіі "ТАД" з Гродна.

Надзея БУНЦЭВІЧ

…Можа, і сапраўды ўтрасецца?

Як "ТАД" будзе далей "насуперак зямному прыцягненню — лётаць"?

Сапраўды, **надзея памірае апошняй.** Таму не будзем паўтараць савецкія часы, калі пытанні вырашаліся прыездам карэспандэнта "з цэнтра", нагадваючы жанр "оперы выратавання". Але не звярнуць увагу чытачоў на гродзенскі "ТАД" і яго арганізатара — немагчыма. Тым больш, што летась калектыў справіў сваё 20-годдзе, а некалькі гадоў таму быў адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

"Па ўзгадненні…"

— Звальненне адбылося "па ўзгадненні бакоў", — пракаментавала сітуацыю дырэктар Гродзенскай абласной філармоніі Таццяна Власенка. — Думаю, усім трэба набрацца цярплівасці і пачакаць. А ў Інтэрнэце ўжо столькі бруду вылілася, што Дзмітрыю самому непрыемна. Не шкодзьце чалавеку, дайце яму магчымасць падумаць, што рабіць. Прыйдзе час — ён сам усё раскажа. Я ж яму не вораг: працаваў ён заўсёды роўна, спакойна, атрымліваў прэміі. Апошнім часам калектыў пачаў ужо і ездзіць за грошы філармоніі, і касцюмы шыць, лінолеум мы ім прыдбалі. Бо ў мяне ажно сэрца сціснулася, як убачыла, што яны з босымі нагамі — па шурпатай падлозе са стрэмкамі… Сумна іншае: пры ўсіх абставінах, што склаліся, мне патэлефанавалі толькі вы і адна мясцовая газета...

Звязаліся мы і з мастацкім кіраўніком Гродзенскай абласной філармоніі Віктарам Сакалоўскім.

— Каментарыяў па тэлефоне я не даю, — адказаў Віктар Іосіфавіч. — Аддаю перавагу таму, каб працаваць вочы ў вочы. У вас няправільная інфармацыя: Куракулаў Дзмітрый Сяргеевіч не быў звольнены, а напісаў заяву па ўласным жаданні. У яго была магчымасць перадумаць. Калі вас гэта хвалюе, прыязджайце, тады пагаворым. Гэта сур'ёзная тэма, і тычыцца яна выканання абавязацельстваў і культуры чалавечых узаемаадносін...

— А можа, пачакаем? — пачулі мы, звярнуўшыся да самога Дзмітрыя Куракулава. — Бо ўжо адбылася размова ў аблвыканкаме, дзе мы сядзелі адно насупраць аднаго, вочы ў вочы. Можа, неяк усё ўтрасецца?..

Сапраўды, надзея памірае апошняй. Таму не будзем паўтараць савецкія часы, калі пытанні вырашаліся прыездам карэспандэнта "з цэнтра", нагадваючы жанр "оперы выратавання". Але не звярнуць увагу чытачоў на гродзенскі "ТАД" і яго арганізатара — немагчыма. Тым больш, што летась калектыў справіў сваё 20-годдзе, а некалькі гадоў таму быў адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

І пра з'яву

Цяперашні "ТАД" у сучаснай беларускай харэаграфіі — гэта прыблізна тое ж самае, чым былі "Песняры" на нашай эстрадзе 1970-х. Іншымі словамі, прарыў яшчэ адной галіны нацыянальнай культуры на сусветную прастору. Цікава, але ёсць і некаторыя асабістыя паралелі. Як і Уладзімір Мулявін, Дзмітрый Куракулаў — родам з Расіі. Але ўся творчасць гэтага харэографа звязана з нашай краінай. І пачыналася яна, як і ў Вялікага Песняра, з артыстычнай сцяжынкі: Дзмітрый працаваў у Гродне ў знакамітым Ансамблі танца, музыкі і песні "Белыя росы". А потым арганізаваў уласны калектыў — "ТАД", пачаўшы шлях да новых гарызонтаў.

Памятаю, як на IFMC — Міжнародным фестывалі сучаснай харэаграфіі ў Віцебску — яшчэ ў першай палове 1990-х усе былі ўзрушаны дагэтуль невядомым гуртом і яго крэатыўнымі пастаноўкамі, што разбуралі нашы ўяўленні пра гэты від мастацтва. Сёння ў Дзмітрыя Куракулава шмат паслядоўнікаў, прычым некаторыя з іх выйшлі непасрэдна з яго калектыву. Аляксандр Цебянькоў арганізаваў Танц-тэатр "Галерэя" пры Гродзенскім абласным драматычным тэатры, Вольга Лабоўкіна — "Karakuli" ў Мінску. А яшчэ Куракулаў распрацаваў унікальную ўласную методыку навучання харэаграфічнаму мадэрну, комплекс пластычных практыкаванняў, якія дапамагаюць артыстам выконваць надзвычай складаныя рухі без аніякага траўматызму, непазбежнага ў гэтым відзе мастацтва. Творчая фантазія Куракулава як харэографа — папраўдзе бязмежная. А вось пра аўтарскія правы ён не надта і клапоціцца. Мне неаднойчы даводзілася заўважаць (у тым ліку, на старонках "К"), як іншыя тыражавалі яго знаходкі — ну проста адзін у адзін! Ён пры гэтым толькі ўсміхаўся: значыць, спадабалася, а я, маўляў, яшчэ нешта новае прыдумаю. Так што калі ў "Камарынскай" Міхаіла Глінкі, паводле слоў Пятра Чайкоўскага, "як дуб у жалуды, заключана ўся руская сімфанічная музыка," дык тое ж можна сказаць і пра харэаграфію Куракулава: у ёй — увесь далейшы беларускі авангард.

Сведчаннем яго прызнання ў краіне і за межамі — не толькі шматлікія конкурсныя ўзнагароды, але і запрашэнні выступіць, ажыццявіць пастаноўку, правесці майстар-клас.

— Гэта, безумоўна, лідар сучаснай беларускай харэаграфіі, — кажа намеснік генеральнага дырэктара па спецпраектах Цэнтра культуры "Віцебск", ініцыятар і дырэктар IFMC Марына Раманоўская. — Тое ж адзначаюць штогод і замежныя прафесіяналы: члены журы, госці і ўдзельнікі фестывалю. Сумленны, прыстойны, верны чалавек і творца. Вышэй за ісціну танца для яго нічога няма.

— Сёння можна ўжо сцвярджаць, — адзначае балетны крытык Святлана Уланоўская, — што Дзмітрый Куракулаў, выхаваўшы некалькі пакаленняў паслядоўнікаў, склаў нацыянальную школу беларускай харэаграфіі contemporary. Я падлічыла: яму і ягонаму калектыву прысвечаны больш як дваццаць маіх артыкулаў. У кнігах пра сучасную харэаграфію яму ўвогуле адводзяцца цэлыя раздзелы. Дадам і тое, што ён стаў першым беларускім харэографам, чыя пастаноўка скарыла надзвычай прэстыжную вяршыню Міжнароднага конкурсу ў Джэксане (ЗША). Там ягоную кампазіцыю "Гэты крохкі вечны рай" паказвалі салісты нашага Вялікага тэатра, лаўрэаты міжнародных конкурсаў Кацярына Алейнік і Канстанцін Кузняцоў…

— Дзмітрый Куракулаў, — упэўнена доктар мастацтвазнаўства, прафесар Юлія Чурко, — адзін з самых таленавітых беларускіх творцаў. І яшчэ далёка недаацэнены. Чаму? На маю думку, з-за свайго характару. Дарэчы, зусім не "выбуховага", як мог бы хтосьці падумаць, — наадварот! Надта ўжо ён сціплы, засяроджаны ажно на творчасці, а не на піяры вакол сваёй асобы. Не ўмее сябе паднесці, як гэта робяць іншыя. І ўвесь час шукае нешта новае, не паспяваючы як след замацаваць за сабой свае "фірмовыя" знаходкі. Пры тым што ягоны почырк адразу пазнаецца, Дзмітрый як харэограф практычна не паўтараецца. Паўтараюць за ім іншыя! Ён жа ў гэты час ужо шукае нейкую новую лексіку, не баіцца ісці на самыя смелыя эксперыменты — не толькі ўласна ў харэаграфічнай лексіцы, але і ў асваенні сцэнічнай прасторы, разуменні кожнай кампазіцыі як неверагодна фантазійнага, заўсёды глыбока канцэпцыйнага, заснаванага на сінтэзе жанраў, стыляў, відаў мастацтваў, папраўдзе "сімфанізаванага" відовішча. Паспрабуйце прааналізаваць любую яго пастаноўку — вы адразу заўважыце, што літаральна кожная амаль цалкам складзена з цікавых лексічных знаходак. Няма так званых агульных форм руху — толькі адметныя, асэнсаваныя пластычныя элементы. У гэтым і ёсць талент! А між тым, сапраўднымі лексічнымі знаходкамі можа пахваліцца далёка не кожны харэограф-пастаноўшчык. Звычайна яны бываюць — на вагу золата. Куракулаў жа часам папросту "раскідваецца" імі, ды так, што глядач ажно не паспявае за ўсім прасачыць. Таму і хочацца глядзець яго шматлікія (падкрэслю гэтае слова, бо пладавітасць пры такой вынаходлівасці таксама неверагодная) — шматлікія балеты ды мініяцюры зноў і зноў!..

■■■

Можа, проста супадзенне, але інфармацыя пра "ТАД" на сайце Гродзенскай абласной філармоніі (дарэчы, вельмі поўная, з падрабязным пералікам "заслуг перад Айчынай") пачынаецца эпіграфам самога Дзмітрыя Куракулава: "Не для того ль нас выпускают в жизнь, / Чтоб вопреки невзгодам сильным стать, / Чтоб вопреки земному притяжению летать?..". Няўжо — сам сабе напрарочыў?..

ф о т а ф а к т



Рушчыц у Беларусі

Нашу краіну наведаў унук слыннага беларускага мастака XX стагоддзя Фердынанда Рушчыца — поўны цёзка свайго знакамітага продка. Рушчыца-малодшага, дырэктара Цэнтра грошай Нацыянальнага банка Польшчы, прыняў міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў. Затым госць краіны пабываў у Нацыянальным мастацкім музеі рэспублікі, дзе пабачыў карціну "Ля касцёла" свайго знакамітага дзеда.

Фота Юрыя ІВАНОВА

Дырэктарам Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа ў Віцебску прызначаны **Аляксандр Старых**.

"І ўсё ж артысту патрэбна студыя"

ТЭКСТ

Анатоль КАШАПАРАЎ,
заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь,
саліст ансамбля "Песняры" ў 1972 — 1989 гадах

Рэпертуару для мяне як сольнага артыста дастаткова. У першую чаргу за кошт таго, што пакрысе хачу аднавіць частку тых вартых увагі рэчаў, якія ў свой час практычна не выконваліся на канцэртах "Песняроў" па розных прычынах. Іх няма ў запісах, але якія там годныя музыка, паэзія!.. Хочацца выказаць сваё бачанне творчасці ансамбля ў рэчышчы традыцыі. Дый над тым жа сольным рэпертуарам патрэбна дзесьці працаваць. Пытанне ў тым, дзе менавіта. А дакладней — за якія грошы.

Талентаў у нас заўжды хапала. Не так даўно паслухаў у Сеціве хлопца з Жодзіна — Яўгена Літвінковіча, што перамог на ўкраінскім талент-шоу: шыкоўна, музычна, душэўна! Вось каго варта прасоўваць! У нас жа часцей — даніна модзе. А што з музыкай, вакалам? Сам пяю, пішу, складаю тэкст, аранжыруе — такога, як правіла, надоўга не хапае, а калі мінімальны поспех становіцца нагодай для адкрыцця ўласнага музычнага бізнесу… Падобных захадаў (лічыце мяне кансерватарам!) не разумею, бо гэткі падыход надта ж далёкі ад мастацтва. Так, мы маем высокі ўзровень па рэжысуры канцэртаў і тэлетрансляцыяй, па аператарскай рабоце, пастаноўцы святла, але, упэўнены, гэта павінна заставацца дадаткам, "абгорткай" для таленту, а не наадварот.

У забяспечаных спонсарамі артыстаў-пачаткоўцаў маюцца студыі, персанальныя музыканты-кампазітары-аранжыроўшчыкі. А ў выпадку, калі падобнага няма, неабходна выкласці, прынамсі, па пару тысяч еўра за адзін твор. Вось і падлічыце каштарыс стандартнага па працягласці альбома…

Чаму так атрымалася з тымі (даруйце за нясціпласць, але згадаю і сябе), хто дзесяцігоддзямі працаваў на карысць айчыннай музычнай прасторы? Чаму ўстановы адпаведнага профілю не маюць тут зацікаўленасці? Мы, многія заслужаныя і народныя артысты, страчваем свае нервы, марнуем час на выпрошванне грошай у багатых людзей, прадпрыемстваў на тыя запісы…

Мо прыспеў час задумацца пра стварэнне нацыянальнай студыі гуказапісу, якая займалася б усімі этапамі "правядзення" артыста — ад узроўню запісу да прасоўвання гатовага альбома? Такая студыя з годнымі прафесіяналамі ў штаце магла б узяць пад сваё крыло сапраўдных музыкантаў, вакалістаў, якім не патрэбна сродкамі электронікі выводзіць сабе голас і гучанне. Упэўнены, мы даволі хутка пабачылі б вынікі. Чаму тое выгадна для дзяржавы? Бо падобны праект стаў бы пунктам прыцягнення талентаў самых розных пакаленняў, чыя вартасць — несумненная.

Чаму так атрымалася з тымі (даруйце за нясціпласць, але згадаю і сябе), хто дзесяцігоддзямі працаваў на карысць айчыннай музычнай прасторы? Чаму ўстановы адпаведнага профілю не маюць тут зацікаўленасці? Мы, многія заслужаныя і народныя артысты, **страчваем свае нервы, марнуем час на выпрошванне грошай** у багатых людзей, прадпрыемстваў на ўласныя запісы…

Пакуль жа многія з нас, скажам так, — творча беспрытульныя. Бывае ж, падораць табе пасля канцэрта вершаваны зборнічак, і з пяці-дзесяці вершаў адзін зачэпіць, папросіцца ў песню. Але дзе і каму з такім творам працаваць, як наогул навучыцца не адфутбольваць невядомых нікому патэнцыйных выканаўцаў ды аўтараў? Бо часам дастаткова зрабіць і адзін запіс, каб пераканацца ў вартасцях творцы, а рабіць яго, паўтаруся, няма дзе. На нацыянальнага кшталту студыі, якая, дарэчы, магла б стаць даволі аб'ектыўнай прасторай па рэкамендаванні артыстаў на творчыя конкурсы, зыходзячы з іх прафесійнага даробку, а не тэлевізійнай карцінкі.

На падставе ўласнага досведу пражывання ў ЗША зазначу: калі там прыводзяць адоранае дзіця трох-чатырох гадоў у нейкую профільную ўстанову і ў яго разгледзяць талент, педагогі стануць гадаваць хлопчыка альбо дзяўчынку для будучай прафесійнай кар'еры. У нас жа стаўленне да такога росту ў эстрадных жанрах, як мне бачыцца, — больш як да дадатковай адукацыі, без прыцэлу на прафесію. Але поспех тых жа Брытні Спірс і Джасціна Тымберлейка каваўся ўжо ў дзяцінстве праз праслухоўванні, адборы, конкурсы… Урэшце, маем і праблему знікнення з поля зроку юных артыстаў, як толькі яны перасягаюць пэўную ўзроставую ці адукацыйную планку. На жаль, з таленавітых дзяцей хіба адзінкі вяртаюцца да шырокай публікі і становяцца для яе цікавымі ў больш сталым узросце, пасля атрымання адукацыі.

Агучваючы ідэю нацыянальнай студыі, не кажу ў наш складаны эканамічны час пра чарговую культурную ўстанову "на шыі" ў дзяржавы, не. Студыя з гэткім статусам мусіць стаць гасразліковай, але, прынамсі, на першых парах, з падтрымкай афіцыйных інстытуцый. І ўжо дакладна яна не зможа абысціся без падтрымкі бізнес-партнёраў. Урэшце, гаворка — не пра палацы або шыкоўныя навабуды. Справа ў камфортных, тэхнічна ды кадрава забяспечаных умовах для працы з таленавітымі людзьмі рознага веку з усёй краіны ды з прыцэлам на перспектыву беларускай культуры…

Настроі добрасуседства

ТЭКСТ

Захар ШЫБЕКА,
доктар гістарычных навук, прафесар

Я ўжо некалькі гадоў працую ў Ізраілі, і на падставе ўласнага досведу магу канстатаваць, што гэта краіна, дзе шануецца інтэлект. Там, у прыватнасці, у адрозненне ад многіх іншых дзяржаў, няма патрэбы ў спецыяльным пацвярджэнні майго прафесарскага звання, атрыманага ў Беларусі. Быў я прафесарам у Мінску — застаюся і тут. У Ізраілі запатрабаваным аказаўся не столькі мой выкладчыцкі досвед, колькі патэнцыял навукоўца-даследчыка.

Я працую ў Навуковым цэнтры вывучэння яўрэйскай дыяспары, займаюся гісторыяй беларускага яўрэйства. Мая запатрабаванасць, сярод іншага, абумоўлена яшчэ і тым, што сёння сярод ізраільскіх навукоўцаў становіцца ўсё менш спецыялістаў з веданнем рускай мовы. Яны звычайна карыстаюцца іўрытам і англійскай. Мне ж лёгка працаваць з дакументамі, датычнымі часоў Расійскай імперыі.

Пашырэнне ведаў пра Беларусь у Ізраілі і пра Ізраіль у Беларусі паспрыяе пашырэнню эканамічных сувязей, турбізнесу. Я ведаю, што **многія ізраільцяне шануюць свае беларускія карані** і хацелі б наведаць святыні ў Беларусі.

Ізраільскія навукоўцы, якія займаюцца гісторыяй дыяспары, часам схільныя разглядаць яўрэяў у іншых дзяржавах у адрыве ад гэтых народаў і дзяржаў. Мяне ж заўжды цікавіў кантэкст той або іншай з'явы. Вось і зараз я засяроджваюся менавіта на яўрэйска-беларускіх дачыненнях і лічу яўрэяў на беларускай зямлі часткай беларускага гісторыка-культурнага абшару.

Маім плюсам як навукоўца з'яўляецца тое, што я прайшоў савецкую школу сацыялогіі і праз гэта бачу ўзаемасувязь сацыяльнай ды эканамічнай гісторыі. У Беларусі я займаўся гісторыяй яўрэяў Мінска. У дадзенай тэме спалучаны сацыяльны, эканамічны і культурны чыннікі. І вось мае доследы, актуальныя для Беларусі, аказаліся вельмі дарэчнымі ў Ізраілі.

Я глыбока перакананы, што, вывучаючы асобныя этнічныя групы ды культурныя супольнасці ў межах той або іншай нацыі (у дадзеным выпадку гаворка — пра Беларусь), мы ўзбагачаемся ведамі пра нацыю ўвогуле. Канкрэтна пра яўрэяў можна сказаць, што гэта народ урбанізаваны, і ягоная прысутнасць у беларускім культурным абшары відаць якраз на прыкладзе гісторыі развіцця гарадоў.

Мушу нагадаць, што ўвагі навукоўцаў патрабуюць і іншыя этнічныя групы Беларусі. У прыватнасці, рускія, украінцы. Парадаксальна тое, што расійскія навукоўцы цікавяцца Беларуссю значна больш, чым беларускія — Расіяй…

Вывучэнне ж яўрэйска-беларускіх стасункаў, да якога я як навуковец маю дачыненне, пашырэнне ведаў пра Беларусь у Ізраілі і пра Ізраіль у Беларусі, на маю думку, будзе спрыяць настроям добрасуседства. А гэта, у сваю чаргу, — пашырэнню эканамічных сувязей, турыстычнаму бізнесу. Я ведаю, што многія ізраільцяне шануюць свае беларускія карані і хацелі б наведаць яўрэйскія святыні ў Беларусі.

Жывучы ў Ізраілі, сувязі з калегамі з Беларусі я не парываю. Сведчаннем гэтаму — нядаўняя прэзентацыя зборніка "Гісторыя гандлю ў Беларусі" ў Нацыянальным гістарычным музеі. Я — навуковы кіраўнік гэтага праекта. А спонсар даследавання — беларуская прыватная структура.

Магчыма ці немагчыма?

ТЭКСТ

Алег ЧЭЧАНЕЎ,
акцёр Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача, рэжысёр

Напярэдадні афіцыйнага адкрыцця тэатральнага сезона Мінскі абласны тэатр лялек "Батлейка" (Маладзечна) ласкава прадаставіў сваю сцэну для паказу спектакляў акцёрскай асацыяцыі "Unia Teatr Niemozliwy" калег-лялечнікаў з Варшавы. Афіша, выстаўленая ў фае, паведаміла, што паказ праходзіць у рамках Фестывалю польскага тэатра лялек і анімацыйнага кіно для дарослых "Лялька таксама чалавек".

У адказ на пытанне, зададзенае з мэтай (простая цікавасць) атрымаць якую-небудзь інфармацыю пра гэты калектыў, мая польская калега адказала прыкладна наступнае: тэатр вядомы ў Польшчы вузкаму колу спецыялістаў і ставіць альтэрнатыўныя "рэчы" ў розных жанрах ды формах. Ужо цікава! І яшчэ... Я не прыгадаю выпадку, калі ў Маладзечне гастралявалі тэатральныя калектывы з замежных дзяржаў, акрамя краін СНД. Гэта і падштурхнула мяне да таго, каб паглядзець спектаклі польскіх акцёраў.

Пастаноўка для дзяцей "Пад падлогай" ідзе без слоў, і ў ёй заняты ўсяго два выканаўцы — дзяўчына і хлопец. Дэкарацый, у звыклым разуменні, на сцэне няма. Затое ёсць рэквізіт, які абыгрываецца ў адпаведнасці з рэжысёрскімі задачамі. Асабіста мне гэткая дзея падалася наборам умоўных эцюдаў з элементамі пантамімы і блазнавання — прыкладна так, як у бязмоўным экзамене па сцэнічным руху і акцёрскім майстэрстве ў студэнтаў-першакурснікаў. І скіравана яна на дзіцячае ўспрыманне, уяўленне ды абстрактнае мысленне.

Што казаць пра маленькіх гледачоў, калі я, дарослы чалавек, злавіў сябе на думцы, што з няменшым азартам спрабаваў "расшыфраваць" для сябе чарговы "эцюд", пасыл выканаўцаў і ў думках адказаць на пытанне "Што б гэта значыла?". І гэта прытым, што ў спектаклі адсутнічае якая-небудзь гісторыя, сюжэт. Калега з маладзечанскага лялечнага тэатра, які мае вялікі фестывальны досвед, прызнаўся: "Колькі разоў бачыў падобныя спектаклі, заўсёды задаю сабе адно і тое ж пытанне: як яны, акцёры, ва ўсім гэтым існуюць, жывуць? Мы — іншыя. У нас школа іншая. Мы выходзім на сцэну з адрознымі задачамі".

Гастролі варшаўскага тэатра па Беларусі адбыліся дзякуючы Культурнай праграме Еўрасаюза. Можа быць, і ў нас **калі-небудзь з'явіцца падобная праграма**? Для Еўрасаюза.

У памяці ад пастаноўкі засталася самая яркая знаходка. У адным з эцюдаў выканаўцы заслалі ўсю сцэну тонкім цэлафанам. Пагулялі з ім, як з халодным морам. Потым з дапамогай няхітрых прыстасаванняў паднялі яго вертыкальна ўгару. Самі акцёры тым часам леглі на сцэну і, перабіраючы нагамі ў паветры, ледзь дакранаючыся да цэлафану, зымітавалі бег па хвалі...

Вячэрні спектакль для дарослых «Другі пакой" пастаўлены па п'есе Збігнева Герберта. Гэтая абстрактная гісторыя, дарэчы, спецыяльна перакладзеная для гастролей і агучаная на беларускай мове, — эксперымент, у якім рэжысёр спалучыў класічны тэатр ценяў і відэапраекцыю. Апошняя ўяўляе з сябе рухомую анімацыю ці намаляваныя чорна-белыя карцінкі, на фоне якіх на экране з'яўляецца або чалавечая постаць, або прадметы, што надаюць дзеі зачаравальны эфект.

Пасля прагляду засталіся двайстыя пачуцці. Напэўна, разумны глядач шукае ў спектаклі прыхаваныя сэнсы, гісторыю (яна заўсёды знаходзіцца на першым плане). А ўжо тое, у якой форме яе падаць, — задача рэжысёра. Ці могуць падобныя работы з'явіцца ў нашых дзяржаўных тэатрах? І так, і не. Такія пастаноўкі маюць патрэбу ў падрыхтаваным гледачы. Да таго ж рэжысёр і акцёр павінны валодаць цалкам іншым мысленнем. У наш час "паказчыкаў" спектаклі авангарднага плана — костка ў горле касы. А шкада. Вось што думае з нагоды ўбачанага галоўны рэжысёр Мінскага абласнога тэатра лялек "Батлейка" Мікалай Андрэеў: "Ганаруся беларускімі лялечнікамі, якія знаходзяцца ў авангардзе тэатральнага працэсу. Дастаткова паглядзець "Тарцюфа" альбо "Ладдзю роспачы" сталічнай трупы. Калі казаць пра вячэрнюю пастаноўку польскіх калег, то яе стваральнікі не задумваюцца аб цікавасці з боку аўдыторыі. Гэта зусім іншы свет, тэатр дзеля тэатра: цікавы па форме эксперымент, які таксама мае месца быць".

Гастролі варшаўскага тэатра па Беларусі адбыліся дзякуючы Культурнай праграме Еўрасаюза. Можа быць, і ў нас калі-небудзь з'явіцца падобная праграма? Для Еўрасаюза.

Аляксандр Хумала і Вольга Падгайская выступяць сёння ў рамках Фестывалю духоўнай музыкі **"Залатагорская ліра"** ў Мінску .

"Вы не ролю сыгралі, а лёс..."

Гутарыць з гэтым чалавекам надзвычай прыемна і цікава, бо адказ на кожнае з тваіх пытанняў ператвараецца ў маленькі спектакль, у які ён міжволі альбо наўмысна ўцягвае субяседніка… Вобразы, створаныя Майстрам, увайшлі ў скарбонку беларускага сцэнічнага мастацтва. Сярод галоўных здабыткаў акцёра — феерычны Труфальдзіна са "Слугі двух гаспадароў" Карла Гальдоні, камедыйна-буфанадны з падкрэсленай лініяй характару Благае з "Доктара філасофіі" Браніслава Нушыча, сатырычна-гратэскавыя Расплюеў з "Вяселля Крачынскага" Сухава-Кабыліна, Качкароў з "Жаніцьбы" Гогаля, сацыяльна тыпізаваны Жабрак з "Сымона-музыкі" Коласа, псіхалагічна аб'ёмныя, жыццёва-пазнавальныя Шаргаёў з "Парога", Гастрыт з "Вечара", Салянік з "Радавых", Ютка з "Вежы" Дударава, трагічны Блазан з "Караля Ліра" Шэкспіра, па-дзіцячы наіўна-мудры Тарас з "Тараса на Парнасе" паводле Сяргея Кавалёва і многія іншыя… Народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, уладальнік "Крыштальнай Паўлінкі" Тадэвуш КОКШТЫС, якому 31 кастрычніка спаўняецца 80 гадоў, — увасабленне гонару і годнасці старэйшага пакалення коласаўцаў, лепшых традыцый нацыянальнага тэатра, яго вытокаў і каранёў.

Тадэвуш Кокштыс у ролі Зганарэля (спектакль "Лекар мімавольі"). / Фота з архіва тэатра

ТЭКСТ

Юрый ІВАНОЎСКІ,
тэатразнаўца, тэатральны крытык, літаратурны рэдактар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа

— Увесь мой шлях у многім парадаксальны. Гэтак адбылося і з выбарам прафесіі. У школьнай самадзейнасці мяне не вельмі задзейнічалі, бо аказаўся я не ўзорам і ў вучобе, і ў паводзінах. Але аднойчы мне вырашылі даручыць ролю Моцкіна ў школьнай пастаноўцы п'есы Андрэя Макаёнка "Выбачайце, калі ласка!". Памятаю, пасля адной фразы я пачуў рогат глядзельнай залы. Тады я зразумеў, што на мяне неяк асабліва рэагуюць. Але аб акцёрскай прафесіі ніякім чынам не задумваўся. У мяне, хутчэй, была схільнасць да малявання. Бацька ж мой — самадзейны мастак, дый наогул славіўся майстрам на ўсе рукі. Ад яго я многаму навучыўся. У школе ж мяне загрузілі афармленнем сценгазет, розных дыяграм, лозунгаў кшталту "Да здравствует…". Аднаго разу я нават намаляваў партрэт Якуба Коласа. Магчыма, менавіта таму перад самым выпускам дырэктар школы запрасіў мяне да сябе ў кабінет і паказаў аб'яву аб прыёме ў Тэатральна-мастацкі інстытут: "Паспрабуй!". Ён меў на ўвазе, вядома, мастацкі факультэт. У Мінску сакратар прыёмнай камісіі ў мяне пытаецца: "Якія работы вы прывезлі, якога фармату, у якой тэхніцы?" Я ніяк не мог уцяміць, аб чымгаворка. "А што вы скончылі?" — "Сярэднюю школу". — "Малады чалавек, сюды нават пасля мастацкіх вучылішчаў не ўсе трапляюць". Я быў у такім адчаі, што заплакаў... І тут мой анёл-ахоўнік мне шапнуў: "Паступай на акцёрскі!" І я паслухаўся, трапіўшы на курс знакамітага Дзмітрыя Арлова. А вы пытаецеся, што паўплывала…

— Але ж, мабыць, нешта было закладзена, магчыма, у падсвядомасці: каб не ляжала душа, дык наўрад ці што атрымалася б. Скажам, памятаеце, вы неяк прыгадвалі батлейку як адно з самых вялікіх уражанняў свайго дзяцінства?

— Так. На другі дзень Каляд да нас у хату завітвалі калядоўшчыкі з Казой, Мядзведзем і зоркай, што круцілася ды мільгацела рознакаляровымі агеньчыкамі... Яны славілі нованароджанага Хрыста, спявалі, потым на куце ставілі скрыню з лялькамі — і пачыналася чароўнае дзейства!.. Гэта засталося ў памяці на ўсё жыццё…

— Мне пашчасціла пабываць на вашай малой радзіме — у вёсцы Хоўхлава Маладзечанскага раёна, — бачыў і вашых бацькоў. Памятаю, тэатр у мясцовым Доме культуры прадставіў "Парог", дзе вы стварылі каларытны вобраз Шаргаёва. А як бацькі паставіліся да вашага выбару? Ці часта прыязджалі ў Віцебск на спектаклі? Як ацэньвалі іх? І ці бываеце вы на радзіме зараз?

— Бацькі паставіліся з разуменнем і павагай да майго выбару. Тым больш, бацька сам быў чалавекам з гумарам — душой любой кампаніі. Калі я ажаніўся — тут, у Віцебску, — мае родныя прыязджалі на вяселле. Дык вось, заўтра вяселле, а сёння — спектакль "Лявоніха". Іграюць Канапелька, Ільінскі, Гарбук — амаль уся трупа, я скачу па сцэне пеўнікам, прыпеўкі выконваю. Бацька спадзяваўся ўбачыць шыкоўнае відовішча, аперэтку, так бы мовіць, "Мулен-руж". А тут — Звездачотаў (мой будучы цесць, а ягоны сват) у ролі царскага салдата, з куксай замест нагі, усюды — лапці, сялянскія даматканыя світкі… Вядома, тата быў крыху расчараваны. Вось і "Парог" той жа... Нам казалі ў вёсках: "Што вы нам паказваеце? У нас і сваіх п'яніц хапае…" Усё гэта вельмі складана. Трэба быць сапраўдным тэатралам, каб зразумець некаторыя рэчы… Не стала бацькоў — няма да каго ехаць на сваю малую радзіму… І Хоўхла майго дзяцінства сышла: яна стала Хоўхлавам. Так нібыта лягчэй вымаўляць, асабліва чужым, якія забрудзілі, знішчылі самае святое. Дарэчы, менавіта пра гэта спектакль "Бездань" паводле Рэя Брэдберы, мая апошняя па часе работа.

— Прыгадайце, Тадэвуш Антонавіч, сваю першую ролю. Здаецца, у "Несцерцы" быў нейкі персанаж, якога пазней прыбралі? Яго іграліі часам не вы?..

— Ідзе эпізод з балаганам, дзе скамарохі выводзяць мядзведзя, а больш дакладна — пераапранутага Несцерку. А перад гэтым на сцэну вылятаў чорт, рабіў кульбіты, лавіў свой хвост і знікаў. Дык вось, яго, гэтага "акрабата", увасабляў я. Але калі касцюм парваўся, ролю скасавалі. Цікава, што праз дзясяткі гадоў у спектаклі Валерыя Маслюка "Кацігарошак" сыграў Бога Мілага. Вось такая амплітуда… Але гэта, хутчэй, эпізод, а першая роля са словамі атрымалася не вельмі ўдалай. У спектаклі "Пачатак жыцця" па п'есе Віннікава я выконваў маладога прайдзісвета, які ездзіць па цаліне ды чытае лекцыі-ўспаміны пра Горкага. Я, нагэўна, проста па жыцці ніякі не прайдзісвет, хоць і сыграў Расплюева. Ужо там, падаецца, такі ашуканец, махляр, але ўсё роўна — на самым донцы — я шукаў у ім "чалавечынку"…

— І мабыць, першая грунтоўная работа, пасля якой прыйшло прызнанне гледача, быў Труфальдзіна? Памятаю, спектакль доўга трымаўся ў рэпертуары…

— Ён вытрымаў каля ста паказаў. Працаваць было цяжка, бо, памятаю, я проста задыхаўся пад час рэпетыцый. Але гэта неабходная школа. Той спектакль — ужо гісторыя. Як і "Доктар філасофіі". Вядомы тэатразнаўца Барыс Бур'ян, пабачыўшы яго, напісаў: "Калі выходзяць на сцэну такія акцёры, як, скажам, Дубаў ці Кокштыс, мне прыгадваецца незабыўны Аляксандр Ільінскі..."

— Вы заспелі ў росквіце карыфеяў Коласаўскай сцэны. Якія рысы аб'ядноўвалі іх у тое непаўторнае сузор'е?

— Яны былі вельмі прыстойнымі людзьмі ў адносінах да прафесіі, вельмі адказнымі. Калі счапляліся на сходах ці рэпетыцыях, дык толькі ў барацьбе за найлепшы мастацкі вынік. Маглі асадзіць, калі нехта занадта зарываўся. Яны ж, лічыце, стварылі гэты тэатр.

— Тандэм з якім рэжысёрам вам найбольш імпанаваў?

— На маім веку змянілася дзесяткі два рэжысёраў — і галоўных, і чарговых, ад самых бездапаможных па іх магчымасцях ці досведзе да наймагутных, кшталту Эрына. У кожнага я штосьці браў, калі, здавалася, і браць няма чаго. І кожнаму я ўдзячны. Быў у нас спектакль "Шчыт і меч", пастаўлены яшчэ раней за знакаміты фільм. Мы, маладыя акцёры, выконвалі завербаваных немцамі ваеннапалонных. У перапынку паміж рэпетыцыямі ўбачылі маскоўскага рэжысёра Юрыя Шчарбакова (раней ён працаваў у нас галоўным). Было цікавае ягонае меркаванне. І ён нам раптам адказвае: "Маладыя людзі, у эпізодзе патрэбна ср***й цвікі выдзіраць". Чым вышэйшы па ўзроўні арганізатар творчага працэсу, тым больш карысна акцёру: бо як ты ні вылузвайся са скуры, "на тэатры" ён галоўны. І трэба разам прыходзіць да згоды, не канфліктаваць, а супольна шукаць ісціну .

— Ці з'яўляецеся вы настаўнікам для маладых акцёраў? І, у звязку з гэтым, яшчэ такое пытанне: як лічыце, ці існуе, ці захавалася сёння Коласаўская акцёрская школа з яе цудоўнымі традыцыямі, пераемнасцю пакаленняў, пэўным спосабам акцёрскага існавання? Ці, можа, гэта ўсё у мінулым?..

— Я неяк зрабіў аднаму маладому артысту (ён ужо не працуе ў тэатры) заўвагу: "Нельга ж ставіць націск на кожным слове: губляецца сэнс". А ў адказ чую: "Тадэвуш Антонавіч, вам што, заняцца няма чым?" З таго часу я да маладых з парадамі не звяртаюся. А мы ж некалі стаялі за кулісамі і глядзелі, як працуе цудоўны Аляксандр Ільінскі. Зараз такога няма. Праўда, некаторыя маладыя могуць сказаць: "Дык сёння ж і Ільінскага няма"...

— Якая з роляў, сыграных вамі на Коласаўскай сцэне (а была ж яшчэ і плённая праца ў кіно, на тэлебачанні) для вас асабліва дарагая, упадабаная?

— На гэтае пытанне я адказваю так: найдаражэйшая тая, якая цяжка нараджаецца. Памятаю, прапанаваў мне некалі Валерый Мазынскі ролю Мячоткіна з вампілаўскага "Лета ў Чулімску". Думаю: ну што гэта за роля? Нейкі бухгалтар з глыбінкі. Прыходзіць штодня ў сталоўку, закажа гарбаты — і пайшоў. Яго не заўважаюць. А ён… кахае! Быў я на сцэне ніякім, пакуль не "падклаў" сваё. І тады зрабіўся жывым, бачным, адчувальным для гледача. А вынік стаўся зусім нечаканым. Рэжысёр, памятаю, на праграмцы напісаў: "Усё адбываецца з Вамі, а не з нейкім Мячоткіным. Вы не ролю сыгралі, а чалавечы лёс". Тое ж самае было і з Жабраком у "Сымоне-музыку". Аднойчы на рэпетыцыі мяне "панесла": перад Сымонам я разыграў цэлы спектакль. Так ачмурыў хлапчука, што ён быў гатовы пайсці са мной "у свет". Мазынскі з залы заўважыў: "Кокштыса сёння трамвай пераехаў". Прафесар Тацяна Арлова назвала майго Жабрака вясковым Мефістофелем. Такія кампліменты дарагога каштуюць…

— Чым вы парадуеце гледача ў свой юбілейны вечар?

- Спектаклем "Бездань" па творах Рэя Брэдберы, дзе я выконваю ролю Старога. Яна як ніякая іншая — пра сябе. Я хачу гаварыць з гледачом пра дарагія мне ўспаміны, пра тое, што страчана, пра Духоўнасць. Я, стары, хачу, каб людзі задумаліся, куды мы ідзём, што робім і як жывём...

ф о т а ф а к т

Сімфонія Дрысвятаў

Сімфонія культавага дойлідства на Браслаўшчыне вымяраецца паўтысячагоддзем. Менавіта такую дату адзначыў адзін з найстаражытных мясцовых храмаў — касцёл Святых Апосталаў Пятра і Паўла ў Дрысвятах (на асноўным фота). Праўда, першы каталіцкі храм насіў імя Найсвяцейшай Панны Марыі. Менавіта ён быў пабудаваны ў 1514 годзе Мікалаем Радзівілам і знаходзіўся на замкавым востраве, што на возеры Дрысвяты, да XVIII стагоддзя. Пра яшчэ ранейшую хрысціянізацыю дрысвяцкага замка сведчаць знойдзеныя бронзавыя нацельныя крыжыкі і тры крыжы-энкалпіёны XI — XIII стагоддзяў агульнахрысціянскага перыяду кіеўскага тыпу (на здымку ўнізе). Яны лічацца культавымі творамі сярэднявечнага мастацтва, як і вядомы дрысвяцкі касцельны абраз "Пакланенне вешчуноў" (пачатак XVI стагоддзя), што спалучае рысы нямецкага рэнесанснага жывапісу і беларускага іканапісу.

У XVII ст. мясцовае насельніцтва пачало сяліцца на беразе возера Дрысвяты, тады ж і ўзвялі новы будынак касцёла ў гонар Святых Апосталаў Пятра і Паўла. У той час парафія налічвала больш за 5 000 вернікаў (у 2014-м іх — каля 600). Стары храм праіснаваў на востраве да XIX стагоддзя. У гады Першай сусветнай касцёл быў знішчаны дашчэнту. Цяперашні будынак спраектаваў і ўзвёў у 1929-м вядомы архітэктар, будаўнік і паэт Лявон Вітан-Дубейкаўскі.

У савецкія часы касцёл выкарыстоўваўся пад склад, а алтар і касцельную дакументацыю знішчылі. У 1990-я ён быў вернуты вернікам. Цяпер дрысвяцкі касцёл — помнік архітэктуры з Дзяржспіса гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Ірына САКАЛОЎСКАЯ, навуковы супрацоўнік па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў / Фота аўтара

Юозас Будрайціс 29 кастрычніка прадставіць уласную фотавыстаўку ў гродзенскім кінатэатры "Чырвоная зорка".

Паступова знікае або...

Мультыкультуралізм, "клікі" і спонсары народнага

Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы зладзіў чарговы, трэці па ліку, Міжнародны форум "Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства". Пад час мерапрыемстваў "К" звярталася да гасцей з просьбай распавесці пра асноўныя праблемы, якія іх хвалююць, а таксама, натуральна, абазначыць шляхі развіцця традыцыйнай культуры... Сённяшняя публікацыя змяшчае адказы замежных спецыялістаў. У наступных нумарах будуць апублікаваны развагі айчынных знаўцаў народнай культуры, а таксама інтэрв'ю з прэзідэнтам Асацыяцыі міжнародных фальклорных груп Дорэлам Космам...

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ
Мінск — Магілёў — Мінск

Саўліус ЛІАЎСА, дырэктар Цэнтра народнай культуры Літвы (Вільнюс):

— Як вядома, у некаторых краінах няма міністэрстваў культуры, але гэта не азначае, што там няма культуры: яна ўсюды выступае як стратэгічны рэсурс развіцця грамадства. У тым ліку і народная культура. І калі ў палітычных ці эканамічных стасунках розныя краіны ідуць больш-менш падобнымі шляхамі, дык у культурнай сферы мы абменьваемся досведам, каб зразумець, наколькі мы розныя.

Сёння ва ўсім свеце на змену глабалізму прыходзіць іншая парадыгма: кожны народ шукае свае карані, своеасаблівасць... А гэтая непаўторнасць заключаецца менавіта ў нацыянальнай, традыцыйнай культуры. І ў гэтым, я думаю, таксама і новыя перспектывы, новае жыццё для аўтэнтыкі...

Адна з праблем, што паўстаюць перад традыцыйнай культурай, — выклікі XXI стагоддзя. Сёння мы жывём у прасторы, што кардынальна адрозніваецца ад той, у якой раней існавалі абрады і традыцыі. Напрыклад, стагоддзе таму чалавек нараджаўся ў сваім доме, у знаёмым асяроддзі, яго акалялі тыя рэчы, што мелі даўнюю гісторыю і, магчыма, перадаваліся з пакалення ў пакаленне... Цяпер наваколле для нас — тэлевізар ці Інтэрнэт, прадукты мы купляем у бліжэйшай краме, а людзі нараджаюцца ў радзільнях ды жывуць у шматкватэрных дамах, не ведаючы нават суседзяў... Сённяшняе пакаленне — гэта, як кажуць навукоўцы, пакаленне "кліка", калі адным рухам пальца можна атрымаць шмат інфармацыі... Таму сучаснаму чалавеку не хапае часу, каб паназіраць за з'явамі прыроды, каб дасягаць нечага розумам, абагульняць і рабіць высновы... Гэта зусім іншае пакаленне, чым тое, якое жыло ды развівалася ў рамках традыцыйнай культуры. І я думаю, што наша задача — знайсці адказ на пытанне, як і якім чынам народная культура, аўтэнтыка могуць жыць, існаваць у час інфармацыйных тэхналогій...

Соф'я ФЕДАСЕЕВА, дырэктар Абласнога каардынацыйна-метадычнага цэнтра культуры і творчасці Іванаўскай вобласці Расіі:

— Падобныя форумы даюць магчымасць выказацца, знайсці аднадумцаў, а калі гэта ёсць, дык ёсць і магчымасць для развіцця...

Арганізацыя, якую я ўзначальваю, займаецца многімі кірункамі працы, у тым ліку — і кіно. Напрыклад, мы ладзім у Іванаве кінафестываль "Дзеці і казка. Памяці Аляксандра Роу" (знакаміты савецкі кінарэжысёр родам з Юр'еўца былой Кастрамской губерні, а цяпер — Іванаўскай вобласці). Сёлета кінафестываль ладзіўся дзясяты раз і быў прысвечаны 105-й гадавіне з дня нараджэння кінаказачніка... Мы выдалі кнігу-альбом аб Роу, і гэта адзінае падобнае выданне ў Расіі, прысвечанае класіку кінематографа...

Дарэчы, грошы пад гэтыя ды іншыя выданні мы знаходзім у спонсараў і мецэнатаў, бо, як вядома, дзяржаўнае фінансаванне не такое ўжо і вялікае, і гэта, вядома ж, вялікая праблема. Вырашаем яе так: завітваем у розныя арганізацыі ды ўстановы, тлумачым, што будзе апублікавана, які змест будучай кнігі... І падобная практыка прыносіць свой плён. Напрыклад, пры дапамозе Фонду імя Барыса Ельцына, з якім супрацоўнічаем не першы год, выдалі кнігі Марыны Цвятаевай, чые родзічы паходзяць менавіта з нашага рэгіёна...

Таксама ладзім фестывалі, напрыклад, "Ціхвінскі кірмаш" — рэгіянальны форум, на які запрашаем сотні ўдзельнікаў не толькі з Іванаўшчыны, а і з усіх суседніх абласцей. А не так даўно аднавілі старадаўні рускі промысел — мазыкскую цацку. Гэтая цацка рабілася з дапамогай сякеры. Вырабы часцей за ўсё ішлі не на продаж, а прызначаліся для асабістага спажывання. У асноўным гэтыя цацкі ўяўлялі з сябе статуэткі звяроў і людзей, якія выконвалі ролю язычніцкіх бажкоў — заступнікаў хатняга ачага, ідалаў, абярэгаў... Так што, як бачыце, працы ў нас шмат, і яна вельмі цікавая...

Арусяк СААКЯН, спецыяліст Інстытута археалогіі і этнаграфіі Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Арменія, кандыдат філалагічных навук (Ерэван):

— Мы дасюль у Арменіі збіраем фальклор, запісваем яго, выдаём для нашчадкаў... Ды, увогуле, я лічу, што сапраўдны фалькларыст — гэта той, хто запісвае паданні, легенды, казкі менавіта ад носьбітаў аўтэнтыкі, а не сядзіць у сваім пыльным кабінеце... Бо наша навука як ніякая іншая пачынаецца і заканчваецца гутаркамі, стасункамі з народамі, з тымі лепшымі яе прадстаўнікамі, якія захоўваюць традыцыі сваіх продкаў. А кожны спявак, апавядальнік — ён, як я мяркую, па-за часам, па-за гэтым светам...

На жаль, усё гэта страчваецца, асабліва калі мець на ўвазе цяперашнюю камерцыялізацыю песеннага жанру. А народны пясняр спяваў для ўсіх і без разліку на грошы... На шчасце, усё яшчэ можна спадзявацца на тое, што народныя традыцыі не знікнуць, што яны будуць жыць ды развівацца... Бо, як вядома, без мінулага няма і будучага...

Абульфаз БАБАЗАДЭ, вучоны сакратар Навукова-метадычнага цэнтра па культуразнаўстве Міністэрства культуры і турызму Рэспублікі Азербайджан, культуролаг (Баку):

— Асноўная мэта майго візіту — абмеркаваць праблемы, якія ўзнікаюць сёння ў развіцці народнай культуры. Не сакрэт, што апошняя ў развітых краінах паступова знікае. І гэта непакоіць, бо народная культура і фальклор — частка агульнаеўрапейскай, агульнасусветнай культуры, якая нараджалася, так бы мовіць, прыродным шляхам... Можна сказаць, што традыцыйная культура — тая выспачка, тая кропка, з якой усё пачыналася. Да таго ж, яна была заснавана, кажучы сённяшняй мовай, на палітыцы мультыкультуралізму, калі народы, плямёны, нацыі жылі ў міры і згодзе...

Гэтая тэма значная для Азербайджана. Бо наша краіна за апошнія гады зрабілася вядомай дзякуючы правядзенню палітыкі мультыкультуралізму. За мяжой сёння цікавяцца нашым досведам у гэтай сферы. Балазе Азербайджан, — як, напрыклад, і Расія, і Беларусь, — краіна шматнацыянальная ды шматканфесійная. Таму нам цікава падзяліцца досведам, здабыткамі з Беларуссю. І, зразумела, мы хочам скарыстацца беларускім досведам, бо, напрыклад, для мяне беларусы — самы талерантны народ, які жыве ў гэтым рэгіёне Еўропы. А ўсё таму, што тут не падзяляюць людзей па этнічных ці канфесійных прыкметах... На жаль, сёння можна сцвярджаць, што ў многіх краінах палітыка мультыкультуралізму фактычна праваліласся...

А яшчэ хачу згадаць вось пра што. Не так даўно ў Азербайджане пачала дзейнічаць Дзяржаўная праграма, паводле якой раз на год у адным з раённых цэнтраў якога-небудзь рэгіёна нашай краіны аб'яўляецца фальклорная сталіца. Цягам усяго года туды, у райцэнтр, прыязджаюць навукоўцы, там выдаюцца фальклорныя рэгіянальныя зборнікі з тэкстамі песень, абрадаў, расповедамі носьбітаў традыцый, ладзяцца культурныя акцыі, якія прапагандуюць аўтэнтыку... Усё гэта спрыяе захаванню і папулярызацыі мясцовых традыцый, фальклору, спрыяе павышэнню турыстычнай цікавасці розных рэгіёнаў нашай краіны... Чаму б гэты досвед не пераняць і Беларусі?..

Мэры РУСАНАВА, намеснік дырэктара Дзяржаўнага Расійскага Дома творчасці (Масква):

— Мы ўжо доўгі час супрацоўнічаем з Магілёўскім абласным метадычным цэнтрам. Але я на гэтым прадстаўнічым форуме — упершыню. І мне вельмі радасна, што мы абмяркоўваем шырокае кола пытанняў, узнімаем шэраг праблем, якія паўстаюць перад традыцыйнай культурай, знаходзім шляхі выйсця з праблемных сітуацый.

Адна з такіх праблем — міжэтнічныя стасункі. Як вы, магчыма, ведаеце, не так даўно ўсе функцыі Міністэрства рэгіянальнага развіцця былі перададзены Міністэрству культуры Расіі. У сувязі з гэтым роля культуры — і ў тым ліку дамоў і цэнтраў народнай творчасці — у вырашэнні міжнацыянальных, міжэтнічных пытанняў яшчэ больш узрасла... На маю думку, менавіта культура — гэта тое, што можа аб'ядноўваць нацыі ды народнасці. У якасці доказу дадзенага тэзіса магу сказаць, што, напрыклад, многія дамы дружбы ці цэнтры нацыянальных культур, створаныя ў розных краінах свету, працуюць, у асноўным, у сферы культуры.

І яшчэ. Сёння ў нашых краінах імкліва развіваецца турызм. І ад нас патрабуюць прэзентаваць турыстам традыцыйную культуру, паказваць рамёствы, абрады, прычым на той тэрыторыі, дзе заўсёды, спрадвеку бытавалі народныя звычаі, — у так званым этнаграфічным асяроддзі... У сувязі з гэтым многія навукоўцы ды фалькларысты задаюць нам адно і тое ж пытанне: ці не страцім мы такім чынам аўтэнтычную народную культуру? Ці не будзем мы замест яе дэманстраваць замежным і айчынным турыстам нейкі сурагат, заснаваны на відовішчнасці ды маляўнічасці? Гэта, мяркую, тая праблема, якую нам усім трэба абмеркаваць пад час пасяджэнняў форуму...

Нікаля ЧАРЛЕЦІ, прэзідэнт Асацыяцыі фальклорных груп Францыі, віцэ-прэзідэнт Асацыяцыі міжнародных фальклорных груп (Парыж):

— На жаль, у Францыі мала ведаюць пра Беларусь. Напрыклад, я ўпершыню знаходжуся ў вашай краіне, і ведаю пра яе толькі тое, што калісьці менавіта тут праз Беразіну няўдала перапраўлялася армія Напалеона Банапарта. А з больш сучасных згадак успамінаю толькі вашу хакейную сборную... Таму, як я лічу, прыняцце Беларусі ў Асацыяцыю міжнародных фальклорных груп паспрыяе большай вядомасці вашай краіны ў свеце... Прынамсі, у фальклорным свеце — дык дакладна.

У адрозненне ад некаторых калег, я не лічу, што традыцыйная культура не можа існаваць у сучасным, інфармацыйным грамадстве... Я думаю, што яна можа жыць і ў XXI стагоддзі, — калі, вядома ж, мы будзем імкнуцца яе прапагандаваць ды захоўваць для будучых пакаленняў.

Наколькі я змог убачыць, беларускі фальклор, вашы народныя абрады, танцы, спевы — усё гэта вельмі цікава, у іх шмат непаўторнага ды арыгінальнага. Таму, думаю, усю беларускую традыцыйную культуру варта не толькі захоўваць, але і прапагандаваць, у тым ліку — з дапамогай нашай міжнароднай арганізацыі... Абавязкова будзем запрашаць вашы аўтэнтычныя калектывы да нас у Еўропу і дэманстраваць усё хараство і самабытнасць народнай культуры Беларусі!..

Фота Сяргея ТРАФІЛАВА

К

Музыканты з сямі краін бяруць удзел у XIX Міжнародным фэсце арганнай музыкі **"Званы Сафіі"**, які працягнецца да 23 лістапада.

Маладзёжны беларуска-расійскі сімфанічны аркестр на пачатку лістапада дасць канцэрты ў Казані, Маскве, Мінску і Магілёве.

Фотапраекцыя

Брокалі — гэта важна

(Не)абавязковасць канцэптуальнасці

У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва — выстаўкі беларускіх фатографаў, у Галерэі сучаснага мастацтва "Ў" — выстаўка латвійскай фатаграфіі, у Цэнтры сучасных мастацтваў — творы класіка нямецкай фатаграфіі Арно Фішэра, у прасторы "ЦЭХ" — маладыя расіяне з "Несвоечасовым", якіх змяніла дэманстрацыя фатаграфічна-археалагічнай экспедыцыі па беларуска-польскім памежжы... Так выглядае падзейная праграма Месяца фатаграфіі ў Мінску. І наперадзе — амаль трэць мерапрыемстваў.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Марцін Пар. З серыі "Маленькі свет".

Алніс Стакле. З серыі "Not Even Something".


Андрэй Шчукін. З серыі "Сем цудаў святла".

Пра тое, як прадстаўлена беларуская маладая фатаграфія, **чытайце ў наступных нумарах "К".**

На час форуму горад ператвараецца ў сапраўдны культурны цэнтр, але як "ахапіць неабсяжнае"? Паспрабую падзяліцца развагамі "з нагоды...", што выспелі ўжо цяпер.

Адкрыццё

Ганаровым госцем цырымоніі адкрыцця, якая адбылася праз тыдзень ад фактычнага пачатку форуму, стаў сусветна вядомы брытанскі фатограф, калекцыянер кніг Марцін Пар — асоба, якую ведае бадай кожны, скажам так, дасведчаны ў гісторыі фатаграфіі аўтар. Госць выступіў з лекцыяй, распавёўшы пра сваю кар'еру, і тым даў выдатны ўзор, як можна шукаць уласную тэму, стыль, не баяцца быць адметным у фатаграфіі. Сам Пар пачынаў кар'еру з усведамлення таго, што яму насамрэч цікава: "Я стаў даследаваць надзвычай нудотныя месцы (да прыкладу, запраўкі) і думаў пра тое, як можна сфатаграфаваць іх цікава". Або іншы падыход: "Фатографы любяць здымаць, калі надвор'е добрае, а я вырашыў, што буду арыгінальным, калі стану рабіць тое, бо наўкол мокра і непрыемна". Так з'явілася серыя "Дрэннае надвор'е", якая дазволіла паглядзець на вядомы брытанскі "брэнд" інакш.

Яшчэ фрагмент з аповеду Пара: "Наступная тэма, што зацікавіла, — фатаграфаванне супермаркетаў. Фатографаў у 1980-я прыцягвалі экзатычныя аб'екты — я ж хацеў звярнуць увагу на паўсядзённасць. На гэтым здымку, — распавядае Марцін, паказваючы кадр, — прадаўшчыца трымае ў руках суквецце брокалі. Я рады, што захаваў на памяць гэтую сітуацыю. (Вакол прадаўшчыцы на здымку назіраецца ажыятаж. — **Д.А.**) У тыя часы брокалі была хітом. Вось вам сіла дакументальнай фатаграфіі..."

Нізкакласныя курорты, шопінг, самая пачварная брытанская ежа, будні турыстычных мясцін, клішэ, вольны час мільянераў... — Пар, вывучаючы людскія слабасці праз паўсядзённыя практыкі, выяўляе і безабароннасць людзей. Не пазбегну клішэ: фатограф чымсьці нагадвае славутага "майстра парадоксаў" Аскара Уайльда. Але, у адрозненне ад апошняга, які атачаў сябе прыгожым, Пар, умоўна кажучы, атачае сябе *жывым*. Фатограф фіксуе, здаецца, "глупства", але ў выніку — апошняе мае дзіўную здольнасць рабіць людзей такімі кранальна чалавечнымі...

Майстра іранічнага фота, вядома, папрасілі даць параду маладым аўтарам. "Вучыце англійскую мову і спрабуйце свае сілы за мяжой, шукаючы дзейныя рынкі фатаграфіі, — такім быў адказ. — Цяпер у Еўропе назіраецца вялікая цікавасць да фатографаў з малавядомых краін. Знайдзіце сваю публіку, якая здолее вас ацаніць за мяжой".

Нягледзячы на пэўную недасказанасць (Пар, у пэўным сэнсе, дэманстраваў брытанскую стрыманасць), прамова майстра, яго адказы на пытанні публікі — усё злучылася ў надзвычай натхняльныя ўражанні. Варта дадаць сюды і асаблівую атмасферу адкрыцця, што, падкрэслю, адбылося не ў вядомай галерэі ці музеі, а ў колішнім прамысловым памяшканні, на сценах якога трансляваліся праекцыі фатаграфій, — лофт-прастора ля аднаго са сталічных бараў.

Новыя кантэксты

На першы погляд, Месяц фатаграфіі — гэта вялікая колькасць выставак. Але, насамрэч, перад намі — магчымасць стварэння пэўных кантэкстаў ды правядзення паралелей.

Напрыклад, адна з першых выставак форуму — "Сем", зладжаная БГА "Фотамастацтва", — набыла новае гучанне, калі ў галерэі "Ў" адкрыўся паказ "Sence of Place. Сучасная латвійская фатаграфія" Арніса Балкуса, Рэйніса Хофманіса, Алніса Стакле. Беларускі праект, канцэпцыя якога палягала ў своеасаблівай гульні (сем аўтараў прадставілі па сем работ у серыях на "тэму" "магічнай лічбы"), раптам пачаў нейкім чынам перагукацца са здымкамі латвійцаў. Хоць спачатку, прызнаюся, для мяне яна выглядала цалкам арганічнай і ў такой "неабавязковай" канцэптуальнай рамцы.

Суседства ж латвійскай фатаграфіі падкрэсліла пэўную наіўнасць падобнай падачы аўтарскіх серый. У прыватнасці, творцы з суседняй краіны, працуючы з такім улюбёным жанрам піктарыялістаў, як пейзаж, надалі яму цалкам актуальнае сацыяльнае гучанне. Да прыкладу, серыі Рэйніса Хофманіса "Sale/Privat" — гэта фатаграфіі маляўнічых зімніх ландшафтаў, якія могуць быць зроблены, здаецца, дзе заўгодна. Але ж адна дэталь у гэтых, лічы, піктарыяльных выявах "муляе вока": шыльда з надпісам "Прадаецца". І адразу зімовая цішыня атрымлівае кантэкст. Чароўны "пейзаж" камусьці належыў, і гэты хтосьці ў Латвіі быў вымушаны прадаць сваю маёмасць. І такіх шыльд мноства... Сузіранне абарочваецца канстатацыяй сацыяльных праблем. Прытым што фатаграфія як медыя не страчвае сваёй унікальнасці: фатографы паважліва ставяцца да яе здольнасцей і генія.

На жаль, падобнай актуалізацыі беларускім фатографам не ўдаецца дасягнуць. Прытым што на выстаўцы "Сем" той жа Сяргей Ждановіч, Сяргей Міхаленка, Ігар Саўчанка працуюць з ландшафтам (гаворка — не толькі пра сельскі ландшафт, але і пра гарадскі), тым не менш, іхнія выказванні застаюцца ў межах уласна "мастацкага" выказвання.

Медыум: зручны ці прынцыповы

Другі бок медаля, калі фатаграфія скарыстоўваецца як зручны (у дадзены момант) медыум, прадэманстравала выстаўка маладой расійскай фатаграфіі "Несвоечасовае" буйной інстытуцыі "Фота-Дэпартамент". Трынаццаць маладых аўтараў у ёй прапанавалі гледачу ўласныя разважанні наконт рускай душы. "Выстаўка — гэта спроба вызначыць агульнае поле, якое больш чым ідэалогія, што прапануецца кожнаму пакаленню. Гэта спроба вызначыць мару пра краіну, якую кожны носіць унутры сябе", — так кажа аб праекце яго куратар Надзея Шараметава.

Група вывучала сацыялагічныя даследаванні, вяла назіранні, ішла "ў народ". Фатаграфія тут выкарыстоўваецца таксама як інструмент спасціжэння рэчаіснасці, але ўжо не прынцыповы, а, хутчэй, больш зручны. Нягледзячы на тое, што ў анатацыі падкрэсліваецца большая здольнасць фота "выявіць супярэчнасць ды адзінства сучаснага грамадства", чым "няўзброенае вока і мова", пэўная захопленасць менавіта ідэяй, а не якасцю ўвасаблення апошняй, мела месца. У такім выпадку фатаграфія ўжо выглядае "сродкам дакументавання", "фіксацыі", што цалкам нармальна пры пастаўленых задачах, але патрабуе пэўнай пазнакі. На прыкладзе "Несвоечасовага" мы ўжо бачым выстаўку contemporary art, актуальнага мастацтва, дзе, уласна, геній фатаграфіі, на жаль, не істотны, — важная яе здольнасць праілюстраваць ідэю.

"Несвоечасовае" пры гэтым атрымалася цікавым праектам, поўным нечаканых ды свежых думак. Гэта маладая фатаграфія, калі можна так сказаць, і тое адчуваецца на нават на энергетычным узроўні. Трапнымі падаліся работы Кацярыны Юшкевіч "Шэсць літар. Першая — Л", Наталлі Балута "Паміж", Марыі Сакіра "Размова па душах", моцнай і самадастатковай — серыя Наталлі Падуновай "Хрыбет", сімвалічнай — Яўгена Маладцова "Храм-200"...

Праект прадэманстраваў іншы падыход да фатаграфіі, даўшы магчымасць заўважыць інертнасць беларускіх аўтараў да новага выкарыстання медыя, але і іхні піетэт да мовы фота, які, як аказалася, уласцівы нават маладой айчыннай фатаграфіі...

К

Падмурак, на якім можна будаваць

Маючы пэўнае ўяўленне пра тое, як робіцца кіно, я, здаецца, ніколі сур'ёзна не задумваўся пра ролю мастака ў гэтым працэсе. Праўда, пра некаторых мастакоў кіно я чуў і нават знаёмы з іх творчасцю, дакладней — з "пазакіношным" яе сегментам. Сярод беларусаў я найперш згадаў бы Міхаіла Карпука і Вячаслава Кубарава.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Наталля Галавашчанка. Макет дэкарацыі да п'есы Уільяма Шэкспіра "Гамлет".


Юлія Купа. Макет дэкарацыі да п'есы Міколы Гусоўскага "Песня пра зубра".

Зыходзячы з вышэйсказанага, адзначу, што выстаўка "Alma mater & cinema" дыпломных работ сёлетніх выпускнікоў кафедры жывапісу — курса "Выяўленчае рашэнне фільма" — нашай Акадэміі мастацтваў была для мяне ў пэўным сэнсе адкрыццём, экскурсіяй на творчую "кухню".

Удзельнікі — пяцёра нядаўніх студэнтаў курса прафесара Дзмітрыя Мохава.

Сам Мохаў ацэньвае творчы патэнцыял маладых калег даволі высока і спадзяецца, што іх талент ды веды будуць запатрабаваны на радзіме. У размове з карэспандэнтам "К" Дзмітрый Максімавіч выказаў занепакоенасць той акалічнасцю, што ў коле мастакоў айчыннага кіно ёсць прыкметы кадравай нястачы. Старэйшае пакаленне пступова адыходзіць, сярэдняе шукае долі там, дзе лепш плацяць (чытай: за мяжой), а моладзь яшчэ недастаткова дасведчаная, каб весці рэй. Рэжысёру, на думку прафесара, адшукаць свайго мастака, а мастаку — свайго рэжысёра надзвычай цяжка. Да таго ж, Інтэрнэт з яго інфармацыйным патэнцыялам стварае ў некаторых кінематаграфістаў ілюзію: усё, што патрэбна для пабудовы візуальнага шэрагу — касцюмы, дэкарацыі, — можна папросту спампаваць, і мастак, дасведчаны, сярод іншага, і ў гісторыі матэрыяльнай культуры, пры стварэнні стужкі не надта і патрэбны. Гэтая тэза зыходна памылковая. Да таго ж першасныя ў мастацкім рашэнні фільма — колер і святло. Яны маюць сваю драматургію, імі карыстаецца мастак для пабудовы вобраза (што на палатне, што на экране).

Аднак, на думку Дзмітрыя Мохава, наяўнасць пэўных праблем у творчым працэсе — справа звычайная, галоўнае, што традыцыя не страчана, школа не згублена.

Сведчаннем аптымістычнага сцэнарыя развіцця нацыянальнага кінематографа, мяркую, — і гэтая выстаўка. Адчуваецца, што маладыя мастакі — людзі шырокаадукаваныя: ведаюць, у прыватнасці, не толькі выяўленчае мастацтва, але ж знаёмы і з сусветнай літаратурай. Наталля Галавашчанка і Міхаіл Мішук у сваіх дыпломных работах звярнуліся да шэкспіраўскага "Гамлета", Юлія Купа — да "Песні пра зубра" Міколы Гусоўскага, Настасся Чахоўская натхнілася творамі беларускіх аўтараў пад умоўнай назвай "Доўгая дарога дадому", Ганна Шматок — вершам Барыса Пастарнака "Калядная зорка"...

Ведаючы змест і характар літаратурных крыніц, абраных для перакладу на экранную мову, можна лічыць, што мастакі здолелі і дух арыгінала захаваць, і сваё бачанне выказаць. У макетах дэкарацый адчуваецца ўпэўненая рука канструктара, а вось адухоўленасць ім надаюць святло і колер. Тое ж можна сказаць і пра эскізы касцюмаў ды сцэн. Мастакі імкнуліся максімальна скарыстаць выяўленчы патэнцыял натурных аб'ектаў: звычайнага мікраараёна, Мірскага замка, Белавежскай пушчы, чыгуначнага дэпо і гранітнага кар'ера ў Мікашэвічах.

Зразумела, што на суд грамады прадстаўлены не завершаныя творы, а эскізы, якія маюць напаўняцца зместам у працэсе стварэння фільмаў. Але відавочна, што гэта падмурак, на якім можна будаваць.

К

фотафакт

"Драма неверагодная"

З Міжнароднага фестывалю "Лялька таксама чалавек", які праходзіў у Варшаве з 10 па 17 кастрычніка, Магілёўскі тэатр лялек прывёз тры падзячныя лісты і дыплом. На сцэне Тэатральнага Інстытута імя Збігнева Рашэўскага трупа прадставіла пастаноўку "Драма неверагодная". У спектаклі незвычайным чынам распавядаецца пра каханне беднага рыцара і багатай спадчынніцы. Дзея разгортваецца на фоне сярэднявечных пейзажаў і дзейнасці бязлітаснага Камуністычнага Інтэрнацыянала. Пастаноўшчык — польскі рэжысёр Марэк Хадачыньскі. Арганізатары фэсту адзначылі ўзровень артыстаў, дэкарацый, складанасць матэрыялу і вакальныя партыі. І сапраўды, на рэпетыцыях шмат часу ішло на прапрацоўку вакалу: спяваць у спектаклі артыстам даводзіцца ўжывую.

Аляксандр БУРАКОЎ, кіраўнік літаратурна-драматычнай часткі Магілёўскага абласнога тэатра лялек

Постскрыптум мэйнстрыму

Апошняя гастроль "Zabora"

Калі ў 2012-м на агароджы сталічнага парку Чалюскінцаў вывесілі вялікія рэпрадукцыі твораў чатырох сучасных беларускіх мастакоў, назваўшы імпрэзу "Арт-праект "Zabor", мала хто ўяўляў, што праект будзе доўжыцца два гады, праедзе па ўсёй краіне, завітае ў Варшаву ды завершыцца ў сценах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі — дэманстрацыяй ужо не рэпрадукцый, а арыгіналаў. У першым складзе "Zabora" ўдзельнічала трое мінскіх творцаў і адзін — з Гомельшчыны, але ў час вандроўкі па Беларусі да праекта далучаліся мастакі з рэгіёнаў.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Руслан Вашкевіч. "Не глядзячы ні на што".


Аляксандр Сушкоў. "Другі пласт".

Уладзіслаў Куфко. "Плот".

Сяргей Каваль. "Сінагога на Даўмана".

Удзел у выстаўцы, што ладзіцца ў Нацыянальным мастацкім музеі, — гонар для кожнага творцы. Гэта афіцыйнае прызнанне значнасці ягонай творчасці для краіны. Калі музей пускае ў свае сцены "авангард", значыць, той ужо стаў "класік-авангардам", мае сваю "законную" нішу ў культурнай прасторы і, так бы мовіць, пранумараваную шуфляду ў архіве. На думку арганізатараў выстаўкі ў Нацыянальным мастацкім, тут цягам месяца былі прадстаўлены асноўныя стылі сучаснага беларускага выяўленчага мастацтва: беспрадметны жывапіс, канцэптуальнае мастацтва, інсіт, сюррэалізм, пэўныя плыні абстракцыянізму. Мабыць, сапраўды існуе патрэба для зручнасці гледачоў неяк абазначыць тое, чым займаецца той або іншы мастак, даць творчасці — з'яве невытлумачальнай, непадуладнай законам логікі — нейкую назву, зразумелую аматарам мастацтва. Але мне падаецца, што тэрміналогія з заходнееўрапейскага слоўніка не надта падыходзіць для тлумачэння нашай уласнай культурнай рэчаіснасці (хоць я і не збіраюся адлучаць Беларусь ад Еўропы альбо ставіць пад сумнеў удзел нашай краіны ў сусветным культурным працэсе). Тут, як і ў літаратурным перакладзе, патрэбна сэнсавая адаптацыя. Той жа сюррэалізм на беларускай глебе мае няшмат агульнага з класічнымі творамі Далі, Магрыта альбо Эрнста. І абстракцыянізм наш — гэта не Кандзінскі ці Полак. Тое ж датычыцца і іншых згаданых вышэй стыляў.

Мастакі, якія ўдзельнічалі ў выстаўцы, патрэбы ў рэкламе не маюць. Работы кожнага з іх прадстаўлены ў сур'ёзных музейных і прыватных зборах, творчасць пранaлізавана ў шматлікіх мастацтвазнаўчых артыкулах. У актыве кожнага — мноства выставак за межамі Беларусі.

Гэта знак часу, што можна жыць, як, скажам, Сяргей Каваль у вёсцы Якімава Слабада, што на Гомельшчыне, дэкларaваць сваё непрыманне горада як з'явы, а пры гэтым выстаўляцца хоць у Парыжы. Можна свядома абыходзіцца без смартфона і камп'ютара, як брэстчанін Уладзіслаў Куфко, настальгіраваць па гармоніі, страчанай намі праз некіруемы прагрэс, а пры гэтым творча быць у "трэндзе" і "мэйнстрыме" сучаснасці. Альбо, як гродзенец Юрый Якавенка, захапляцца Хічкокам і Далі — і, натхніўшыся іх творчасцю, памайстэрску праілюстраваць Міколу Гусоўскага ды Уладзіміра Караткевіча. Так жа сама, як магілёўскі мастак Юрый Несцярук, шакаваць суайчыннікаў "перакладам" на сучасную выяўленчую мову правакацыйнай для свайго часу карціны Курбэ, і такім чынам адкрываць гледачам малавядомыя ім старонкі сусветнай класікі.

Мастыхін

І ўся гэтая экзотыка будзе не чым іншым, як спецыфічнымі праявамі нашага культурнага працэсу, адбіткам нашай рэчаіснасці, якая характарызуецца адсутнасцю інтэгруючай ідэі, кшталту той, што была ў часы сацрэалізму, і панаваннем творчага суб'ектывізму. Яшчэ варта адзначыць, што ўсе ўдзельнікі праекта (у адрозненне ад піянераў сацарту — рызыкантаў і ў пэўным сэнсе рамантыкаў) знаёмыя з законамі ды кан'юнктурай мастацкага рынку, розныя сегменты якога яны, як падаецца, паспяхова абслугоўваюць. Па ўзросце ўдзельнікі "Zabora" — сярэдняе пакаленне. І, магчыма, у вачах тых, хто ідзе за імі, яны выглядаюць калі не кансерватарамі ды артадоксамі, дык, самае малое, — традыцыяналістамі. Адзін з удзельнікаў выстаўкі выказаўся пад час вернісажу ў прыватнай размове пра гэта ў тым сэнсе, што сучасныя тэндэнцыі, магчыма, мусяць прадстаўляць не яны, сталыя мастакі, а ўсё ж такі творчая моладзь. І, можа, ад пачатку арганізатарам праекта варта было б засяродзіцца не на тых, хто ўжо сцвердзіўся як творца з адметным стылем, а дапамагчы выйсці на ўласны шлях тым, хто сябе яшчэ шукае.

Гэтая думка можа легчы ў аснову канцэпцыі наступнага "Zabora".

К

Тэатральная плошча

Атрымаўся іншы мікст

Адзін з дыпломаў удзельніка XIX Міжнароднага тэатральнага фестывалю "Белая Вежа" паехаў у Пінск: яго атрымаў малады Палескі драматычны тэатр (утвораны, нагадаем, у 2006-м на базе народнага) за спектакль "Nach hause" паводле п'есы "Дадому" Алены Паповай.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Можна толькі падзякаваць арганізатарам, што на гэтым буйным форуме міжнароднага маштабу яны не забываюцца на сваіх суседзяў па рэгіёне. Для тэатра з Пінска гэта і аванс, і вялікі стымул для развіцця, каб штогод не проста фарміраваць рэпертуар, задавольваючы патрэбы публікі, але і рыхтавацца да выязных паказаў ды творчага спаборніцтва ў фестывальных рамках.

Не ведаю, як выступалі пінчукі на "Белай Вежы" раней, але іх сёлетні паказ удалым не назавеш. З аднаго боку, спектакль супадаў па часе з "Дзядамі" прыватнага айчыннага Тэатра "Ч", куды і рушылі ўсе замежныя крытыкі. З іншага ж, сама пастаноўка выклікае шмат пытанняў ды заўваг. Калі разглядаць яе ў кантэксце гістарычнага развіцця тэатра, які не адсвяткаваў пакуль нават дзесяцігоддзя, дык імкненне асвоіць новую для яго стылістыку можна толькі вітаць. Калі ж зірнуць з уласна мастацкага пункта гледжання, дык цяперашні вынік наўрад ці можа задаволіць.

Для асобна ўзятага Палескага тэатра зварот у 1990-я, з іх жорсткай эстэтыкай, можа быць і крокам наперад (хаця ўжо ёсць у рэпертуары больш удалае "чарноцце" — "Я так хачу дадому!.." пра бяздомных дзяцей). Для тэатра ўвогуле ў кантэксце ўсяго сучаснага працэсу — відавочны анахранізм. Ёсць яшчэ адна гістарычна абгрунтаваная рыса, уласцівая ўсім нацыянальным культурам ды іх асобным з'явам: у час, калі засвойваюцца асобныя прапушчаныя па той або іншай прычыне тэндэнцыі, а то і цэлыя перыяды, іх элементы не толькі набываюць іншае нацыянальнае адценне, але і спалучаюцца адно з адным, наслойваюцца, часам прыводзячы да "сумяшчэння несумяшчальнага". Так адбылося і гэтым разам. А тое, што спектакль Віталя Баркоўскага, пастаўлены некалі ў Віцебску, у Коласаўскім тэатры, быў цалкам перанесены ў Пінск, толькі ўзмацніла сітуацыю. Бо як бы ні намагаліся пастаноўшчыкі, дакладны перанос звычайна атрымліваецца больш бляклым у параўнанні з арыгіналам. Выключэнні тут — рэдкія. А трансфармацыя аказваецца больш рэзкай.


Сцэна са спектакля "Nach hause". / Фота прадастаўлена тэатрам

Значныя скарачэнні, зробленыя рэжысёрам у п'есе пра трагедыю эмігрантаў постсавецкага часу, патрабавалі ад артыстаў такога ўнутранага "тлумачэння" іх роляў, каб адно па сцэнічных паводзінах глядач "прачытаў" усе тыя скарачэнні. Ці, наадварот, падобная версія п'есы магла быць пастаўлена з элементамі тэатра абсурду. У Палескім драматычным тэатры атрымаўся іншы мікст: экспрэсіянізму з яго амаль парадыйным увасабленнем, сцэнаграфічнага мінімалізму, памножанага на максімальную тэатральную ўмоўнасць, з усім стосам акцёрскай "вампукі". Адная і тая ж песня, што стала лейтматывам, успрымалася не проста пакутай, а сапраўдным катаваннем: артысты ўвесь час курчыліся ды падалі долу. Можа, на спектакль паўплывала яшчэ і тое, што ён паказваўся ў вялізнай зале Абласнога грамадска-культурнага цэнтра? Бо замест жорсткай, але пранізлівай "дакументальнасці" артысты ўвесь час "націскалі" на гледача, "выціскаючы" з сябе напал знешніх тэатралізаваных эмоцый. Тут няма трагедыі, якую мы калісьці перажывалі ў кіношнай "Інтэрдзяўчынцы". Атрымалася штосьці кшталту "не хадзіце, хлопцы-дзеўкі, у Германію гуляць": альбо вас падстрэляць ці зарэжуць, альбо вы...

К

Музей аднаго дома днямі адкрыўся на тэрыторыі Белавежскай пушчы — у вёсцы Рудня Свіслацкага раёна.

Велатур "К": па ваколіцах "каралеўскага горада"

"Гродзенскі трохкутнік" і яго адрозненне ад Бермудскага

Серыя чацвёртая

"Халі-галі" на культурным памежжы

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Манахі-дамініканцы, якія прыйшлі сюды праз тры стагоддзі, былі больш паслядоўнымі і збудавалі шыкоўны барочны кляштар, які ў выдатным стане захаваўся да нашых дзён. Але славянская назва мястэчка — Лішкава — аказалася для яго прарочай: ужо ў XX стагоддзі яно стала папраўдзе лішнім. Цяпер тут жыве некалькі дзясяткаў чалавек, і жыццё абуджаецца хіба тады, калі з Друскенікаў прыплывае экскурсійны караблік: яго рэйсы ўлетку ладзяцца некалькі разоў на дзень.

А вось той самы недабудаваны замак выглядае сёння несамавіта. Ля ўзножжа схіла абсталявана стаянка, угару пракладзены сходы, ёсць і дзе прысесці... Але закансерваваныя з дапамогай бетоннага брыля рэшткі вежы падаюцца, хутчэй, "помнікам эпохі ЖКГ", а зусім не часоў Вітаўта. Няма і інфармацыйных стэндаў, якія звярталі б увагу на гэты гістарычны помнік. Затое ў наяўнасці — купы смецця. Карацей кажучы, калі вас цікавіць досвед эфектнага ды крэатыўнага экспанавання руін, у Лішкяву можна не ехаць.

Выпраўляючыся ў вандроўку, я меў намер падзяліцца і яшчэ адным цікавым літоўскім досведам. Са здзівам даведаўся, што ў маленькім Лаздзійскім раёне (насельніцтва — трохі больш за 20 тысяч чалавек) працуе ажно пяць музеяў. Прычым адзін з іх прысвечаны Эміліі Плятар! Як вядома, кароткі век "нашай Жанны д'Арк" скончыўся ў вёсцы Капцёва — цяперашнім Капчамесцісе. Там і паўстаў прысвечаны ёй школьны музей, а трохі пазней ён змяніў ведамасную прыналежнасць ды зрабіўся філіялам Лаздзійскага краязнаўчага. Такі вось сакрэт колькасці...

Мне падавалася, быццам розніца ў статусе і сапраўды мае значэнне. На Беларусі багата нядрэнных школьных музеяў, але ж для шараговага наведвальніка яны амаль недаступныя — нават пры добрай волі гаспадароў. Варта камусьці прыхварэць альбо… проста не мець часу — і турыст застаецца ні з чым. Красамоўны прыклад — тыя ж Гальшаны. Ніша грунтоўнага краязнаўчага музея там дасюль незанятая, хаця музей такі, кажуць, даўно ўжо існуе пры школе. Па шчырасці, ведаю пра яго толькі па чутках, бо мае намаганні туды трапіць плёну не мелі.

Мне думалася, што афіцыйны статус музейнай установы мае забяспечыць турыстам тую самую гарантаванасць. Але перш чым выправіцца ў Капчамесціс, на ўсялякі выпадак набраў кантактны нумар ды запытаў, як бы гэта наведаць музей Эміліі Плятар.

— Ніяк, — быў адказ. — Я ў адпачынку.

Добра яшчэ, што патэлефанаваў, а не "павёўся" на інфармацыю з раскладам працы, якая размешчана на афіцыйным сайце музея... Замест Капчамесціса скіраваўся ў Лейпалінгіс. Прыгожы класіцыстычны палац Крушэўскіх агледзець таксама не ўдалося: там поўным ходам ідзе рэстаўрацыя. Хаця яшчэ зусім нядаўна ён стаяў з забітымі фанерай вокнамі, і толькі ў адным з флігеляў знаходзіўся мясцовы музей. Неўзабаве яго плошчы значна пашырацца.

Увогуле, заўважыў дзіўную тэндэнцыю: тыя закінутыя сядзібы ў Літве, што засталіся ў дзяржаўнай уласнасці, вяртаюцца да жыцця нават хутчэй, чым маёнткі, якія былі некалі набыты прыватнікамі і цяпер неяк "падвіслі". Прыкладам, закінуты палац Тышкевічаў у Нямежысе мне ўдалося знайсці толькі з другога раза. Здавалася б, прамінуць яго проста немагчыма: камяніца стаіць наўпрост на шашы Мінск — Вільнюс. Але за тыя гады, пакуль уласнік "збіраецца з сіламі", дрэвы і хмызы навокал паспелі настолькі вырасці, што палаца за імі ўжо не відаць…

Натуральна, чакаць свайго часу (ці, калі канкрэтней, фінансавання) такім аб'ектам даводзіцца даволі доўга, і паратунак прыходзіць зазвычай у выглядзе грошай Еўрасаюза. Але варта яшчэ раз падкрэсліць, што занядбаныя маёнткі, якіх у Літве па-ранейшаму процьма, усё ж не пакінуты зусім на волю лёсу. Прынамсі, дзірак у даху ні ў адным з іх не знойдзеш.

У наступным мястэчку — Вяйсеяй — затрымліваюся, толькі каб агледзець мажны барочны касцёл Святога Юрыя. Збудаваны ён быў ужо ў XIX стагоддзі, аднак выглядае гадоў на дзвесце старэйшым: тут і блізка няма тых вытанчаных форм, якія былі ўласцівыя барока ў фінальны яго перыяд. Шукаць рэшткі сядзібнага комплексу колішніх уладальнікаў мястэчка Агінскіх часу ўжо не было, — пагатоў, ад былой раскошы засталося ўсяго пару маленькіх камянічак.

Яшчэ кіламетраў пятнаццаць суцэльнага "халі-галі" па ўшчэнт разбітай коламі лесавозаў гравійцы — і я незаўважна перасякаю мяжу з Польшчай.

Дамок з чырвоным ганкам

Менавіта ў гэтай глушы знаходзіцца старая сядзіба ля вёскі Краснагруда. Каб не ўказальнікі, ніколі б яе не знайшоў. Невялічкі драўляны дамок з вальмавым дахам мае неардынарную гісторыю і датуецца ажно XVII стагоддзем. Некалі там адпачываў ад сваіх шматлікіх спраў прызабыты ў нас Мацей Эйсмант — стольнік гродзенскі і "правая рука" рэфарматара Антонія Тызенгаўза. Значна пазней, ужо ў міжваенны перыяд XX стагодддзя, у маёнтку любіў гасцяваць на вакацыях будучы нобелеўскі лаўрэат Чэслаў Мілаш. Яно і не дзіва, бо вакол чароўныя мясціны — узгоркі, азёры — і амаль ні душы… Але потым драўляны будынак ператварыўся ў леснічоўку і неўзабаве прыйшоў у заняпад. Карацей, досыць тыповы лёс шараговых шляхецкіх сядзіб, пагатоў, размешчаных у глушы.

Уласна, менавіта імя Мілаша і паспрыяла вяртанню гэтай сядзібы да жыцця. Спадкаемцы перадалі яе фонду "Памежжа" з Сейнаў, які даўно ўжо выступае каталізатарам культурных працэсаў таго краю. І ў сотыя ўгодкі з дня нараджэння паэта пачарнелая закінутая халупа з дапамогай дзяржаўных сродкаў ператварылася ў цяперашні прэзентабельны дамок з чырвоным ганкам. Што праўда, як прызнаўся старшыня фонду Кшыштаф Чыжэўскі, папярэдне стары зруб давялося дазванням разабраць: ён настолькі прагніў, што быў непадуладны рэстаўрацыі. А адкуль жа ўзяўся чырвоны ганак?

— Сапраўды, многія папікаюць нас за тое, што ён не адпавядае гістарычнаму выгляду шляхецкага дома, — апавядае Кшыштаф Чыжэўскі. — Але мы не ставілі сабе за мэту рабіць музей — хутчэй, нешта адваротнае, скіраванае не на адлюстраванне мінулага, а на стварэнне будучыні. І ганак — гэта свайго кшталту правакацыя…

Краявіды Лішкава.

Якое ж прыстасаванне было знойдзена для размешчанай у глухім кутку сядзібы? Пасля рэканструкцыі там адкрыўся Міжнародны цэнтр дыялога. Гэта месца, дзе несупынна ладзяцца семінары, майстар-класы, камерныя імпрэзы ў літаратурнай кавярні… Мабыць, менавіта пра нешта падобнае даўно мараць творчыя людзі ў Беларусі, якія з настальгіяй згадваюць колішнія "вячоркі" ў профільных дамах адпачынку...

Зрэшты, у праграме Цэнтра ёсць пункты, разлічаныя не толькі на творцаў, культурных менеджараў ды іншую "залётную" публіку з розных куткоў свету, але таксама і для моладзі з навакольных вёсак. Менавіта паслядоўная работа з лакальнымі супольнасцямі стала галоўнай адметнасцю дзейнасці фонду "Памежжа".

Асноўная глядацкая пляцоўка фонду — барочная Белая сінагога ў Сейнах — на час майго прыезду была зачынена. Акурат толькі што скончыўся чарговы фестываль "Лета ў памежжы", і амаль штодня цягам двух месяцаў там ладзіліся спектаклі, канцэрты клезмерскай музыкі, розныя сустрэчы… Варта адзначыць, што насельніцтва гарадка — усяго каля шасці тысяч чалавек…

Раней у Сейны з Гродна вяла добрая накатаная дарога — як

На людным месцы

"Рухавік" культуры

За чвэрць стагоддзя народны ансамбль песні і музыкі "Хаціславяне" Хаціслаўскага СДК выступаў на сцэнах Брэстчыны і ўсёй рэспублікі. Талентам калектыў не раз скарыў гледачоў Украіны ды Польшчы…

МАЛАРЫТЧЫНА

— Аднак, — зазначае мастацкі кіраўнік калектыву Галіна Хомік, — мы асабліва любім выступаць і з нецярплівасцю чакаем кожную сустрэчу з прыхільнікамі нашай творчасці ў родных сценах, асабліва — у Хаціслаўскім СДК і Маларыцкім ГДК. Тут, здаецца, і голас гучыць мацней, званчэй, шырэй, раздольней, і песні льюцца, як крынічкі вясновыя звіняць…

Крок да стварэння калектыву Галіна Іванаўна зрабіла ў чэрвені 1988-га. Тады яна здолела згуртаваць некалькі чалавек, якія любілі, хацелі і ўмелі добра спяваць. Сустрэчы-рэпетыцыі праводзілі на базе Хаціслаўскага СДК. Недзе праз год калектыў стаў дзейнічаць як фальклорны ансамбль "Хаціславяначка", у якім спявалі толькі пяць жанчын. Творчы шлях пачаўся са свята вёскі Мельнікі. Цёплы прыём натхніў удзельнікаў ансамбля, надаў сіл для пошукаў шляху да сэрцаў гледачоў ды слухачоў. Чарговай прыступкай на ім стала сцэна Хаціслаўскага сельскага дома культуры. Ансамбль спадабаўся гледачу, заваяваў любоў і павагу сярод вяскоўцаў. Пасля пачаліся выступленні на раённай і абласной сцэне. Потым — удзел у фестывалі "Берагіня" ва ўкраінскім Луцку, у "Прыбужскіх бяседах" у Польшчы. Дзякуючы вялікай творчай дзейнасці і ўдзелу ў міжнародных імпрэзах у 1992-м калектыву было нададзена званне народнага.

— Адна з мэт ансамбля, — распавядае Галіна Хомік, — імкненне прывіць слухачам любоў да народнай песні, папулярызацыя апошняй, беражлівае стаўленне да фальклору, адкрыццё новых талентаў, якімі так шчодра надзелена наша Маларытчына…

Народны ансамбль песні і музыкі "Хаціславяне". / Фота аўтара

Цяпер ансамбль складаецца з дванаццаці чалавек ва ўзросце ад 30 да 60 гадоў. У рэпертуары народныя беларускія, у тым ліку мясцовыя, украінскія песні і творы ў апрацоўках. З года ў год ён абнаўляецца і папаўняецца новымі цікавымі творамі.

— Час не стаіць на месцы, — заўважае Галіна Іванаўна. — Мы зразумелі: каб быць на плаву, неабходна рухацца. У "фармаце" фальклорнага калектыву нам стала цесна працаваць. З'явілася шмат ідэй, канцэпцый, якія хацелася рэалізаваць. Таму ў 2002-м прынята рашэнне перайменаваць "Хаціславяначку" ў народны ансамбль песні і музыкі "Хаціславяне". Цяпер мы выконваем не толькі фальклорны матэрыял, але і інструментальную музыку, песні беларускіх аўтараў ды апрацоўкі народных песень…

У Галіны Хомік, якая мае энтузіязм, творчую фантазію, імкненне сабраць, зберагчы і перадаць нашчадкам багаты фальклор Маларытчыны, шмат пакуль нерэалізаваных задумак, ідэй і творчых планаў. Балазе Галіна Іванаўна не любіць сядзець склаўшы рукі. "Хаціславян", думаецца, чакае вялікі творчы шлях. У рэпертуары, канешне ж, будуць і новыя песні, і танцы, і абрадавыя пастаноўкі.

Галіна Іванаўна, якую сёння калегі называюць адным з "рухавікоў" культуры на Маларытчыне, пастаянна клапоціцца і гадуе новыя таленты для "Хаціславян". Робіць яна гэта плённа з дапамогай Дзіцячага клуба аматараў фальклору "Вясковая табала". Ён быў створаны ў 1991 годзе. А яшчэ некалькі месяцаў таму, да атрымання звання "ўзорны", ён называўся "Крынічка"…

Мікалай НАВУМЧЫК
Маларыта

Сёлетні Мінскі міжнародны кінафестываль "Лістапад" займее ў якасці адной з цікавостак **начныя кінапрагляды**.

распавёў адзін мясцовы жыхар, у тамтэйшых лясах усё яшчэ можна знайсці яе сляды. Яно і не дзіва, бо польскі гарадок цягам ці не ўсёй сваёй гісторыі быў у сферы прыцягнення "каралеўскага горада", дый адлегласць паміж імі зусім невялікая — калі напрасткі. Але цяпер, вядома, даводзіцца ладна даваць кругаля. Гэта варта зрабіць, прынамсі, дзеля таго, каб наведаць асноўную адметнасць — вялізны дамініканскі кляштар. Як і ў выпадку з нашай Бярозай, некалі ён быў не толькі духоўным цэнтрам, але і "горадаўтваральным прадпрыемствам" Сейнаў. Шыкоўны барочны ансамбль захаваўся значна лепш, чым усе айчынныя адпаведнікі, але ж яму таксама давялося перажыць перыяд заняпаду, дый пагэтуль там ідзе рэстаўрацыя. Што, аднак, не перашкаджае вазіць сюды экскурсіі.

Прыблізна траціну насельніцтва Сейнаў складаюць літоўцы. Раней з-за гэтага ўзнікалі нежартоўныя канфлікты, цяпер жа поліэтнічнасць надае мястэчку адмысловы шарм. Падсілкаваўшыся ў карчме пры тамтэйшым літоўскім цэнтры (такі спосаб прапаганды ўласнай культуры, безумоўна, вельмі дзейсны), рушу ў саракакіламетровы шлях да Аўгустава. Вузкія польскія дарогі не надта прыдатныя для велатурызму, тым больш, у пятнічны вечар, калі ўсім кудысьці трэба.

Ужо ў прыцемках сустракаю на шашы доўгачаканую шыльду — "Аўгустоўскі канал". Радасна яе фатаграфую: менавіта гэты аб'ект быў вызначаны ў якасці канцавога пункта маршруту. Зрэшты, радавацца было зарана: надпіс азначаў толькі тое, што я ўехаў у межы той складанай водна-сістэмы, якая размешчана ў Аўгуставе ды яго ваколіцах. А да цэнтра горада заставалася яшчэ кіламетраў пятнаццаць.

Такі розны Аўгустаў

Згодна з легендай, якую распавядае турыстам ці не кожны гід, Аўгустаў быў заснаваны на тым месцы, дзе Жыгімонт Аўгуст упершыню сустрэў Барбару. Турысты вераць. І гэта не дзіва, калі ўлічыць, што пра існаванне такога населенага пункта, як Геранёны, ведаюць нават не ўсе жыхары той краіны, дзе ён знаходзіцца.

"Завочна" Аўгустаў падаваўся мне нейкім фешэнебельным курортам, жыццё якога нагадвае антураж стужкі "Летась у Марыенбадзе". Усё аказалася зусім інакшай: спакойны невялічкі гарадок, у меру дагледжаны і ў меру правінцыйны. Гістарычных адметнасцей там зусім няшмат, але агулам цэнтру Аўгустава ўдалося захаваць традыцыйныя для падобных гарадкоў аблічча ды атмасферу, і малапаверхавую забудову (як гістарычную, так і "навадзельную") тут не разбаўляюць высачэзныя гмахі.

У парку драўляных скульптур Антанаса Часнуліса.

Асілак з каменем з Музея драўляных скульптур.

Спынны сейменскі касцёл Адведзінаў Найсвяцейшай Панны Марыі.

Рэвіталізаваная сядзіба ў Краснагрудзе.

Ці не ў кожным другім доме здаецца жытло, прычым сярэдняя цана — недзе 8-10 долараў за "койкамесца". Добра паесці каштуе ўдвая менш. Адпаведна, прыехаць сюды ў адпачынак будзе па кішэні літаральна кожнай польскай сям'і. Мабыць, менавіта ў гэтым дэмакратызме і тоіцца сакрэт поспеху курорта. Вядома, на яго вуліцах можна сустрэць якіх заўгодна турыстаў — прыкладам, цэлую купку японцаў, якія нешта ўтрапёна фатаграфуюць. Але асноўная мэтавая група — гэта менавіта сярэднестатыстычныя суайчыннікі, а не прывідныя замежныя прынцы. Ну, і беларусы з расіянамі, канешне ж, даязджаюць: у нашых краінах такі цэнавы сегмент зусім не развіты.

Прыродных адметнасцей тут удосталь, а вось гістарычных — бракуе. І менавіта таму ледзь не на кожным слупе вісіць рэкламка экскурсій у Вільнюс або Рыгу. Гродна тураператоры, вядома, не прапануюць.

— Некаторыя заплываюць і да вас, балазе тэхнічна гэта зусім нескладана, — распавёў боцман аўгустоўскага порта для маламерных судоў, які прадставіўся проста як Бос. — Але, канешне, такіх небагата. Сам разумееш, візы…

На яго базе можна ўзяць у арэнду любую "пасудзіну" — ад банальнай лодкі і да "кэмпера на вадзе", дзе ёсць усе магчымыя выгоды. Калі ж хто пабойваецца ператварыцца ў капітана ды выправіцца ў самастойнае плаванне, можа проста купіць білет на рэйсавы караблік. Карацей, для "асваення" таго прыроднага багацця, што атачае Аўгустаў, існуе багата розных магчымасцей.

А што да самога Канала… У горадзе ён выглядае досыць несамавіта: вада яўна не крыштальнай чысціні, берагі пазарасталі, бетон узбярэжнай патрэскаўся… У дадатак літаральна побач праходзіць міжнародная магістраль, рух па якой ідзе несупыннай плынню.

Дарэчы, пра дарогі і добраўпарадкаванне… Калі я ўжо збіраўся выпраўляцца з Аўгустава, раптам давялося даведацца яшчэ адно значэнне слова "певень", а таксама пра размяшчэнне гэтай падступнай дэталькі на раме веласіпеда. Адзін нязграбны рух — і апошні ператварыўся ў самакат, а я — у пешахода. Убачаныя па дарозе на станцыю краявіды здзіўлялі чым далей, тым больш: шлях да "чыгуначнай брамы" турцэнтра ішоў паўз бетонныя парканы, пашарпаныя склады, зарослыя пусткі… Сама станцыя ўразіла яшчэ мацней. Стогадовай даўніны будынак вакзала, мяркуючы па яго выглядзе, добра "пашкуматала жыццё*". У дадатак ён зачынены, і вакол — ні душы! Нават прысесці няма дзе, бо лаўкі не прадугледжаны. У Сакулцы, куды я неўзабаве даехаў, усё амаль тое ж самае. Параўноўваць гэтыя старадаўнія вакзалы з Парэччам, адкуль пачынаў свой шлях, нават неяк няёмка. А калі я ўрэшце прыбыў на абноўлены вакзал у Гродне, дык адчуў сапраўдны прыліў патрыятызму.

■■■

Відавочна, што ігнараваць наяўнасць у ваколіцах Гродна двух "здзейсненых" і даволі раскручаных турцэнтраў ніяк не выпадае: будзе сабе даражэй. Несумненна і тое, што беларуская і замежная часткі нашага маршруту "не паўтараюць" адна адну. Так сталася, што галоўныя прыродныя адметнасці колішняга гродзенскага краю апынуліся за мяжой, а вось гістарычныя, наадварот, засталіся ў нас. Адпаведна, яны могуць выдатна працаваць у комплексе. Галоўнае — распрацаваць ды прапанаваць турыстам канкрэтны прадукт.

Ну, напрыклад… Асобная катэгорыя наведвальнікаў Друскінінкая — гэта жыхары Ізраіля. Нашы людзі ездзяць у адпачынак туды, дзе цёпла, а яны — акурат наадварот. Дык няўжо на Гродзеншчыне не знойдзецца маршруту для тэматычнай экскурсіі, разлічанай менавіта на гэтую аўдыторыю?

Ну, і, канешне ж, застаецца адкрытым пытанне з візамі. Здавалася б, з нашага боку ўжо ёсць досвед плённага яго вырашэння, але ж тычыцца ён пакуль толькі спартыўных мерапрыемстваў. А што, можа, варта нам увесці свой адказ знакамітай "на закупы" — адмысловую візу, скажам, "у музей"?

Ды, на жаль, замест ліквідацыі ўжо існых бар'ераў спакваля вырастаюць новыя. Зараз наш велатур ужо не паўторыш: Памежны Камітэт Рэспублікі Беларусь часова спыніў рух пешаходаў (а з імі і веласіпедзістаў) праз кантрольна-прапускныя пункты. Будзем верыць, што часова…

К



Першыя часткі сёлетняга велатура "К" па ваколіцах Гродна газета апублікавала ў №№ 35, 38, 40.

Акардэон-цымбалы па-шляхецку

Уладальнікам Гран-пры III Фестывалю песні "Эўрыдыка" памяці Анны Герман, што праходзіў у Мінску пры садзейнічанні Пасольства Польшчы ў Беларусі, стаў народны інструментальны ансамбль "Ars Longa" Ракаўскай дзіцячай школы мастацтваў, які выступаў з салісткай Юліяй Скурко, выкладчыцай гэтай школы.

РАКАЎ

Надзея БУНЦЭВІЧ

Ансамбль "Ars Longa" добра вядомы не толькі ў нас, бо ўдзельнічае ў раённых ды абласных мерапрыемствах, але і за межамі краіны, выступаючы ў Аўстрыі, Літве, Польшчы, Расіі. На яго рахунку перамогі ў конкурсах ды фестывалях. Створаны ў 2007-м цымбалісткай Юліяй Мякінка, якая і дагэтуль у складзе калектыву, ён стаў адлюстраваннем тэндэнцыі, што ахапіла ледзь не ўсе профільныя навучальныя ўстановы малодшага звяна. Музыканты, сярод якіх было шмат нядаўніх выпускнікоў музычных ВНУ ды каледжаў, прагнулі не толькі выкладаць, але і музіцыраваць, аранжыраваўшы для свайго складу музыку розных стыляў і жанраў. Прынцып, па якім складаліся падобныя калектывы, у чымсьці нагадваў працяг традыцый беларускай шляхты XVIII стагоддзя, калі ансамблі (пераважна, на траіх) утвараліся з тых, хто завітаў у госці.

Ужо трэці год кіраўніком "Ars Longa" з'яўляецца акардэаніст Марат Лагутка. А ў складзе ансамбля, акрамя акардэона і цымбалаў, ёсць таксама скрыпка, фартэпіяна, бас-гітара (якая можа замяняцца на басбаян) і ўдарныя. Рэпертуар — самы розны. Як кажуць, на ўсе густы, акрамя дрэннага. Выканальніцкія версіі твораў часта вылучаюцца крэатыўнасцю, нечаканымі трактоўкамі, зменай тэмпаў і настрою. Пераважаюць святочнасць, імпульсіўнасць, энергетыка, што выпраменьваецца з гукаў, усмешак, узлётаў рук, палачак, смычка. З'явіліся і аўтарскія творы, якіх усё больш.

А праз некалькі дзён пасля Гран-пры колькасць узнагарод павялічылася: ансамбль стаў лаўрэатам Фестывалю народнай творчасці Міншчыны "Напеў зямлі маёй", што праходзіў у Мар'інай Горцы напярэдадні Дня работнікаў культуры. У якасці прыза ён атрымаў камплект гукаўзмацняльнай апаратуры.

К

Беларускі саюз мастакоў смуткуе ў сувязі са смерцю ЯСТРАБА Франца Адамавіча, члена грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз мастакоў", вядомага мастака, які ўнёс вялікі ўклад у развіццё і прапаганду беларускага выяўленчага мастацтва. Рада ГА "БСМ" выказвае спачуванне родным і блізкім у сувязі з напаткаўшым іх вялікім горам.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе з прычыны смерці ЯСТРАБА Франца Адамавіча — славутага мастака Беларусі — і выказвае спачуванні родным і блізкім мастака. Светлая памяць аб Ястрабе Францы Адамавічы назаўсёды застанецца ў сэрцах родных, блізкіх, калег і сяброў.

ф о т а ф а к т

"Тата" ў фінале

Міжнародны фестываль "ТэАРТ-2014" завяршыўся 22 кастрычніка прэм'ерай беларускай трупы. Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы прадставіў спектакль "Тата" паводле п'есы Дзмітрыя Багаслаўскага — прадстаўніка новай хвалі беларускай драматургіі. Падрабязна пра пастаноўку — у наступных нумарах.

Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Сёння ў Магілёве стартуе кінатыдзень пад назвай "Тураўская восень", прысвечаны памяці айчыннага рэжысёра і сцэнарыста **Віктара Турава**.

Стратэгія начальніка аддзела

Мульт — па замове

Мы шмат пісалі сёлета пра ініцыятывы аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Рэчыцкага раёна. Пісалі і будзем пісаць. Ініцыятывы гэтыя, і камерцыйныя і сацыяльнага зместу, — заўжды яркія ды нестандартныя. А таму з'яўляюцца для іншых аддзелаў не толькі прыкладам крэатыўнага мыслення, але і ўзорам якаснай рэалізацыі.

ТЭКСТ

Святлана КРАЎЧАНКА, начальнік Рэчыцкага райаддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі

— Апошні наш праект вось які. Пры Гарадскім эколага-культурным цэнтры мы 1 верасня адкрылі экамультстудыю. Тут дзеці сваімі рукамі і пры дапамозе ўласнай фантазіі пачалі ствараць мультыплікацыйныя фільмы на экалагічную тэматыку. Так, ніхто не дапамагае ім рыхтаваць сцэнарыі, выдумляць вобразы герояў, распрацоўваць драматургію і рэжысуру раскрыцця мастацкай ідэі. Здымкі, апрацоўка, мантаж — таксама клопат студыйцаў. Адным словам, дзіцячым уяўленнем пры дапамозе пластыліну, фотакамеры і камп'ютара атрымліваецца мультыплікацыйны твор. Фінансуе дзейнасць студыі абласное ўпраўленне аховы прыроды.

Першы мультфільм мы паказваем цяпер ва ўстановах адукацыі. Дэманструецца ён і ў Эколага-культурным цэнтры. Сёлета ў Мазыры праходзіў Рэспубліканскі экалагічны форум, нас наведала дэлегацыя, прадстаўнікі якой замовілі нам чарговую работу. Дзіцячы сцэнарый на сёння ўжо зацверджаны. Неўзабаве распачнуцца і здымкі. Натуральна, той, хто замовіў працу, той яе і аплаціць…

Наперадзе ў нас шмат святаў. У лістападзе, да прыкладу, — гадавіна вызвалення Рэчыцы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у студзені — юбілей нашага мастака Аляксандра Ісачова (карціннай галерэі будзе прысвоена яго імя, бо такое рашэнне на ўзроўні райвыканкама прынята). Але ініцыятарамі святаў, акцый ды агульнакарысных спраў з'яўляецца не толькі наш аддзел. Так павялося ўжо, што да нас ідуць неабыякавыя жыхары горада і раёна, прапаноўваюць нешта сваё і заўжды знаходзяць падтрымку. Так было, да прыкладу, з сёлетнім уладкаваннем скейт-пляцоўкі. Наша моладзь паспрыяла, каб і спонсары для гэтага знайшліся і грантадаўцы.

Рэчыца — вялікі горад, але і раён — не маленькі. Так, сельскі жыхар, у параўнанні з гарадскім, чагосьці ў культурным плане і недаатрымлівае. Мы спадзяёмся тут не толькі на аўтаклуб з аўтабібліятэкай. У аддзела ёсць ліцэнзія на транспартныя паслугі. Таму выезды сяльчан у раённы цэнтр сталі правілам. Яны рэгулярна наведваюць гарадскія ўстановы культуры. Кошт білетаў пры гэтым — цалкам прымальны. Калі ўлічыць яшчэ, што вандроўкі сваіх працаўнікоў спансіруе большасць нашых сельскагаспадарчых арганізацый, дык можна здагадацца, што такая паслуга сярод вяскоўцаў — вельмі папулярная. Таму вернісажы, канцэрты і кінапрэм'еры без іх не абыходзяцца.

План па пазабюджэтнай дзейнасці мы выконваем. Натуральна, з кожным годам даводзіцца рэалізоўваць усё больш камерцыйных праектаў. Але ўсё тут залежыць ад прафесіяналізму членаў нашай творчай каманды. А да нас нават Вера Барысенка з райвыканкамаўскага аддзела адукацыі, спорту і турызму перайшла. Заробку яна ніяк не здзівілася. Проста знайшла калектыў аднадумцаў, з якімі прыемна працаваць. А працуе яна начальнікам нашай гаспадарчай групы. Не думаю, што ў рэспубліцы на гэтай пасадзе — шмат жанчын.

Што нам замінае ў працы? Толькі адно. Мы вельмі хацелі б пашырыць у горадзе колькасць устаноў культуры, адкрыць новыя атракцыёны… Але не стае фінансавання. Разумеем, што гэта — агульная праблема. Таму ўдасканальваем тое, што маем: павялічваем якасць і пашыраем разнастайнасць культурных паслуг.

Хто эфектыўна зробіць рэкламу аўтэнтычнаму гурту?

Нядаўна наведала раённы фэст аўтэнтычнай песні "Бабулі" ў вёсцы Закальное Любанскага раёна. Цудоўныя гурты з вёсак Ямінск, Обчын, Закальное, Рачэнь, Дарасіно, Пласток, Атраднае. Дзякуючы таму, што бабулі былі "ў сваім", без сцэнічных строяў, публіка рэагавала вельмі жыва, канцэрт быў больш падобны да цёплых вячорак, чым да сцэнічнага выступлення...

Пад час імпрэз у вёсках Обчын і Закальное.

Прыязджаюць, пераймаюць, а як даведваюцца?

ТЭКСТ

Алена ЛЯШКЕВІЧ, метадыст аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі

У сакавіку, напрыклад, РМГА "Студэнцкае этнаграфічнае таварыства" зладзіла для сваіх сяброў паездку ў вёску Обчын Любанскага раёна. Абралі Обчын, бо мясцовы гурт "Павалякі" з'яўляецца носьбітам песеннага стылю выканання, што мае статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі, як і стыль выканання яшчэ двух гуртоў на Любаншчыне. Обчынскія песні дзяўчатам, якія наведвалі гурток па спевах, спадабаліся, таму вырашылі: едзем! Пра начлег ды харчаванне дамовіліся з бабулямі пры дапамозе Сяргея Выскваркі і мастацкага кіраўніка Обчынскага клуба Наталлі Акуліч. Замовілі маршрутку ў мясцовага кіроўцы. Канешне, гэта каштавала нейкіх грошай. Але які турыст не ўкладае грошы ў свае вандроўкі? У выніку атрымалася душэўная сустрэча, паспявалі разам з бабулямі, пакаштавалі вясковых прысмакаў. Для обчынцаў і гасцей бабулі разам з любанскімі танцорамі далі канцэрт і майстар-клас па танцах. Выдатныя выхадныя! Да таго ж бабуль з Восьмым Сакавіка павіншавалі. А ўвага для іх — вельмі істотны фактар…

Дзякуючы высілкам таго ж Сяргея Выскваркі, энергіі работнікаў культуры ў сельскіх клубах, падтрымцы раённага кіраўніцтва, асабіста начальніка аддзела ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Васіля Каткаўца, традыцыйная культура на Любаншчыне квітнее. Я часта чую ад работнікаў культуры з іншых раёнаў: "А, Любань... Дык там бабуль шмат". Не, бабуль у Любанскім раёне столькі ж, колькі і ўсюды. Яны сыходзяць адна за адной, і застаюцца хіба рамесныя вырабы, што захоўваюць цеплыню іх рук, а таксама песні, казкі, танцы, запісаныя энтузіястамі.

На Любаншчыне заўсёды рады гасцям. Тут ладзяцца святы народнага календара, захаваныя носьбітамі традыцый ці адноўленыя па іх расповедах: Каляды, Масленка, Гуканне вясны, Вялікдзень, Русальная нядзеля, Пятроўскі фэст, Макавей. Практыка іх узнаўлення вартая пераймання ў іншых раёнах. Са складанай дэмаграфічнай сітуацыяй у вёсках часта сіл аднаго населенага пункта не стае для таго, каб зладзіць свята. Таму некалькі клубаў яднаюцца і робяць свята разам. Такая традыцыя мае даўнія карані ў гасцявых кірмашах, калі на пэўнае свята родныя і суседзі з усяго наваколля з'язджаліся ў адну вёску: напрыклад, на Пятра — у Шыпілавічы, на Троіцу — яшчэ кудысь…

Фота з архіва Студэнцкага этнаграфічнага таварыства

Цвікі -- ёсць!

Любы з гуртоў, што выступілі, акрамя хіба дзіцячага "Емяльянаўна" (але ж патэнцыял ёсць і ў яго!) мог бы стаць цвіком праграмы якога еўрапейскага фальклорнага фестывалю. Для еўрапейцаў ды суседзяў з усходу Беларусь — анклаў архаікі ў цэнтры Еўропы. Сюды едуць даследчыкі і аматары фальклору, запісваюць гігабайты матэрыялу, выдаюць зборнікі, ладзяць фотавыстаўкі, манцыруюць фільмы, пераймаюць песні… І прыязджаюць не па адным чалавеку. Часта гэта групы, хай невялікія, але зацікаўленыя. Адкуль ім даведацца пра імпрэзы кшталту фэсту "Бабулі"? Палякі дык дакладна гатовы ездзіць цэлым аўтобусам ад аднаго сельскага клуба да іншага, каб толькі хто арганізаваў.

Каму рэкламаваць?

Дык хто ж павінен займацца рэкламаваннем фальклорных мерапрыемстваў? Як атрымалася з "Бабулямі": Сяргей Выскварка, загадчык арганізацыйна-творчага аддзела Любанскага дома культуры, даслаў абвестку знаёмым па Беларусі, тыя павесілі інфармацыю на даступныя ім рэсурсы. Такім чынам на канцэрт сабралася пяць чалавек, усе — з Мінска. Зала, канешне ж, не была пустой: публіка на Любаншчыне любіць фальклор, прывучаная да аўтэнтычнага гучання. Узгадваецца Купалле 2011 года ў любанскім парку. Хэдлайнеры — гурты "Юр'я" і "Альтанка". Так, яны даўно супрацоўнічаюць з мясцовымі работнікамі культуры, запісалі тут шмат песень, запрашаюць бабуль у Мінск, і вось, сабраліся і самі з канцэртам у Любань. Публіка, не зразумеўшы творчых апрацовак фальклору ды авангардных вынаходніцтваў, між тым, не крычала "Далоў са сцэны!", не. Людзі перамаўляліся між сабой: "Нешта нашы бабулі мала выступілі. А гэтыя мінчане — дык ужо паўгадзіны адно і тое ж…" Сяргей Выскварка апавядае, што аўтэнтычны фальклор у праграму гарадскіх святаў імкнуліся ўводзіць паступова: спачатку — па пары песень, потым больш. І вось, у выніку шматгадовай працы, любанская (самая шырокая!) публіка гатова выседзець паўнавартасны канцэрт на гадзіну-паўтары, слухаючы аўтэнтычны фальклор без аніякай апрацоўкі. Ці назіраючы танцы пад гармонік…

Але вернемся да фэсту "Бабулі". Дык хто ж павінен займацца рэкламай? Зразумела, што гэта не самі работнікі культуры, у іх і так шмат працы. Акрамя фальклору, метадыст у раённай установе культуры займаецца ўсім, чым заўгодна: арганізацыяй дзяржаўных і гарадскіх святаў, юбілеяў арганізацый, упрыгожваннем памяшканняў да Новага года… Так што вялікі дзякуй ім, улічваючы агульную загружанасць, за арганізацыю такіх вялікіх фальклорных імпрэз! Энтузіясты са сталіцы — таксама не прафесійныя піяршчыкі. І пазакідаць туды-сюды абвесткі — гэта яшчэ не гарантыя таго, што людзі зацікавяцца і паедуць. Таму маё меркаванне: піярам фальклорных імпрэз (канцэртаў, святаў, якія носяць адкрыты характар) павінны займацца тыя, хто можа зарабіць на гэтым грошы. Аграсядзібы, турфірмы… Як ім даведацца пра тое, што ў той або іншай вёсцы будзе цікава турыстам? Тут, на мой погляд, вялікая роля прэсы. Не работнікі ж культуры будуць ганяцца за бізнесменамі. А тыя, хто зарабляе грошы на аграэкатурызме, прачытаўшы якасна зроблены матэрыял, павінны задумацца: а як выйсці на той раён? Як знайсці там чалавека, які пагадзіўся б арганізаваць усё на месцы?..

Інфраструктура і пытанні

Выплывае і пытанне інфраструктуры, канешне ж. Дзе карміць тых турыстаў? Якія прапанаваць сувеніры? Зноў жа, можна дамовіцца на месцы.

ф о т а ф а к т

Юбілей і прэстыж

На мінулым тыдні Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці адзначыў 75-годдзе з дня заснавання. Арганізатары вырашылі, што юбілей — гэта падзяка тым, хто працаваў і працуе ў галіне культуры. Таму мэтай свята стала падтрымка прэстыжу клубных работнікаў ва ўмовах аптымізацыі. Мерапрыемствы пачаліся з урачыстага пасяджэння калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама, пад час якога адбылося ўзнагароджанне і ўручэнне прэмій за высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва. Пасля на сцэнічную пляцоўку выходзілі ўдзельнікі гала-канцэрта абласнога агляду-конкурсу сярод творчых работнікаў устаноў культуры вобласці "Майстар клубных спраў". Пад час мерапрыемства выступілі ветэраны-культработнікі, а таксама лепшыя калектывы з гарадоў і раёнаў.

Прыемнай навіной стала тое, што ў гэты дзень клубу народных майстроў і мастакоў "Скарбонка" Лепельскага раённага дома культуры было прысвоена ганаровае званне "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь".

Андрэй СТРУНЧАНКА, вядучы метадыст Віцебскага АМЦНТ / Фота аўтара

Майстры мастацтваў з нашай краіны выступілі з канцэртам на **Днях Беларусі ў Сібіры**, што адбыліся на гэтым тыдні ў Новасібірску.

ДК, ды не той, цэх — не заводскі

Альтэрнатыўныя ўстановы культуры: выклік шаблону ці адказ на попыт?

Таленавітым і мэтанакіраваным людзям "кісларод перакрыць", як вядома, цяжка. Таму, калі ўстановы культуры на сваю тэрыторыю іх не пускаюць (аб'ектыўных і не вельмі прычын таму можа быць дастаткова: запланаваныя ўласныя праекты, негатоўнасць прадаставіць плошчы пад нестандартныя акцыі, проста "не фармат"), творцы ствараюць сваю — рэальную ці віртуальную, прычым не менш адметную. Вольныя, адкрытыя, альтэрнатыўныя прасторы, "месцы", "кластары", "праекты ў праекце" з'яўляюцца ў сталіцы як грыбы пасля дажджу і даюць магчымасць сябе паказаць ды на іншых паглядзець. Прапаную пазнаёміцца з парай такіх цэнтраў прыцягнення новага мастацтва.

Аліна САЎЧАНКА

Мастацкі капіталізм

Як паказала практыка праекта "ЦЭХ32", творчае аб'яднанне сёння не абавязкова павінна мець фізічную абалонку ды сталае "месца дыслакацыі". Канцэнтрацыя працавітых і адораных дызайнераў, майстроў ды іншых прадстаўнікоў мастацкіх прафесій можа ажыццяўляцца з пэўнай нагоды пад дзейсным брэндам, але на розных пляцоўках.

Як зазначае арганізатар дадзенага праекта Вольга Завясніцкая, натхнялася яна з калегамі тым, што крыўдна падарожнічаць, выстаўляцца ў рамках розных праектаў у Расіі, Польшчы ды іншых краінах, не маючы пры тым магчымасці прадаваць свой прадукт у роднай краіне выключна з той прычыны, што ўласнай пляцоўкі няма. (Дарэчы, нават ідэя такога праекта з'явілася недзе паміж Мінскам і Санкт-Пецярбургам.) Таму ў выпадку з "ЦЭХ32" гаворка ідзе пра платформу для таленавітых людзей. У рамках гэтага праекта ладзяцца выстаўкі-продажы, тэматычныя фотасесіі, існуе і паспяхова працуе майстэрня па вырабе дэкарацый для разнастайных мерапрыемстваў, праводзяцца майстар-класы (на створаныя тут эксклюзіўныя хэндмэйд-падарункі ёсць попыт на еўрапейскім рынку).

> Многія класічныя, скажам так, музеі, канцэртныя пляцоўкі, галерэі, бібліятэкі пакрысе змяняюць парадыгму свайго функцыянавання, відавочна амалоджваюцца, але, тым не менш, **застаецца процьма ініцыятыў, што апынаецца па-за іх сценамі** і, што яшчэ больш засмучае, па-за іх увагай.

— Нашы выстаўкі, — распавядае Вольга, — праходзяць прыблізна раз на два месяцы. Зараз мы зрабілі перапынак, таму што займаемся падрыхтоўкай інтэрнэт-праекта — віртуальнай гандлёвай пляцоўкі. Ну, і праз сваю "непрапісанасць" пэўнага графіка работы таксама мы не маем. Што ж да скарыстаных намі пляцовак, дык у залежнасці ад тэматыкі ладзілі імпрэзы ў творчых кластарах, у сталічных клубах, у Палацы спорту ды іншых месцах…

Крытэрый адбору творчых работ для пэўнай акцыі — зразумела, якасць. Але, ведучы супрацу не толькі з дызайнерамі ды рамеснікамі, музыкантамі і акцёрамі, таленавітымі людзьмі наогул, арганізатары праекта "ЦЭХ32" бяруць пад увагу, ці спадабаюцца іх вырабы пакупнікам, ці заплацяць яны за іх. Як кажа Вольга, камерцыйнасць праекта выклікае пэўны скепсіс у работнікаў сферы культуры. Якраз падобныя фактары прывялі "ЦЭХ32" да пераўтварэння ў "праект па стварэнні праектаў" — гэткі прадзюсарскі цэнтр.

— Колькі слоў пра канкурэнцыю… — робіць паўзу візаві. — Цікава, калі нараджаюцца новыя праекты, арганізацыі. І нават шкада, калі яны не затрымліваюцца на культурнай карце, бо прымаць выклікі — цікава. Але праблема беларускай таленавітай моладзі — у закрытасці многіх сталых "гульцоў" на прасторы нашых культуры і мастацтва. Такім чынам, для сумесных праектаў працэсы ўзаемадзеяння з музейна-галерэйнымі кропкамі становяцца настолькі складанымі, што нават пачынаць дыялог чарговы раз не хочацца. Таму ў тых самых музеяў і галерэй адна публіка, у нас — іншая. Але ці канкурэнты мы? Не, зразумела...

Натуральна, аналагі "ЦЭХ32" ужо існуюць і будуць з 'яўляцца яшчэ неаднойчы. Але на падобныя ініцыятывы, пагаджуся з Вольгай Завясніцкай, варта глядзець прыкладна з такой пазіцыі: "Выставак у горадзе шмат, аднаразовых ды сістэматычных, але ці пануе там уласная атмасфера, ці адбываецца абмен досведам?".

Келіх… культуры, калі ласка

Зусім іншая канцэпцыя — у нядаўна адкрытага бара "ДК", пра дзейнасць якога мне распавёў адзін з яго заснавальнікаў Лявон Халатран. Асноўная мэта ўстановы застаецца той жа: аб'яднанне творчых людзей і прадастаўленне ім пэўных магчымасцей.

— Мы з напарнікам ва ўстанове планавалі вытрымліваць пэўны баланс паміж творчасцю і камерцыяй. Падаецца, жаданае атрымалі. Да ўсяго, ніша такіх арыгінальных устаноў у Мінску яшчэ свабодная. У нейкім сэнсе прататыпам стаў віцебскі "Beatles-клуб". Ну, і дадайце да гэтага эмоцыі ад прагляду фільма "Душэўная кухня"… Вось такі ў бара "падмурак"…

Лявон адразу адмяжоўвае праект з пашыраным сёння паняццем "вольная прастора": "Маё стаўленне да яго, як і да "антыкавярань", "арт-пляцовак", — даволі супярэчлівае, бо мне не да канца зразумелая мадэль "манетызацыі" такіх устаноў. Я паважаю тых, у каго атрымліваецца трымацца на паверхні доўга. Але з гэтага пункта гледжання алкаголь як паслуга дапамагае, скажам, нам быць рэнтабельнымі, а наведвальнікам дае выбар: бавіць свой час з напоем ці без яго — проста культурна"…

Партрэт "сярэдняга" кліента, па словах суразмоўцы, залежыць ад мерапрыемства. Праўда, і мэтавай аўдыторыі тут не маюць. Таму за колькі месяцаў тут праводзілі канцэрты, майстар-класы, паэтычныя ды танцавальныя вечары, гульнятэкі, стэндапы, спектаклі, канферэнцыі, семінары і нават невялічкі фестываль. "У планах на будучыню — якасная лаяльная пляцоўка для невялікіх канцэртаў, бо такіх месцаў у горадзе не хапае", — кажа Лявон і адзначае:

— На этапе планавання мы самастойна адбіраем мерапрыемствы, якія будуць праходзіць у "ДК", і рашэнне прымаем на аснове некалькіх фактараў, у тым ліку рэкамендацый, актуальнасці, прыбытковасці і нашага суб'ектыўнага меркавання наконт артыста ці мастака. Верым, што "ДК" стане стартавай пляцоўкай для вялікага палёту каго-небудзь…

Шматфункцыянальныя ўніверсальныя культурныя ўстановы пачалі сустракацца ў горадзе ўсё часцей, але адкуль пайшла такая тэндэнцыя? Многія класічныя, скажам так, музеі, канцэртныя пляцоўкі, галерэі, бібліятэкі пакрысе змяняюць парадыгму свайго функцыянавання, відавочна амалоджваюцца, але, тым не менш, застаецца процьма ініцыятыў, што апынаецца па-за іх сценамі і, што яшчэ больш засмучае, па-за іх увагай. І справа тут не столькі ў нежаданні, як бачыцца мне, а, хутчэй, у несупадзенні хуткасцей змены крэатыўна-творчага асяроддзя і сталых асяродкаў культуры. Урэшце, калі кансерватыўнага кшталту ўстановы не могуць ці не лічаць патрэбным паскорыць працэс сваёй "лібералізацыі", дык, можа, варта ім увогуле "адпусціць" сітуацыю і папросту суіснаваць з моладдзю ды яе разуменнем мастацтва ў культурнай прасторы Беларусі? Так, у гэтым я пэўны кансерватар. Інакш атрымліваецца сітуацыя, калі апрабаваныя формы ды метады ў недзяржаўным сегменце культурнай і калякультурнай дзейнасці падаюцца як інавацыі ў сектары дзяржаўным. Праўда, са значным адставаннем. Урэшце, давайце падыскутуем: нашы кантакты вам вядомыя!..

Кажуць эксперты

Алена ЛАГОЎСКАЯ, дырэктар мінскай галерэі "Мастацтва":

— Канешне, альтэрнатыўныя мастацкія маладзёжныя пляцоўкі мы не лічым канкурэнтамі. Але цалкам падтрымліваем іх існаванне. Сучасныя маладыя людзі — вельмі цікавыя асобы. Заўсёды чакаеш ад іх творчасці чагосьці новага, свежага, незвычайнага. Я з задавальненнем наведваю падобныя выстаўкі. Урэшце, мы і самі любім прымаць у сябе такіх творцаў. Вось нядаўна нас парадавала работамі Ірына Ясюкайць-Дударава: у галерэі праходзіла яе персанальная выстаўка. Увогуле ж, шукаем і запрашаем да сябе маладых творцаў, стараемся ім не адмаўляць. А кажам "не" часцей за ўсё па матэрыяльных прычынах: калі зладзіць іх ініцыятыву не дазваляюць фінансы. Таксама мы з'яўляемся пляцоўкай для тых, хто ўваходзіць у Беларускі саюз мастакоў і хоча прадэманстраваць свае работы…

Аляксей БАЦЮКОЎ, дырэктар Музея гісторыі горада Магілёва:

— Канкурэнцыя паляпшае якасць жыцця, тым больш, у нас не так часта адбываюцца нейкія буйныя падзеі. Можна паспець наведаць розныя культурныя пляцоўкі. Дый увогуле: чым больш зацікаўленых ды адукаваных людзей будзе, тым лепш і нам, і нашым калегам. Такім чынам адбываецца культурны сімбіёз. Што да нашага музея, дык пасля рамонту Выставачнай залы было вырашана наступным чынам: у першую чаргу прадастаўляем магчымасць выставіцца прафесіяналам, членам Саюза мастакоў, затым — рэкамендаваным у яго творцам, а затым ужо іншым, у тым ліку пачаткоўцам…

Марыя МАЦКО, дырэктар гродзенскай галерэі "Крыга":

— Тое, што падобныя клубы з'яўляюцца, — гэта вельмі добра. Нам падобных месцаў не хапае катастрафічна. Людзі ў добрым асяродку робяцца дзейнымі, думаючымі, крэатыўнымі. Я памятаю, як у дваццаць гадоў мы нешта падобнае стваралі сваім колам, канешне, без рэгістрацый ды іншых фармальнасцей. Але мы збіраліся разам, нешта абмяркоўвалі, вандравалі, арганізоўвалі фальклорныя групы, шукалі творчых паплечнікаў. Урэшце, моладзь і павінна быць больш актыўнай, а калі яе яшчэ і падрымліваць, то ўсё цудоўна атрымліваецца. "Вольныя прасторы", альтэрнатыўныя галерэі ды іншыя ўстановы такога кшталту канкурэнтамі для галерэй не лічу. Мы з імі паралельна існуём і разам робім добрую справу: выхоўваем маладых людзей, даючы ім магчымасць развівацца. А праз некалькі гадоў, калі яны стануць больш сталымі, у іх будзе патрэба ў мастацтве і прыгажосці. Таму я вельмі рада такой тэндэнцыі...

Культура пачалася з…

…народнай песні

ТЭКСТ

Юлія БЫКАВА, салістка гурта "Aura", паэтка:

— Калі мне было два гады, мая сям'я пераехала з Мінска ў Хабараўск. З-за розніцы ў часе я не спала па начах. А каб у цемры не было страшна, спявала розныя песні. У тыя часы ў маіх бацькоў яшчэ не было магнітафона — толькі радыёпрыёмнік. І каб песня, якая спадабалася мне, засталася са мной, я яе спявала круглыя суткі — бы магнітафон на рэжыме паўтору.

Неўзабаве мы пераехалі назад у Мінск, і, каб дзіця выкарыстоўвала ўвесь свой вакальны патэнцыял днём, а ноччу моцна спала, мяне, чатырохгадовую, бабуля пачала вадзіць у вакальныя гурткі. Але ні ў адным я не затрымлівалася, паколькі спявалі там, у асноўным, акцябрацкія савецкія песенькі, да якіх у мяне ніколі душа не ляжала. І ў пошуках чарговага гуртка мы прыйшлі ў народны ансамбль "Зорачка". Старэйшыя дзеці якраз праводзілі канцэрт і спявалі песню "Ой, бору мой". Я проста закахалася ў яе!.. Памятаю, нават расплакалася. І адназначна вырашыла вывучыць гэтую ды многія іншыя народныя песні.

У "Зорачцы" я займалася дзесяць гадоў, мы аб'ездзілі з гастролямі ўсю Еўропу, далі больш за чатырыста канцэртаў, на якіх мы, салісткі, учатырох пераспявалі па гучнасці ўвесь народны ансамбль.

Далей быў Медыцынскі ўніверсітэт, у якім я спявала ў камандзе КВЗ, потым — праца спявачкай у Бахрэйне, вяртанне ў Беларусь, і з 2002 года я пішу песні для розных выканаўцаў і для свайго гурта "Aura".

Наогул, я люблю ўсё, што адбываецца цяпер у сусветнай музыцы, люблю і старыя песні, і новыя, і модныя, і культавыя. Я не разумею людзей, якія абмяжоўваюць свае густы нейкім адным стылем, бо столькі талентаў на Зямлі! Мяне гэта натхняе. Кожны раз, калі бачу ў краме новы канцэрт любімага гурта, мяне перапаўняе хваляванне ад таго, што я ўбачу нешта новае і таленавітае, тое, што натхніць мяне, што прымусіць перажыць задавальненне ад музыкі, як гэта было ў дзяцінстве. Гэта важна: захоўваць любоў да сваёй справы, не ператвараць яе ў штодзённасць.

> Я не разумею людзей, якія абмяжоўваюць свае густы нейкім адным стылем, бо столькі талентаў на Зямлі!.. Калі ж казаць пра культуру ў цэлым, то я вельмі нецярпімая да праяў бескультур'я ў побыце... Словам, я да таго, што **культура пачынаецца з кожнага чалавека.**

Калі ж казаць пра культуру ў цэлым, то я вельмі нецярпімая да праяў бескультур'я ў побыце. Курэнне ў грамадскіх месцах, да прыкладу, не забаронена законам (я спадзяюся, пакуль), але ж гэта, даруйце, непрыстойна: выдыхаць дым у твар іншым. Я да таго, што культура пачынаецца з кожнага асобнага чалавека. І калі нехта пастаянна скардзіцца, што жыве ў сметніцы, паводзіць сябе адпаведна, то ён і стварае сметніцу вакол сябе. А калі чалавек хоча жыць у развітым квітнеючым грамадстве, нішто не перашкаджае яму пасадзіць на балконе кветкі, прыбраць у пад'ездзе... І не трэба ехаць ні ў якую Еўропу: яна сама ўзнікне вакол пры такім стаўленні...

Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, odnoklassniki.ru/roup/52156879339702**

У час **Дзён культуры Беларусі ў Арменіі** падпісана Праграма супрацоўніцтва паміж міністэрствамі культуры Беларусі і Арменіі.

Каложская карта

Пра 110 знакаў на цэгле XII стагоддзя

Як "К" і абяцала на першай паласе № 38, апавядаем пра тое, як гродзенскія студэнты Алесь ПЕРАГУДАЎ (наш суразмоўца) і Мікіта Каранкевіч даследавалі больш за сотню знакаў на цаглінах Барысаглебскай (Каложскай) царквы ў Гродне. Урэшце, пра факт іх даследавання цягам месяца было напісана нямала, але пра многія канкрэтныя дэталі ўпершыню апавядзе менавіта "К".

Сяргей ТРАФІЛАЎ

— З дзяцінства, — распавядае Алесь, — я хадзіў з бацькамі ў Каложскую царкву на нядзельныя набажэнствы. І ўжо тады Каложа вабіла сваёй старажытнасцю. Але цікавасць да яе менавіта як да аб'екта вывучэння з'явілася ў час вучобы на гістарычным факультэце, калі атрымаў неабходныя веды па метадалогіі даследаванняў мінулага. Жаданне ж правесці сваё, хай і невялікае, даследванне мае бадай кожны гісторык. І таму прапанова гродзенскага спецыяліста Андрэя Вашкевіча зафіксаваць пры дапамозе фотаапарата знакі на цаглінах ды паказаць знаходжанне апошніх на плане царквы падалася мне цікавай. Я звярнуўся да свайго сябра — аматара гісторыі Мікіты Каранкевіча, які таксама падтрымаў ідэю, і мы пачалі рэалізоўваць такі невялікі праект.

— Што ведалі раней пра знакі на цаглінах, пра іх паходжанне ды семантыку?

— Згадкі пра сімвалы на плінфе Каложскай царквы ёсць амаль у кожным гістарычным даведніку, прысвечаным храму. Але больш грунтоўна нам давялося пазнаёміцца з асноўнымі версіямі іх з'яўлення ды тлумачэння ўжо пад час падрыхтоўкі да ўласнай працы, калі былі прааналізаваны амаль усе даступныя працы даследчыкаў гэтай тэматыкі.

— Вы згадалі пра версіі ўзнікнення і тлумачэння знакаў…

— Так, існуе некалькі версій. Большасць даследчыкаў схіляецца да меркавання, што хутчэй за ўсё гэта клеймы майстроў ці будаўнічых арцелей, якія рабілі цэглу і такім спосабам пазначалі партыі плінфы. Але ёсць і іншыя пазіцыі. Напрыклад, што знакі маюць магічны сэнс, бо язычніцкія традыцыі на нашых землях суіснавалі разам з хрысціянствам яшчэ некалькі стагоддзяў пасля Хрышчэння Кіеўскай Русі…

— Такім чынам, выкладзіце мэты і задачы даследавання, а таксама пракаментуйце, наколькі яны дасягнуты.

— Мэтай быў як мага больш поўны ўлік знакаў на плінфе. Задачы — сфатаграфаваць гэтыя знакі, зафіксаваць іх на плане сцен храма — своеасаблівай Каложскай карце — і зрабіць вынікі працы даступнымі для навукоўцаў ды ўсіх зацікаўленых. Намі знойдзена 110 знакаў рознай ступені захаванасці звонку і ўнутры храма.

— Наконт даступнасці вынікаў працы. За пару тыдняў, калі тэма апынулася ў цэнтры ўвагі пэўнай часткі грамадскасці, мо давялося атрымаць канкрэтныя прапановы па далейшай рэалізацыі напрацовак? Наогул, даволі рэдкая з'ява для навукоўца — пашыраць вынікі сваіх даследаванняў у шырокую публічную прастору…

— Была прапанова ад святароў Барысаглебскай царквы размясціць каложскія "карты" з адпаведнай інфармацыяй пра знакі з плінфы на стэндах, прысвечаных гісторыі Каложы. Гэты праект пакуль у распрацоўцы, але спадзяёмся, што ён абавязкова будзе рэалізаваны. Што да распаўсюджвання вынікаў нашай працы ў Інтэрнэце, мы маем наступную пазіцыю: гісторыя і культура Беларусі — гэта каштоўнасць усіх беларусаў, і вялікая памылка абмяжоўваць доступ да яе ды прэтэндаваць тут на аўтарскія правы. Наадварот, трэба папулярызаваць усімі магчымымі сродкамі падобныя факты. Мы не зрабілі навуковага адкрыцця, але проста змаглі дасягнуць большай адкрытасці інфармацыі пра знакі на Каложскай царкве, надалі ёй візуальны характар, каб кожны зацікаўлены чалавек меў свабодны доступ да такіх звестак. А нейкія навуковыя высновы няхай робяць спецыялісты сваёй справы, бо мы пакуль не маем адпаведнага досведу.

— Прыгадайце, калі ласка, найбольш запамінальныя моманты даследавання.

— Бадай, самымі запамінальнымі ды цяжкімі былі пошукі знакаў у схаваным ходзе, які знаходзіцца ў паўночнай сцяне і вядзе з алтара на хоры. Ён вельмі вузкі (шырыня — мо 60-70 сантыметраў) і добра сведчыць пра невялікі рост чалавека XII стагоддзя.

— Якая знаходка аказалася для вас нечаканай? Магчыма, не ўсе знакі пакуль паддаліся расшыфроўцы?

— Нечаканасцю аказаліся надпісы канца XIX стагоддзя, знойдзеныя ў праходзе ў сцяне. Выпадковыя наведвальнікі тады пакінулі сведчанні аб тым, што яны наведалі гэтае месца, калі царква стаяла ў руінах пасля абвалаў і набажэнстваў ў ёй не праводзіліся.

— Ну а што да найбольш цікавых знакаў ды іх расшыфровак?

— Сярод знакаў можна вылучыць кірылічныя літары, рунападобныя надпісы ды сімвалы. Мне і Мікіту больш за ўсё спадабаліся знакі, падобныя на пэўныя рэчы (ключ, рыба ды іншыя). Дзякуючы фантазіі кожны можа ўбачыць у іх нешта сваё…

— Ці была складанасць адносна датавання знакаў?

— Прызнацца, не мелі мэты праводзіць аналіз і датаванне знойдзеных знакаў: гэта справа прафесіяналаў. Але, наколькі нам вядома, згодна з даследаваннямі навукоўцаў, знакі былі нанесены на цэглу яшчэ да яе абпалу ў печы, гэта значыць — пад час будаўніцтва царквы.

— Алесь, а што атрымалася даследаваць паралельна са знакамі?

— Скажам, мы звярнулі ўвагу на сярэднявечнае графіці, якое ўяўляе з сябе іканаграфічную выяву "Стрэчанне", знойдзеную ў сярэдзіне 1980-х пад час рэстаўрацыйных работ у адной з ніш паўночнай сцяны. Гэта вельмі цікавае сведчанне даўніны, але большасць даследчыкаў чамусьці пакідае яго па-за ўвагай. Акрамя выяў святых часткова захавалася некалькі радкоў на царкоўнаславянскай мове. Нас вельмі зацікавіў гэты надпіс, але ўласнымі сродкамі цалкам "расчытаць" радкі пакуль не ўдалася.

Знакі на плінфе Каложы.

— Ці супрацоўнічалі у час доследаў са святарамі царквы? Якое было стаўленне з іх боку?

— Паколькі пошукі ладзіліся не толькі звонку, але і ўнутры храма, мы звярталіся да святароў Каложы па дазвол працаваць у царкве. Яны асабіста ведаюць нас, вельмі добра ўспрынялі і гэты праект, таму адразу далі згоду на правядзенне пошукаў ды нават дазволілі даследаваць алтарную частку храма і патаемны ход у паўночнай сцяне.

— Ці бачыце іншую перспектыву, акрамя гістарычнай і даследчыцкай, у сваёй ініцыятывы? Скажам, камерцыйную… Як наогул бачыце працяг работы і яе далейшую фіксацыю: фармат сайта, кнігі, альбома, мультымедыя-выдання?.. А магчымасці скарыстання ў культурнай прасторы?

— Не, камерцыйнай мэты дакладна не ставім перад сабой. Культура народа — яго духоўны скарб, і размовы пра грошы быць не можа. Аб працягу ж работы ды яе фіксацыі, шчыра кажучы, яшчэ рана казаць. Калі знойдуцца зацікаўленыя людзі, якія дапамогуць рэалізаваць праект у гэтым кірунку, безумоўна, будзем працягваць працу.

— Мо вам цікавыя і іншыя помнікі архітэктуры Гродна і маеце задумы наконт іх даследаванняў?

— Задумы, сапраўды, маем. Але пакуль не станем апярэджваць час і нешта загадваць наперад…

К

Фатаграфічная калекцыя

Альбом палкоўніка Стаброўскага

З надыходам Першай сусветнай вайны ў Беларусі разгарнулася мабілізацыя ваенаабавязаных беларусаў. З абвяшчэннем апошняй на вайну быў мабілізаваны і Язэп Стаброўскі (1870 — 1968) са Слоніма, пазней прызнаны землякамі самым знакамітым ураджэнцам горада ў XX стагоддзі, які сваю калекцыю гістарычных артэфактаў зрабіў асновай для мясцовага гісторыка-краязнаўчага музея.

У войску пад час Першай сусветнай Стаброўскі знаходзіўся да красавіка 1918-га. А калі выйшаў у адстаўку, дык вярнуўся ў родны Слонім і да канца жыцця займаўся краязнаўствам, гісторыяй, археалогіяй. Дарэчы, у гады Першай сусветнай ён не толькі ваяваў, але і вёў запісы ды фатаграфаваў будні салдат, жахі вайны, людское гора… Пасля Стаброўскі стварыў адмысловы фотаальбом з трохсот здымкаў, які назваў "Крывавы след". Кожны аддрукаваны кадр ён падпісваў, рабіў невялікі каментарый. Альбом той збярогся да сённяшніх дзён: ён захоўваецца ў Слонімскім раённым краязнаўчым музеі імя Язэпа Стаброўскага.

Сяргей ЧЫГРЫН, краязнаўца
Слонім

Размяшчэнне рэзерву.

Пасля бою ў Крэве ў сакавіку 1916 года.

Свежыя магілы.

Сіроты.

Паходная кухня.

Выстаўка графікі Валянціна Васільева **"Пушкінагор'е"** са збору Пушкінскага Запаведніка працуе ў Музеі Максіма Багдановіча.

Бясконца добрае сэрца

Мы жылі ў адным пад'ездзе на вуліцы Сурганава, 42. Амаль штодзень сустракаліся, часам размаўлялі падоўгу, часам — на хаду. Але лепшыя гадзіны, канешне ж, праводзілі ў яго мансарднай майстэрні № 144 у высотцы на вуліцы Танкавай, 10 — у тым самым пад'ездзе, дзе ў тыя часы жыў Васіль Быкаў. Тут заўсёды можна было знайсці ветлівасць і разуменне, непустую размову і чарку віна "за тых, хто з пэндзлем"…

Барыс КРЭПАК



Леанід Шчамялёў. "Партрэт Міхаіла Чэпіка".

Майстэрня была невялічкая, напалову запоўненая жывапіснымі творамі, двума мальбертамі, скрынкамі з фарбамі, акварэльнымі альбомамі ды іншымі мастакоўскімі матэрыяламі, але вельмі ўтульная і цёплая, бо належыла "цёпламу" чалавеку з бясконца добрым сэрцам, светлай душой, чыстым сумленнем, для якога мастацтва з'яўлялася ўсім, чым жыве таленавітая асоба. Так, сваю справу ён горача любіў. І любоў гэтую кожны, хто сустракаўся з яго творчасцю, мог адчуць у ягоных пейзажах, нацюрмортах, партрэтах, фігуратыўных карцінах, малюнках. Колькі ў іх захаплення, духу, які лунае, душэўнай цеплыні! Крыштальнай чысціні сэрца трэба было мець, каб так пісаць… А яшчэ ў 1960-я ён быў выдатным плакатыстам: некаторыя навагоднія работы і сёння глядзяцца з цікавасцю, свежа ды сучасна...

Я ўдзячны лёсу за тое, что ён падарыў мне сяброўства з гэтым яскравым, цэласным мастаком і цудоўным, багата адораным чалавекам. Калі ён нечакана пайшоў з жыцця, я раптам усвядоміў, што ўсё ж недастаткова з ім кантактаваў, хаця мы і жылі побач. Праўда, я заўсёды ўважліва сачыў за ягонай іскрамётнай творчасцю і кожную яго новую рэч прымаў душэўна. Незадоўга да яго сыходу ішлі размовы пра будучую выстаўку ўлетку 2000-га — да яго жнівеньскага 75-годдзя, — але тады яна не адбылася па розных прычынах…

У 1970-м вобраз гэтага вялікага працаўніка пэндзля таленавіта ўвасобіў на палатне ягоны былы сакурснік па мастацкім вучылішчы і сябра Леанід Шчамялёў, які, напэўна, лепш за іншых разумеў унутраны свет гэтага чалавека, яго глыбокую, ранімую натуру... І той партрэт па праве ўвайшоў у класіку беларускага жывапісу. Пранікліві погляд вачэй, рэзкі злом брыва, высокі адкрыты лоб, нервова напружаныя рукі творцы — такім псіхалагічна стрыманым, інтэлігентным і добрым убачыў тады Шчамялёў саракапяцігадовага Міхаіла Чэпіка…

Так, гаворка пойдзе пра шчырага беларуса Міхаіла Піліпавіча Чэпіка, творчасць якога, на жаль, ужо амаль не ведае маладое пакаленне мастакоў ды гледачоў. А яго сучаснікаў і сяброў з кожным годам становіцца ўсё менш і менш…

Міхаіл Чэпік застаецца назаўсёды ў маім сэрцы — менавіта такім, як на шчамялёўскім партрэце: неспакойным, імпульсіўным, цалкам адданым мастацтву чалавекам. Так, час бяжыць вельмі хутка, няўмольна. Быццам зусім нядаўна мы з ім вялі дыскусіі "пра жыццё", а вось прайшло ўжо амаль чатырнаццаць гадоў, як ён пайшоў у іншы свет…

Я заўсёды з задавальненнем сустракаўся з гэтым дзіўным чалавекам, любаваўся ім — высокім, хударлявым, з сівой капой валасоў на галаве, ветлівым і камунікабельным. Я яго ведаў з 1965 года, калі ён са сваёй маці Ганнай Дзмітрыеўнай Гарбачовай, жонкай Станіславай Браніславаўнай Пятроўскай і дачкой Валянцінай пражываў у малапрыгоднай для жылля (без газу, з пячным ацяпленнем) двухпакаёвай кватэры № 27 дома № 5 у раёне плошчы Парыжскай камуны — за дваццаць крокаў ад Тэатра оперы і балета (зараз у гэтым доме, па вуліцы Алаізы Пашкевіч, — рэстаран). Сюды сям'я Чэпікаў перабралася ў 1961-м з аднапакаёвай кватэры дома № 1, што знаходзіўся ў Омскім завулку (цяпер — вуліца Румянцава).

…Вёска Залессе на казачнай Лепельшчыне — радзіма Міхаіла Чэпіка. Тут, непадалёк, нарадзіўся і іншы знакаміты беларус — паэт Анатоль Вярцінскі, які прысвяціў гэтай малой радзіме не адзін цудоўны верш. З ранніх гадоў, бадай, як толькі пабачыў аловак, Міша пачаў маляваць. Спачатку — на шпалерах, а калі аднойчы намаляваў пагранічніка на кані, у сям'і вырашылі: быць малодшаму сыну мастаком. Тады на вёсцы лічылі, што намаляваць алоўкам каня — гэта вельмі вялікае майстэрства. А старэйшы брат Іван (усяго ў Мішы было трое братоў і сястра) падарыў яму сапраўдныя акварэльныя фарбы…

У 1940-м пятнаццацігадовы юнак паступіў у Маскоўскае мастацкае вучілішча імя М.І. Калініна. Дарэчы, тут таксама вучыўся і Барыс Няпомняшчы, будучы аднакурснік Мішы па Мінскім мастацкім вучылішчы. Аднак Чэпік вучобу не скончыў: пачалася вайна... Сям'я была эвакуіравана на ўсход, а сам Міхаіл апынуўся ў горадзе Котласе ў сястры Марыі. Напрыканцы 42-га Чэпіка, як і ўсіх ягоных равеснікаў 1925 года нараджэння, мабілізавалі ў Чырвоную армію і кінулі на фронт пад Міусінск Варашылаўградскай вобласці. Такім сталася баявое хрышчэнне 18-гадовага чырвонаармейца…

Потым Міхаіл Чэпік, радавы 8-га гвардзейскага стралковага палка 4-й стралковай дывізіі 31-га стралковага корпуса 3-га Украінскага фронту (камандуючыя — спачатку генерал арміі Р.Маліноўскі, потым — маршал Ф.Талбухін), удзельнічаў у вызваленні поўдня Украіны, часткі Малдовы. За Днястром у цяжкіх умовах вясновага бездарожжа браў моцныя варожыя плацдармы. У жніўні 1944-га пераможна прайшоў Румынію. Потым былі Балгарыя, Сербія, баі за Будапешт... Вайну скончыў пад Венай, але ваенную службу працягваў ва ўпраўленні Паўднёвай групы войск. Яму пашанцавала: мала хто з яго аднагодкаў вярнуўся жывым з фронту… Як памяць пра гераічнае і драматычнае мінулае — карціны "1941 год", "За намі родная зямля", "Вставай, страна огромная!", "Партызанская быль", "Балада", "Суровы час".

Вясной 1947-га — дэмабілізацыя, а восенню, яшчэ не зняўшы салдацкага шыняля, паступіў у толькі што адкрытае Мінскае мастацкае вучылішча. Ягоныя сябры па вучобе — таксама ўчарашнія франтавікі і партызаны Леанід Шчамялёў, Віктар Грамыка, Міхаіл Савіцкі, Уладзімір Мінейка, Віктар Вярсоцкі, Іван Стасевіч, Ігар Глебаў, а таксама "дзеці вайны" Георгій Паплаўскі, Май Данцыг, Лявон Баразна, Юрый Тышкевіч, Людміла Ізмайлава…

Сярод настаўнікаў самы вялікі ўплыў на маладога Чэпіка аказаў Леў Лейтман, які выкладаў у групе "А" малюнак, жывапіс і кампазіцыю і адначасова загадваў вучэбнай часткай ММВ. Паралельную групу "Б" спачатку вёў Валянцін Волкаў. Дык вось, да канца жыцця Міхаіл Піліпавіч успамінаў Лейтмана як педагога і чалавека толькі добрымі, цёплымі словамі. Нарэшце, пра яго — таксама з сардэчнай павагай — і сёння ўспамінаюць іншыя "птушкі гнязда Лейтмана", у тым ліку Шчамялёў, Грамыка ды Паплаўскі. "…Леў Маркавіч цудоўна ведаў усе нашы моцныя ды слабыя бакі і імкнуўся скіраваць нашы здольнасці і густы менавіта ў прафесійнае, творчае рэчышча. А яшчэ ён быў сапраўдным інтэлектуалам, цудоўным апавядальнікам. Ад яго я, напрыклад, упершыню пачуў пра віцебскіх авангардыстаў Малевіча і Шагала, пра Фалька і Дабужынскага, пра іншых мастакоў, якія ў той час былі для нас інкогніта. Аднойчы мы з Лёнем Шчамялёвым і яшчэ з кімсьці пачулі, як граў наш настаўнік на раялі шапэнаўскі накцюрн — у харэаграфічнай зале Тэатра оперы і балета, дзе тады размяшчалася наша вучылішча. Гэта быў проста цуд!.." — распавядаў Міхаіл Піліпавіч.

У час вучобы Міхаіл ажаніўся са Станіславай Пятроўскай, і ў першыя гады яны жылі ў пакоі пры Тэатры оперы і балета, пакуль не атрымалі аднапакаёвую кватэру на Омскім завулку. Мне цяжка сказаць, чаму Чэпік пасля заканчэння вучылішча абраў на многія гады менавіта Тэатр оперы і балета ў якасці месца сваёй працы. Мо таму, што вельмі захапіўся ім у час навучання, калі вучылішча размяшчалася ў яго будынку, дзе была выдатная магчымасць знаходзіцца ў творчай атмасферы. А мо той жа Лейтман убачыў у жывапісе студэнта нейкія дэкаратыўныя якасці, прыдатныя для сцэнаграфічнай творчасці, і параіў яму пашукаць шчасця на ніве тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва? Старэйшая дачка Міхаіла Валянціна лічыць, што ейны тата проста атрымаў туды накіраванне ад вучылішча...

Так ці інакш, пачынаючы з 1951-га, Чэпік цягам больш як трыццаці гадоў працаваў мастаком-дэкаратарам у Тэатры оперы і балета БССР. Тут на яго аказаў вялікі ўплыў тагачасны галоўны мастак тэатра Сяргей Нікалаеў — вучань самога Канстанціна Каровіна, сапраўдны рэфарматар беларускай сцэнаграфіі, які стаяў ля вытокаў беларускага тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва і які адным з першых беларускіх дзеячаў культуры атрымаў званне народнага мастака БССР. Як успамінаў Чэпік, практычна ўсе спектаклі Нікалаева — ад "Царскай нявесты", "Івана Сусаніна" і "Князя Ігара" да "Хаваншчыны" і "Аіды" (дарэчы, "Аіду" ставіла разам з Нікалаевым Ларыса Александроўская) — былі прасякнуты "каровінскім" духам у плане жывапіснага "эстэтызму".

Менавіта Нікалаеў даверыў маладому Чэпіку самастойную распрацоўку часткі эскізаў дэкарацый да спектакляў "Вертэр", "Яўгеній Анегін", "Дзекабрысты", "Руслан і Людміла". Некаторыя эскізы і сёння захоўваюцца ў хатнім архіве сям'і Чэпікаў. Вельмі добрыя адносіны склаліся ў Міхаіла і з іншым мастаком-пастаноўшчыкам тэатра Паўлам Масленікавым, які не сумняваўся, што той з часам стане выдатным тэатральным мастаком. Не сумняваўся не толькі ён. У чэпікаўскі талент сцэнографа верылі ўсе, з кім Міхаіл перасякаўся на шляхах тэатральнага жыцця: Яўген Чамадураў, Міхаіл Блішч, Соф'я Друкер, Мікалай Ворвулеў, Зіновій Бабій, Святлана Данілюк, Міхаіл Галкоўскі, Віктар Чарнабаеў…

У 1968 годзе Міхаіл Піліпавіч напісаў партрэт свайго сябра, цудоўнага опернага спевака, народнага артыста Віктара Чарнабаева. Я прысутнічаў на адным сеансе, бачыў, як артыст пазіраваў Чэпіку ў дэкарацыйнай майстэрні тэатра. Побач назіралі за гэтай работай мастакі-сцэнографы Іван Пешкур, Уладзімір Кульваноўскі. Пару разоў заглядваў і маэстра Яўген Рыгоравіч Чамадураў. Хваліў Чэпіка. Ён якраз закончыў прагон балета "Рамэа і Джульета" перад прэм'ерай і быў у добрым настроі. Казаў, што так панаватарску артыста ніхто яшчэ не маляваў…

Сапраўды, дэкаратыўныя і манументальныя рысы сталі характэрнымі для гэтага партрэта. Рух у фігуры, падкрэслены моцнымі аб'ёмамі і абагульненай пластыкай, ніяк не парушае агульнай статычнасці кампазіцыі. Натурная прапрацоўка аб'ёму змяняецца дынамічнай колеравай лепкай, якая ўзмацняе асобныя элементы вобраза. У партрэце адчуваецца імкненне стварыць цэласны і маналітны характар, перадаць пэўны душэўны стан знакамітай асобы. Гэтая работа з'явілася адной з першых у беларускім партрэтным жывапісе, дзе псіхалагічная і эмацыйная напружанасць вобраза ўзмацняецца сімволікай колеру, абмежаванай гамай, кантраснымі супастаўленнямі цёмных і светлых тонаў, жывапісна-пластычнымі эфектамі, абагульненнем дэталей…

К

Міхаіл Чэпік. "На Купалле".

Свет узвышаных мрояў Міхаіла Чэпіка

Працяг аповеду пра Міхаіла Чэпіка — **у наступных нумарах "К".**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст."
- "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст."
- "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст."
- "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст."
- "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст."

Выстаўкі:
- Выстаўка мужчынскага касцюма і кунтушовых паясоў з прыватнага збору **"Залататканы шоўк, бясцэнны па рабоце..."** — да 31 кастрычніка.
- Фотавыстаўка Уладзіміра Чыкіна **"Балет & горад. Мінск"** — да 10 лістапада.
- Выстаўка **"Эдо. Сталіца і эпоха. Японская гравюра ўкіё-э XVIII — XIX стст. са збору Дзяржаўнага Эмітажа"** — да 20 снежня.
- Выстаўка жывапісу сям'і Шыбнёвых **"Сто твораў за сто гадоў"** — да 17 лістапада.
- Выстаўка заходнееўрапейскай моды кан. XIX — пач. XX стст. са збору Ігара Сурмачэўскага **"BELLE EPOQUE"** — да 1 снежня.
- Выстаўка твораў Івана Дмухайлы **"Прыгажосць на стагоддзі"** — да 10 лістапада.

Арт-кафэ музея
- Выстаўка работ Аляксея Несцерава **"Ачаг"** — да 24 лістапада.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
- "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
- "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
- "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

Выстаўка:
- **"Падарожныя замалёўкі Кануція Русецкага"** — да 30 кастрычніка.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўка:
- Выстаўка **"Самабытныя вобразы сучаснасці"** — да 25 лістапада.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- "Старажытная Беларусь".
- "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
- "Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".
- "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Бацька і сын Крыловы"** — да 3 лістапада.
- Выстаўка **"Музей шакаладу "Nikolya"** — да 9 лістапада.
- Выстаўка **"Беларусь у Першай сусветнай вайне"** — да 15 снежня.
- Выстаўка графікі **Уладзіміра Шаркова** — да 20 лістапада.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а.
Тэл.: 290 68 47.



- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"Васковыя фігуры"** — да 14 снежня.
- **"Аўто на далоні"** — да 14 снежня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка **"Гісторыя і сучаснасць беларускага хакея"** — да 14 лістапада.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, Траецкае прадмесце, вул. М.Багдановіча, 9А.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

- Выстаўка **"Велізарныя цмокі"** — да 30 лістапада.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:
- "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
- "Развіццё тэатральнай і музычнай культуры Беларусі ў X — XIX стст.".
- "Беларуская музычная культура XX ст.".
- "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".

Выстаўка:
- **"Тэатр сваімі рукамі. Цікавы занятак для дзяцей і дарослых"**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка **"Вялікая і забытая"**, прысвечаная Першай сусветнай вайне, — да 18 студзеня.
- Выстаўка люлек **"Прадмет годнага адпачынку"** — да 1 снежня.

Ратуша
- Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка фатаграфій **"Мір стары — Мір новы"**.
- Выстаўка **"Даспехі Заходняй Еўропы XVI — XVIII стст."**.

Партрэтная зала
- Выстаўка **"Партрэты князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"** (Германія) — да 16 лістапада.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
- Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
- Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.

Акцыі:
- **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
- Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
- Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выстаўкі:
- Выстаўка, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Данілы Канстанцінавіча Міцкевіча, **"І бачу пройдзеныя далі"** — да 4 лістапада.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:
- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
- Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстаўка:
- Выстаўка мастацкай фатаграфіі Валерыя Вядрэнкі **"Святло Вязынкі"** — да 15 лістапада.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10.
Тэл.: 321 24 30.

- Выстаўка скульптуры Уладзіміра Жбанава **"Ад мяне"** — да 31 мая 2015.
- Гістарычная выстаўка **"Ян Карскі. Чалавек свабоды"**.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
- **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
- **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Анджэй Струміла. Жывапіс"** — да 2 лістапада.
- Выстаўка **"Гасподня зямля"**.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.

Выстаўка:
- Выстаўка **"Gloria Patria"** — дакументы, карты, прадметы хрысціянскага культу з прыватнай калекцыі Ігара Сурмачэўскага — да верасня 2015.
- Выстаўка Юрыя Каралевіча **"Рэмінісцэнцыя"**.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
- Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
- **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры к. XIX — с. XX стст.
- Выстаўка **паштовак, жывапісу, графікі** з фондаў музея.

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, пр-т Ракасоўскага, 49.
Тэл.: 291 16 76.

Экспазіцыі:
- **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Л.Шчамялёва"**.

Выстаўка:
- Выстаўка работ Ганны Гадзіравай **"Палітра вандравання"** — да 14 лістапада.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.



Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Музей шакаладу "Nikolya"** — да 26 кастрычніка.
- Выстаўка, прысвечаная 95-годдзю стварэння Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, **"Музею — 95"** — да 16 лістапада.
- Выстаўка фота Сяргея Халадзіна **"Пастскрыптум"** — да 31 кастрычніка.
- Міжнародны выставачны праект **"Рэчы паміж жыццём і смерцю"**, падрыхтаваны Музеем Арміі Стакгольма, — да 16 лістапада.

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня"**.
- **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:
- **"Кнігі, у якіх захоўваецца час..."** (лепшыя выданні сяр. XVII — пач. XX стст.) — да 27 кастрычніка.
- **"Рэтра-Гомель"** — да 27 кастрычніка.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстаўкі:
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад
Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі"**.
- Выстаўка з Бранскай універсальнай бібліятэкі імя Ф.Цютчава **"Дарогамі вайны"** — 1 лістапада.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

- Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна..."**.
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны"**.
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!"**.
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60"**.
- Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.
- **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
- Выстаўка **"Як жылі нашы продкі"**.
- Выстаўка **"Чарадзейны куфар"**.
- Выстаўка творчых работ выпускнікоў і выкладчыкаў мастацкай школы **"Сустрэча пакаленняў"**.
- Персанальная выстаўка П.Цімафеева **"Драматычнасць сярэдняга плана. Час жывых"**.
- У рамках праекта "Выток Нёмана — выток духоўнасці" — калектыўная выстаўка **"Абуджэнне"**.
- Выстаўка дэкаратыўна-прыкладной творчасці А.Чуўюравай (Сярко) **"Частка маёй душы"**.
- **"Вайны свяшчэнныя старонкі"** — выстаўка, прысвечаная Вялікай Перамозе.
- Выстаўка **"Старонкі непа-100ронняй Вялікай вайны на Лідчыне"**.

ЛІДСКІ ЗАМАК

- Камера катаванняў.
- Фотавыстаўка **"Захаваем на вякі"**.
- Партрэтная галерэя вялікіх князёў і каралёў.
- Фотавыстаўка **"Археалагічныя знаходкі Лідскага замка"**.
- Выстаўка рэплік **"Зброя Вялікага Княства"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

- Выстаўка, арганізаваная сумесна з Беларускім саюзам дызайнераў, **"ПаСТУЛат"** (дызайн, арт-аб'екты, фота, жывапіс, скульптура, відэаарт), — да 22 лістапада.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс.: 290 60 10.

- Выстаўка **"Tour de Беларусь. Пралог"** — да 9 лістапада.
- Персанальная выстаўка да 70-годдзя **Уладзіміра Напрэнкі** — да 9 лістапада.
- Выстаўка секцыі "Пагоня" БСМ **"АРТ-ВОРША-РУБОН!"**, прысвечаная 500-годдзю бітвы пад Оршай, — да 9 лістапада.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
- **25 — "Аіда"** (опера ў 4-х дзеях) Дж.Вердзі.
- **29 кастрычніка — "Партрэты. Ізабэла Юр'ева"** — Канцэрт лаўрэата міжнароднага конкурсу, уладальніка медаля Францыска Скарыны Алены Сало (Камерная зала імя Л.П. Александроўскай).
- **1 лістапада — "Лаўрэнсія"** (прэм'ера балета ў 2-х дзеях) А.Крэйна.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7. Тэл./факс: 327 60 81.
- **25, 26 — "Ноч на Каляды"** паводле М.Гогаля.
- **30, 31 кастрычніка — "Пан Тадэвуш"** А.Міцкевіча.
- **1 лістапада — "Паўлінка"** Янкі Купалы.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.
- **25 — "Два чароўныя парасоны (Стойкі алавяны Салдацік)"** С.Навуменка. Пачатак а 12-й.
- **25 — "Адамавы жарты"** С.Навуменка. Пачатак а 19-й.
- **26 — "Бегчы з Эльсінора, або Гамлет навыварат"** В.Понізава.
- **28 — "Раскіданае гняздо"** Янкі Купалы.
- **29 — "Тры Жызэлі"** А.Курэйчыка.
- **30 — "Нямое каханне"** — аўтарскі праект Ігара Сігова.
- **31 кастрычніка, 1 лістапада — "Кантракт"** Ф.Вэбера.
- **1 — "Гісторыя двух сабак"** Я.Конева. Пачатак а 12-й.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.
- **25 — "Чырвоны Каптурык. Пакаленне NEXT"** А.Рыбнікава.
- **25 — "Шклянка вады"** У.Кандрусевіча. Пачатак а 19-й.
- **26 — "Айбаліт"** І.Левіна. Пачатак у 11.30.
- **26 — "PETROFF-баль"** — Юбілейны вечар галоўнага хормайстра тэатра Святланы Пятровай. Пачатак а 19.00.
- **27 — "Дуброўскі"** К.Брэйтбурга.
- **28 — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
- **29 — "Звычайны цуд"** Г.Гладкова.

Творчы праект "Наталля Гайда запрашае..."
- **31 кастрычніка — "Бабін бунт"** Я.Пцічкіна.
- **1 лістапада — "Сільва"** І.Кальмана.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
- **25 — "Аладдзін"** Н.Гернэт. Пачатак аб 11-й.
- **26 — "Яшчэ раз пра Чырвоны Каптурык"** С.Яфрэмава, С.Когана. Пачатак аб 11-й.
- **28 — "Цудоўная скрыня з зялёным гарошкам"** па матывах шведскіх казак. Пачатак у 10.30 і а 13-й.
- **29 — "Загубленая душа, або Пакаранне грэшніка"** У.Граўцова. Пачатак а 18-й.
- **30 — "Ямелева шчасце"** па матывах рускіх народных казак. Пачатак у 10.30 і а 13-й.
- **31 кастрычніка — "Тук-тук! Хто там?"** Л.Ралчава. Пачатак а 13-й.
- **1 лістапада — "Воўк і раз, два, тры..."** Н.Мацяш. Пачатак аб 11-й.